№№35–36 (2555–2556)

2 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнэце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ПРАТЭСТ

Прэм'ер Сяргей Сідорскі даручыў віцэ-прэм'еру Андрэю Кабякову фактычна ўвесці цэнзуру на эканамічную інфармацыю

Што, журналістам закрыць рот вось так?

Як стала вядома "Народнай волі", па дзяржаўных органах разасланы ліст для службовага карыстання, у якім жорстка рэгламентаваны правілы зносін афіцыйных асоб з прадстаўнікамі друкаваных выданняў, і ў першую чаргу недзяржаўных, якія спецыялізуюцца на асвятленні эканамічнай тэматыкі.

Цяпер не так проста будзе ўзяць інтэрв'ю ў таго ці іншага чыноўніка. Як і папрасіць напісаць артыкул. Калі некаму падасца, што інфармацыя неаб'ектыўная ці некарэктная, то карай можа стаць нават вызваленне чыноўніка ад займаемай пасады.

Дадзена даручэнне весці маніторынг усіх публікацый па эканамічнай тэматыцы, і міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч павінен узяць пад асабісты кантроль лёс тых СМІ і рэдактараў, якія дапусцілі "непатрэбныя" публікацыі.

Відавочна мара ўлады — каб СМІ публікавалі толькі афіцыйныя паведамленні прэс-служб і ніякіх дадатковых пытанняў не задавалі. Наколькі ж нестабільная сітуацыя ў эканоміцы, калі ўлады асцерагаюцца, што нават афіцыйныя асобы могуць сказаць журналістам нешта не тое!

Нашы калегі, якія спецыялізуюцца на эканамічным аналізе, ужо сутыкнуліся з цяжкасцямі ў працы. Па-першае, закрытай стала аператыўная статыстыка. Па-другое, у чыноўнікаў нібы мову адняло: адсылаюць адзін да аднаго, а часцей за ўсё прызначаюць упаўнаважанага на кантакты са СМІ. У Міністэрстве эканомікі, напрыклад, такім стаў намеснік міністра Андрэй Тур. Многія, напэўна, заўважылі, што менавіта Тур каментуе і сітуацыю з прадпрымальнікамі, і з нафтай, і з газам — спецыяліст шырокага профілю, проста стаў зоркай тэлеэкранаў і газетных палос. Усё гэта невыпадкова.

Улада лічыць, што ведаць грамадскасці трэба толькі тое, што дазволена. Таму сёння ёсць пытанні, на якія пакуль няма адказаў.

Так, у сувязі з павелічэннем цэн на энерганосьбіты рэкамендацыя эканамістаў адназначная: каб скараціць страты бюджэту — трэба скарачаць аб'ёмы закупак таго ж газу. Усё зразумела і лагічна, і паўсюдна ў краіне рапартуюць пра праграмы энергазберажэння, пераходу на мясцовыя віды паліва і т.п. Тады пытанне: а навошта Беларусь у гэтым годзе павялічвае закупкі газу ў Расіі амаль на мільярд кубаметраў? Адказ адназначны: альбо наша краіне займаецца рээкспартам (перапродажам) газу, што забаронена беларуска-расійскімі пагадненнямі, альбо ўсе гэтыя даклады пра эканомію і пераход на вугаль і дровы — пусты гук.

Яшчэ сітуацыя. У студзені скараціўся экспарт нафтапрадуктаў, а, заўважце, менавіта па экспартным кантрактам мы плацім Расіі дадатковую пошліну. У той жа час, згодна з афіцыйнай інфармацыяй, НПЗ працавалі ў звычайным рэжыме, аб'ёмы выпрацоўкі засталіся на звычайным узроўні. Дык куды ж падзеліся вырабленыя бензін і дызельнае паліва? Усё ідзе на падрыхтоўку да пасяўной? Не, сельгаспрадпрыемствы пакуль наогул не назапасілі нават палову неабходных аб'ёмаў. Міжволі ўзнікае думка пра "шэрыя схемы" экспарту нафтапрадуктаў, з дапамогай якіх Беларусь абыходзіць расійскія пошліны. Калі так, то сапраўды ёсць што хаваць. Але хто адкажа за магчымыя наступствы скандалу?

Калі верыць афіцыйным крыніцам, дык беларускі рубель устойлівы і надзейны. Але такога проста не можа быць, бо ў студзені зафіксавана рэкордная за апошнія восем гадоў інфляцыя і называюцца розныя суммы (у сотні мільёнаў долараў), якія былі кінуты на падтрымку валюты з золатавалютных рэзерваў. Што сведчыць аб тым, што слабенькі наш рубель, і ягоны курс да цвёрдых валют падтрымліваецца штучна; у любы момант можа абрынуцца, і тады беларусы, прачнуўшыся раніцай, даведаюцца, што растаялі, як снег пад сонейкам, іхнія уклады ў беларускіх рублях. Ці застрэляцца ў такім выпадку Сяргей Сідорскі і Андрэй Кабякоў ад сораму за тое, што не гаварылі народу праўду пра курс, якім ішла краіна, і пра рэальны стан айчыннай эканомікі?..

Тэмы, на якія афіцыйныя асобы гаварыць не хочуць і не могуць, можна пералічваць доўга. Зрэшты, Аляксандр Лукашэнка неяк прызнаўся, што нясе Беларусь, як хрустальны шар. Усе падумалі, што гэта метафара, а на самай справе ён праўду сказаў: маленькая падножка — і так ляснецца ягоная стабільнасць, што міргнуць не паспеем. Але ці патрэбны нам такія кіраўнікі, што, адгарадзіўшыся ад грамадства, ужо трынаццаты год будуюць дабрабыт на пяску?

Алена НОВІКАВА.

Мілінкевіч прапануе старшыні ПАСЕ сустрэцца з мінскім АМАПам

Старшыня Палітсавета Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС) Аляксандр Мілінкевіч запрасіў старшыню Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Рэне ван дэр Ліндэна наведаць Беларусь 25 сакавіка гэтага года. Мілінкевіч накіраваў кіраўніку ПАСЕ адпаведны ліст.

"Ведаючы пра цікавасць да нашай краіны і сур'ёзнасць адносін ПАСЕ да беларускай праблемы, запрашаю вас наведаць Беларусь 25 сакавіка 2007 года і ўзяць удзел у святкаванні Дня Волі", — гаворыцца ў лісце.

Як піша А.Мілінкевіч, нягледзячы на тое, што "ў турмах Беларусі працягваюць знаходзіцца палітзняволеныя, адбываюцца новыя арышты і суды над апанентамі ўлады, парушаюцца правы грамадзян і грамадскіх арганізацый", ён згодны з меркаваннем старшыні ПАСЕ аб тым, што "сітуацыя ў краіне і вакол яе дае магчымасць па-новаму зірнуць на перспектывы яе дэмакратызацыі".

"...Спадзяюся, што беларускія ўлады зразумеюць важнасць сённяшняга моманту і 25 сакавіка таксама зробяць крок насустрач беларускай грамадскасці. У любым выпадку вы зможаце ўласна пераканацца ў тым, што на самай справе адбываецца ў Беларусі", — гаворыцца ў лісце А.Мілінкевіча кіраўніку ПАСЕ.

Хутчэй папраўляйцеся, дарагі Рыгор Іванавіч!

Сваё 72-годдзе, якое прыпала на мінулую суботу 24 лютага, народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін сустрэў, на вялікі жаль, у бальнічнай палаце. Бяда здарылася напярэдадні, некалькі дзён таму, калі ўстрывожаная Валянціна Міхайлаўна, жонка паэта, мусіла выклікаць "хуткую дапамогу". Вось што яна распавяла:

— Раніцай гляджу, а ён — у непрытомнасці, белы як палатно, амаль не дыхае... Дзякуй Богу, медыкі спрацавалі хутка і прафесійна. Адразу ж адвезлі ў рэанімацыю, прынялі, наколькі ведаю, неадкладныя меры. Зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб выратаваць мужа. Дзякуй ім!

Валянціна Міхайлаўна гаворыць, што Рыгору Іванавічу ўжо значна лепш: падае тэмпература, нармалізуецца ціск. І апетыт пакрысе з'яўляецца.

— Перадачы прымаюць штодня, — працягвае яна, — праўда, нікога пакуль не прапускаюць. Гэта ж рэанімацыйнае аддзяленне, ды і каранцін у сувязі з грыпам. Нават на дзень народзінаў не ўдалося прарвацца. А столькі званкоў-віншаванняў было на хатні тэлефон з розных кутко ў Беларусі, з блізкага і далёкага замежжа! Аж на душы палегчала: помняць, любяць Рыгора сябры і зусім незнаёмыя людзі, зычаць яму здароўя і новых твораў.

Рэдакцыя "Народнай волі" далучаецца да гэтых добрых пажаданняў. Хочацца верыць, яны спраўдзяцца.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

АБРАКАДАБРА

У кого не совсем в порядке с памятью?

На прошлой неделе литовское посольство устраивало официальный прием в честь очередной годовщины восстановления независимости Литвы. Там и встретился главный редактор газеты "Народная воля" **Иосиф Середич** с бывшим главой Администрации президента Республики Беларусь **Леонидом Синицыным**.

Слово за слово, и Середич спрашивает:

— Леонид Георгиевич, так почему Вы не показали общественности пленку с избиением в Овальном зале депутатов Верховного Совета, входящих во фракцию Зенона Позьняка?

— Знаешь, у меня Заметалин ее выкрал...

— Не верю...

— Честно говорю...

— Могу я написать об этом в газете?

— Можешь.

"Народная воля" удивилась такому признанию и решила поинтересоваться у бывшего сослуживца Синицына, теперешнего руководителя Национальной киностудии "Беларусьфильм" **Владимира Заметалина**, намерен ли он продемонстрировать широкой общественности пленку, на которой запечатлены документальные подробности избиения депутатов.

Выслушав вопрос, Владимир Петрович ответил:

— Я хочу сказать, что Заметалин в те времена к этому не имел никакого отношения.

— А как тогда можно расценить слова Синицина?

— А это Вы у него спросите, пожалуйста. Видимо, у него с памятью что-то не совсем в порядке... Надо пить витамины, особенно весной, тогда с памятью будет все нормально. Так можете и написать...

Да, у кого-то действительно не совсем в порядке с памятью. В таком случае, может, ситуацию прояснит Александр Григорьевич Лукашенко? Ведь все помнят его слова: *"...мы вам покажем эту пленку"*.

Вот и покажите. Тогда ясно будет, у кого *"не совсем в порядке с памятью"*...

Марина КОКТЫШ.

ПАЛІТКУХНЯ

Калі правая рука не ведае, што творыць левая

Пошук кампрамісу ўнутры Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС) замарожаны на няпэўны час. І ўжо амаль усім ясна: адзінства, якое было дасягнута ў час прэзідэнцкіх выбараў 2006 года, у стане дэмакратычных сіл няма і не будзе. Прынамсі, да наступнай палітычнай кампаніі.

Старшыня Палітсавета АДС Аляксандр Мілінкевіч, пакрыўджаны рашэннем сваіх калег увесці ратацыйны прынцып кіравання ў АДС, адмовіўся ўдзельнічаць у Кангрэсе дэмакратычных сіл, спачатку запланаваным на 17—18 сакавіка. Гэта азначае, што беларуская апазіцыя, якая здолела аб'яднацца на час прэзідэнцкіх выбараў, каторы раз ужо наступае на адны і тыя ж граблі: аб'яднаўшыся на час канкрэтнай палітычнай кампаніі, пасля яе завяршэння разбягаецца па "нацыянальных кватэрах". Каб не дапусціць гэтага, старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка прапанаваў удзельнікам канфлікту падпісаць "Кампраміс дзеля адзінства" — каб "і ваўкі былі сытыя, і авечкі цэлыя".

Вінцук Вячорка прапанаваў перанесці Кангрэс на май 2007 года, абраўшы на форуме старшынёй Палітсавета Аляксандра Мілінкевіча, але з меншымі паўнамоцтвамі, чым цяпер. Па гэтай схеме Мілінкевічу фактычна застаюцца прадстаўнічыя функцыі, хаця сам палітык патрабуе, наадварот, пашырэння сваіх паўнамоцтваў.

22 лютага Палітсавет паспрабаваў прыняць "Кампраміс дзеля адзінства", але безвынікова. Адзінае, чаго дамогся Палітсавет, — стварыў пагаджальную камісію. Па інфармацыі старшыні аргкамітэта па падрыхтоўцы КДС Аляксандра Бухвостава, 24 лютага пагадненне адукацыйнага цэнтра "British country". Там нам расказвалі аб сістэме адукацыі ў Вялікабрытаніі. Адтуль мы ўзялі з сабой адукацыйную літаратуру на англійскай мове. Я падкрэсліваю, што ніякага палітычнага адценння наша паездка ва Украіну не мела. І таму затрыманне нашага аўтобуса на беларуска-ўкраінскай мяжы мяне, шчыра кажучы, здзівіла".

У злашчасным аўтобусе знаходзіліся 42 пасажыры — пераважна маладыя людзі — грамадзяне Беларусі, Украіны і Грузіі.

"На ўкраінска-беларускай мяжы наш аўтобус быў у 2.30 ночы 26 лютага. Пасля агляду асабістых рэчаў пасажыраў у адной дзяўчыны быў знойдзены фільм Юрыя Хашчавацкага "Площча". Яшчэ адна дзяўчына везла ўласны ноутбук, які быў узяты памежнікамі для дагляду, — працягвае Гелена. — Асабіста ў мяне забралі канспекты па англійскай мове, якія чамусьці таксама дэталёва даглядалі. Нам нічога не тлумачылі, роўна як і тлумачэнняў з нас не бралі. Праўда, памежнікі спрабавалі націснуць на грамадзян Украіны і Грузіі: маўляў, калі вы не дадзіце тлумачэнняў, будзем чакаць консулаў вашых краін. Але грузіны і ўкраінцы былі салідарны з намі".

Як высветлілася пазней, памежнікі чакалі, пакуль прыедзе група нейкіх адказных асоб, каб вызначыць, што далей рабіць з пасажырамі затрыманага аўтобуса: "Самае жудаснае, што за ўвесь час прастою на мяжы, а склаў ён 12 гадзін, нам не давалі ні ежы, ні вады. А ўласныя прадукты ў нас да таго часу скончыліся. Мы ж разлічвалі, што хутка будзем у Мінску. Адзінае, за што хочацца падзякаваць, дык што ў туалет выводзілі", — расказвае Карніцкая.

Пасля 12-гадзіннага знаходжання на мяжы аўтобус усё ж такі быў адпушчаны. Ніхто не прасіў прабачэння, а мэту затрымання патлумачылі проста: неабходнасць праверкі. Змучаныя людзі і за гэта дзякуюць — адпусцілі, і добра. Але на самай справе такія паводзіны для цывілізаванай краіны — дзікунства.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ДАЙДЖЭСТ

Для Лукашэнкі прыдумваюць «стратэгію зыходу»

"Суверэнітэт Беларусі сёння з'яўляецца асноўнай праблемай. Лукашэнка рана ці позна пойдзе, але для Еўрасаюза важна, каб Беларусь засталася незалежнай", — заявіў прэм'ер-міністр Літвы Гедымінас Кіркалас у інтэрв'ю бельгійскай газеце "EUobserver".

Кіраўнік літоўскага ўрада зазначыў, што падчас нядаўняга візіту ў Грузію ён абмяркоўваў сітуацыю ў Беларусі і стратэгію, якая можа быць прынята ў дачыненні да Беларусі. *"У мяне было шмат дыскусій з маімі грузінскімі калегамі, некаторыя з іх лічаць, што мы павінны прапанаваць "стратэгію зыходу" для прэзідэнта Лукашэнкі"*, — сказаў Г.Кіркалас.

"Літоўскі прэм'ер-міністр адмовіўся ўдакладняць, што азначае тэрмін "стратэгія зыходу" — магчымасць аднойчы ўбачыць Лукашэнку ў адстаўцы ў цёплай і дружалюбнай краіне, напрыклад, Венесуэле, або гэта азначае аднаўленне добрых адносін з ЕС, якое пачнецца з вызвалення галоўнага палітзняволенага краіны Аляксандра Казуліна", — зазначае бельгійскае выданне.

Г.Кіркалас падкрэсліў, што для распрацоўкі стратэгіі для Беларусі неабходна правесці нефармальныя кансультацыі з дыпламатамі.

"А.Лукашэнка павінен зрабіць некаторыя крокі, але мы павінны працаваць і размаўляць з ім", — лічыць літоўскі прэм'ер-міністр.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

12 гадзін на мяжы

быў вымушаны прастаяць аўтобус з маладымі людзьмі, якія вярталіся з Украіны

Ноччу 26 лютага на беларуска-ўкраінскай мяжы — на пажмежным пераходзе "Макраны" Маларыцкага раёна — быў затрыманы аўтобус з маладымі людзьмі — грамадзянамі Беларусі, Украіны і Грузіі. Яны вярталіся з украінскага Львова, дзе бралі ўдзел у адукацыйнай праграме. Толькі праз 12 гадзін утрымання на мяжы памежнікі дазволілі аўтобусу выехаць у Мінск.

Падрабязнасцямі інцыдэнту з "Народнай воляй" падзялілася адна з удзельніц паездкі — новапалачанка Гелена Карніцкая. "У Львове мы бралі ўдзел у адукацыйнай праграме. Наведвалі універсітэты, бібліятэкі, хадзілі на экскурсіі, — расказвае Гелена. — У гэтым украінскім горадзе ёсць аддзя-

ВАС ЦІКАВІЦЬ

25 сутак адміністрацыйнага арышту. Гэта магчыма

Ці праўда, што зараз можна пасадзіць чалавека не на 15, а на 25 сутак? Нешта я не чуў, каб выносіліся такія рашэнні, але мае знаёмыя сцвярджаюць, што ў Беларусі зараз гэта магчыма.

Віталь Іванавіч СІЎЧАНКАЎ, Мінск.

Пра такія прысуды Вы, Віталь Іванавіч, не чулі толькі па той прычыне, што новы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях пачаў дзейнічаць з 1 сакавіка. Менавіта гэтым дакументам зменены максімальна магчымы тэрмін адміністрацыйнага арышту з 15 сутак да 25.

У суды новы кодэкс толькі-толькі паступіў, таму там адмаўляюцца ад якіх-небудзь каментарыяў, спасылаючыся на тое, што адпаведныя артыкулы яшчэ трэба вывучыць.

Алег СНОЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

СОЛИДАРНОСТЬ

Первое в этом году заседание Сенат Польши начал с вопроса о Козулине

Резолюция об освобождении экс-кандидата в президенты была принята единогласно

21—22 февраля 2007 года по приглашению польского Сената супруга Александра Козулина Ирина и руководитель его юридической службы Олег Волчек участвовали в ряде официальных встреч в Варшаве. Пресс-служба А.Козулина обратилась к Ирине Козулиной и Олегу Волчеку с просьбой рассказать о визите в Варшаву.

— Олег, в польской столице Вы встречались с известными польскими правозащитниками. Что их интересовало больше всего?

— Состояние здоровья А.Козулина и общая обстановка вокруг него в колонии. Мы подробно рассказывали о том, что к Козулину в колонию не допускают независимых врачей и представителей Международного Красного Креста, не разрешают встретиться с послом Германии в Беларуси. Отмечали ненормальную нагнетающуюся атмосферу вокруг А.Козулина в колонии. Это и взыскания, вынесенные Козулину (после выхода политика из голодовки он получил два взыскания по надуманным поводам), невозможность получения полноценной юридической помощи (адвокату экс-кандидата в президенты И.Рынкевичу вынесли уже второе в течение года дисциплинарное взыскание).

— Какие мероприятия в поддержку Козулина и за его освобождение планируют проводить польские правозащитники?

— Войцех Маковски, координатор польского отделения Международной Амнистии (МА), рассказал нам, что уже на протяжении более месяца ведется широкая общественная кампания по освобождению А.Козулина. Польские правозащитники подготовили и распространяют различные листовки в государственных учреждениях, общественных местах, вузах и т.д. В настоящее время польское отделение МА совместно с головным офисом в Англии готовит широкую международную кампанию "Свободу Козулину!". Они также решили провести подробный мониторинг всех нарушений, касающихся нахождения в колонии А.Козулина.

Марек Антоний Новицки (Хельсинкский фонд по правам человека) в ближайшее время направит Обращение в Международный Хельсинкский фонд для принятия обращения к правительству Беларуси с требованием немедленного освобождения А.Козулина.

Представители Фонда "Свобода и демократия" организовывают фотовыставку о событиях в Беларуси в День Воли 25 марта 2006 года. Они также проводят мониторинг нарушений прав человека в Беларуси и ведут своеобразный "черный список" белорусских должностных лиц, судей, прокуроров, сотрудников милиции, которые непосредственно причастны к подавлению гражданского общества в Беларуси. В дальнейшем эти списки будут переданы правительству Польши для ограничения их въезда в страну.

— Какие встречи предшествовали заседанию Сената?

— Непосредственно перед заседанием Сената мы присутствовали на встрече с председателем Сената Богданом Борусевичем, его заместителями Матеем Плажинским, Ричардом Легутко, заместителем главы канцелярии Сената Ромуальдом Ланчковским, директором кабинета Маршалка Сената Ионой Урбан, директором бюро поляков за границей Артуром Козловским и заместителем директора бюро по международным отношениям и связям с Евросоюзом Анной Кляник. Первым вопросом, интересующим польских высших должностных лиц, был также вопрос о состоянии здоровья А.Козулина и его положении в колонии. Мне особенно близко мнение Богдана Борусевича, который сказал, что освобождение Александра Козулина не является каким-то условием для диалога с белорусской властью. "Мы считаем, что он должен быть освобожден в любом случае, потому что независимо от предъявленных ему обвинений Польша считает его узником совести", — сказал Богдан Борусевич. Поэтому свое первое в этом году рабочее заседание Сенат начал с вынесения резолюции об освобождении А.Козулина.

— Какие изменения в нашей оппозиции хотят видеть поляки как наши ближайшие соседи?

— Конечно, их волнует вопрос единения оппозиции. Их расстраивает несогласованность позиции лидеров демократических сил в вопросе проведения Конгресса. Также их интересует, какие шаги будут предприняты объединенной оппозицией в ближайшее время не только в отношениях с Евросоюзом, но и с Россией, учитывая газово-нефтяной конфликт. Не первый раз они нам задают вопрос, ведем ли мы какие-либо переговоры с российскими элитами. Я считаю, что такие вопросы должны быть определены на предстоящем Конгрессе демсил. И, как отметили польские парламентарии, вопросы нашей стратегии и тактики необходимо донести в первую очередь до белорусского народа. Как я понял, у парламентариев нет уверенности в искренности намерений А.Лукашенко менять что-либо в стране в сторону демократизации общества. Ведь до сих пор нет никакого официального ответа от правительства Беларуси на предложения Евросоюза. Поэтому ответственность за будущее Беларуси ложится не только на власть, но и на нас — демократов. Мы должны в ближайшее время определиться со своими планами.

— Вопрос к Ирине Ивановне. Ваши впечатления о заседании Сената.

— Я впервые в своей жизни присутствовала на заседании такого высокого уровня. Проходило оно очень торжественно, с выполнением всех деталей протокола. Вопрос о А.Козулине стоял в повестке дня под номером один.

С докладом выступал сенатор Неселовски. Он очень эмоционально рассказал о приговоре Александру Козулину, убедительно подчеркнул, что этот приговор — политическое преследование экс-кандидата в президенты белорусской властью. Неселовски выступил так убедительно, что все сенаторы встали и начали аплодировать, повернувшись в нашу сторону.

Решение по утверждению резолюции было принято единогласно.

Мне предоставили слово. Я поблагодарила всех за поддержку в нашей борьбе с режимом, выразила уверенность, что другие страны выступят так же решительно, как польские друзья.

Я была тронута вниманием и галантностью поляков. Мне подарили роскошный букет цветов и текст резолюции, подписанный председателем Сената.

В зале для пресс-конференций состоялась наша встреча с польскими журналистами. Скажу честно, не ожидала, что на встречу соберется так много представителей СМИ. Вместе с нами в пресс-конференции участвовали Богдан Борусевич и еще несколько депутатов Сената. Вечером вместе с сенатором Неселовским мы были в прямом эфире одного из ведущих телеканалов Польши.

Была еще одна приятная встреча. Рядом со зданием Сената наши соотечественники организовали пикет "Свободу Козулину!". Мы с Олегом Волчеком вышли на улицу, поговорили, сфотографировались. Поблагодарили за участие, за выдержку: не так-то просто выстоять на улице несколько часов с транспарантами!

Еще я хочу добавить: принятие резолюции по А.Козулину не является каким-то конечным результатом солидарности поляков с белорусскими политзаключенными. Польские друзья заверили нас, что этот шаг является началом активной гражданской кампании по освобождению политзаключенных и солидарности с белорусским народом.

На снимке: *Маршалак польского Сената Богдан Борусевич с Ириной Козулиной и Олегом Волчеком.*

СІТУАЦЫЯ

Фантастычныя пераўтварэнні Дня Волі

У апазіцыйным асяроддзі з'явіліся дзіўныя налепкі-запрашэнні да людзей прыйсці 25 сакавіка ў 12 гадзін на Кастрычніцкую плошчу Мінска святкаваць "День белорусского единства". Налепка, па некаторай інфармацыі аддрукаваная тыражом 50 тысяч экземпляраў, ужо дайшла да валанцёраў, якія мусяць распаўсюджваць гэтую прадукцыю па рэгіёнах.

Друкаваная прадукцыя невядомай вытворчасці ўяўляе сабой, без перабольшвання, гібрыд вужа з яжом. На фоне блакітнага сцяга Еўрапейскага Саюза з колам зорачак у цэнтры злева размешчаны афіцыйны чырвона-зялёны сцяг з надпісам "За свободу! 25 марта. Минск", справа — бел-чырвона-белы сцяг у абрамленні надпісаў "За Беларусь! 12.00. Октябрьская площадь". Унізе надпіс: "День белорусского единства". Тэкст напісаны па-руску, хаця Дзень Волі заўсёды быў акцыяй свядомай часткі беларусаў, агітацыя за які вялася выключна па-беларуску.

Што азначае такое неспалучальнае сумяшчэнне афіцыёзу і апазіцыйных лозунгаў? Правакацыя ўлад ці вынік работы "пятай калоны" ўнутры дэмакратычных сіл?

Першымі звярнула ўвагу на недарэчнасць агітацыйнай прадукцыі прэс-служба АГП. Прадстаўнік партыі Кацярына Ткачэнка кажа, што налепкі ўжо патрапілі да валанцёраў і ўжо распаўсюджваюцца ў рэгіёнах. "На правакацыю ўлад гэта не падобна — налепкі ўтрымліваюць дакладную інфармацыю пра акцыю 25 сакавіка. Аднак спалучэнне неспалучальнага, з'яўленне замест Дня Волі нейкага "Дня белорусского единства" выклікае як мінімум неразуменне", — кажа К.Ткачэнка. Супрацоўніцы прэс-службы АГП вельмі хацелася б высветліць паходжанне гэтай прадукцыі...

Прадстаўнік аргкамітэта па падрыхтоўцы і святкаванні 25 сакавіка — Дня Волі — Віктар Івашкевіч наогул нічога не ведае пра згаданыя налепкі. "Дакладна ведаю: аргкамітэт не рабіў іх. Я не ведаю паходжання гэтай прадукцыі. Думаю, вам трэба звярнуцца да Мілінкевіча — як да аднаго з арганізатараў Дня Волі, які ў арганізацыйным, ідэалагічным плане не ўзгадняе з аргкамітэтам ніякіх сваіх дзеянняў", — адказаў намеснік старшыні Партыі БНФ. (Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, дарэчы, кіруе працай аргкамітэта.)

І сапраўды, калі за выходны пункт браць заклік Аляксандра Мілінкевіча да Аляксандра Лукашэнкі прыйсці 25 сакавіка на Дзень Волі, то выстройваецца пэўны лагічны ланцужок. 7 лютага А.Мілінкевіч заклікаў кіраўніка дзяржавы далучыцца да непасрэднага святкавання 25 сакавіка — разам са сваім народам. "...Добрай магчымасцю для крокаў насустрач адно аднаму магло б стаць святкаванне Дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Дата 25 сакавіка 1918 года таксама важная для беларускай незалежнасці, як і 3 ліпеня 1944 года. Грамадскасць Беларусі ўжо выказалася за сумеснае святкаванне гэтага дня, і я веру, што такое святкаванне можа стаць зыходным пунктам для дэманстрацыі пачатку адзінства беларусаў", — напісаў А.Мілінкевіч.

Аднак звязацца з Аляксандрам Мілінкевічам не ўдалося. Яго паплечнікі сцвярджаюць, што нічога не ведаюць ні пра якія налепкі. Дык што гэта — блытаніна, правакацыя альбо новае слова ў апазіцыйным руху?

Антон СІДОРСКІ.

Гомель адмаўляецца ад удзелу ў Кангрэсе дэмсіл

Прыхільнікі Аляксандра Мілінкевіча ў Гомелі адмаўляюцца браць удзел у Кангрэсе дэмакратычных сіл, лічачы яго правядзенне бессэнсоўным, таму што ён не вырашыць пытанне лідэрства. Пра гэта заявіў кіраўнік абласнога аргкамітэта па стварэнні руху "За Свабоду!" Уладзімір Кацора.

Паводле яго слоў, гомельская каманда экс-кандыдата ў прэзідэнты ў складзе 39 чалавек не будзе браць удзел у кангрэсе паводле сцэнарыя, прапанаванага лідэрамі ПКБ, АГП і Партыі БНФ.

"Дэмакратычным сілам Беларусі неабходны адзін лідэр, таму мы лічым, што ратацыйны спосаб кіраўніцтва Палітычным саветам дэмсіл непрымальны — гэта пацягне яшчэ большыя рознагалоссі паміж лідэрамі. Мілінкевіч заўсёды казаў, што лідэр патрэбны адзін, і мы поўнасцю падтрымліваем яго пазіцыю", — заявіў У.Кацора.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

Грамадою пайшлі на паклон да Партыі БНФ

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) правядзе чарговы партыйны з'езд 4 сакавіка ў памяшканні сядзібы Партыі БНФ. Іншыя ўладальнікі памяшканняў проста адмовілі сацыял-дэмакратам у арэндзе залаў, таму партыі Аляксандра Казуліна давялося прасіць часовага прытулку ў Партыі БНФ. Пра месца з'езда кіраўніцтва партыі паведаміла Міністэрству юстыцыі.

Выканаўца абавязкаў старшыні БСДП (Грамада) Анатоль Ляўковіч кажа, што з'езд партыі — чарговы, з традыцыйным для такіх выпадкаў парадкам дня: справаздача кіраўніцтва і выбары новых кіруючых органаў, а таксама ўнясенне некаторых змен у статут.

На пасаду лідэра партыі прапанавана кандыдатура цяперашняга старшыні БСДП (Г) Аляксандра Казуліна, які адбывае пяць з паловай гадоў зняволення ў калоніі "Віцьба-3". Аднак старшынства ў партыі, калі з'езд падтрымае прапанову ЦК, для зняволенага А.Казуліна акажацца чыста фармальным: з калоніі ажыццяўляць кіраўніцтва партыяй немагчыма. Але Анатоль Ляўковіч не бачыць у тым трагедыі. *"Заканадаўства не забараняе выбіраць старшынёй партыі чалавека, які знаходзіцца ў зняволенні. Што да непасрэднага штодзённага кіраўніцтва партыяй, то Аляксандр Казулін, вядома, не зможа яго ажыццяўляць. Але мы можам узгадняць (і ўзгадняем) прынцыповыя пытанні. А выконваць абавязкі старшыні, па статуце, выпадае на долю першага намесніка старшыні партыі"*, — патлумачыў Анатоль Ляўковіч.

Аляксандр Казулін афіцыйна пагадзіўся балатавацца на пасаду старшыні БСДП (Грамада).

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

Бульдозером по... дому

С необычным случаем встретился я несколько месяцев назад. В Минске, можно сказать, в центре столицы, по частному дому прошелся... бульдозер, сравняв его с землей.

Фактически дом давным-давно снесен, но к кому ни обращусь, все в один голос уверяют: "Дом не исчез". Вот и в Минском городском агентстве по государственной регистрации недвижимости и земельному кадастру заявили: *"Этот дом по улице В.Слуцкой у нас по настоящий день значится во всех бумагах"*.

Более того, я нашел человека, который до сих пор прописан в доме-призраке. А значит, имеет полное право в нем проживать. Но, к сожалению, вот уже почти год не проживает. Вернее, не может проживать. По причине, которую я уже назвал, — подогнали бульдозер, который и разрушил дом вдребезги.

"Не может такого быть", — скажут читатели. А вот и может. У нас, к сожалению, все может быть. Хотите знать суть этой истории — пожалуйста.

На столичной улице Веры Слуцкой было запланировано возведение многоквартирного дома. Но на том месте стояли частные строения. И в 2004 году Мингорисполком принял решение за №1301 об изъятии земельных участков, о сносе жилья в установленном порядке и отселении хозяев. Были даны соответствующие поручения ОДО "Экономика и Право", которое выступило в качестве генерального застройщика.

Казалось бы, все ясно как божий день. Действуйте в установленном законом порядке — и все будет хорошо. Но... Оказывается, в Минске законы писаны не для всех. Не получив согласия владельца жилища, не решив вопрос в судебном порядке, пустили бульдозер — и нет дома. А то, что ссылка на решение Мингорисполкома абсолютно несостоятельна — это никого не волнует. Кроме, конечно, человека, который лишился своего угла.

Оказавшись на улице, собственник обратился в милицию: "Срочно возбудите уголовное дело по факту незаконного уничтожения моего имущества в особо крупных размерах".

Думаете, милиция возбудила уголовное дело? И не подумала. Была получена отписка от... участкового инспектора В.М.Жарича. Похоже, никто не обратил внимания даже на то, что стоимость той части жилого дома №12 по улице В.Слуцкой, права на которую имеет владелица, оценена в 104 миллиона 371 тысячу рублей. Кроме того, были уничтожены дворовые постройки в виде сарая, погреба, садовые насаждения. Никаких договорных отношений с руководством общества с дополнительной ответственностью "Экономика и Право" о наделении его такого рода правами или передачи ему в собственность чужого имущества не существует и не существовало. Не было по этому поводу и решения суда.

Владелице незаконно снесенного жилища пришлось срочно обращаться в прокуратуру. И вот оттуда она получила не один ответ, а целых четыре. Они почти близнецы-братья. Поэтому приведу последний, из городской прокуратуры (с сохранением орфографии и стилистики):

"В прокуратуре города Минска рассмотрена Ваша повторная жалоба на постановление Центрального РУВД об отказе в возбуждении уголовного дела в отношении директора ОДО "Общество и право" Ковтуненко А.Н,, принятая на личном приеме.

Изучением материалов проверки, проведенной Центральным РУВД, установлено, что постановление об отказе в возбуждении уголовного дела по факту сноса дома №12 по ул.В.Слуцкой вынесено обоснованно в связи с отсутствием в действиях должностных лиц ОДО "Экономика и право" состава преступления, предусмотренного ст.218 УК Республики Беларусь.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 30.06.2004 г. №1301 "О предоставлении земельных участков и разрешении строительства и внесении дополнения в решение горисполкома", земельный участок, на котором располагался Ваш дом, изъят для государственных нужд. Согласно решениям суда Центрального района от 07.10.2005 г. и президиума Минского городского суда от 03.05.2006 г. Вы выселены из дома по- ул.В.Слуцкой в квартиру по ул.Гамарника, 28-109, предоставленную Вам в собственность взамен изъятого земельного участка с находящимися на нем постройками. При таких обстоятельствах Вы утратили право собственности на дом, возведенный на изъятом земельном участке. С согласия собственника земельного участка 17.07.2006 дом №12 по ул.В.Слуцкой снесен в установленном порядке. Оснований для отмены постановления об отказе в возбуждении уголовного дела не имеется...".

Ответ этот вызывает массу вопросов. Особенно утверждение, что **есть согласие собственника земельного участка на снос дома.** Нет согласия собственника земельного участка на снос дома. Хозяйка дома не давала такого согласия и никаких бумаг не подписывала, о чем черным по белому написала в жалобе. И дальше: что это за обстоятельства такие, при которых потерпевшая утратила право собственности на дом, что это за установленный порядок, при котором уничтожается твое личное жилье и нет ссылки ни на один закон?

Короче, не ответ, а ребус. Самостоятельно разгадать его я не смог, поэтому обратился за помощью к известному юристу, правозащитнику **Николаю МЕКЕКО.** Николай Михайлович достал Гражданский кодекс, показал статью 236 и сказал:

— Читайте. Прочитали? Теперь познакомьтесь с 240-й статьей.

— Познакомился. И что?

— А то, что прокуроры наши или их не читают, или в упор не видят. Я так сужу по их ответам.

— Вы говорите, как мой знакомый маэстро: если бы композиторы знали ноты, то им бы цены не было.

— Я не музыкант, я юрист. А юристы обязаны знать законы, каждую статью, даже запятые. Они ведь судьбы людей решают. Им ошибки не простительны.

Теперь к делу. Смотрите. Решение Мингорисполкома гласит, что обществу с дополнительной ответственностью "Экономика и Право" вменяется в установленном законом порядке обязанность отселить жильцов из домов 14, 10 и 12 по улице Веры Слуцкой и снести их жилые дома. Подчеркиваю: **в установленном законом порядке.**

— И какой статьей какого Кодекса надо руководствоваться в данном случае?

— Если земельный участок изъят, то решается вопрос о сносе жилого дома. Чтобы его снести, **надо решить проблему собственности.** Есть статья 240 Гражданского кодекса Республики Беларусь. А в ней четко прописано, как это надо делать, прописан порядок отчуждения недвижимости (в данном случае — расположенной на земельном участке. — **Авт.**). Каким образом отчуждается? У собственника можно выкупить дом, или продать его на аукционе, или произвести обмен с новым владельцем участка, что чаще всего и делается. Вот мы даем тебе квартиру и заключаем договор обмена, под которым подписываются обе стороны. Это нормальная практика.

Но в нашем случае она была нарушена. Не было договора, не было подписей, не было обоюдного согласия. Более того, при сносе дома не произвели даже оценку его, а также строений при нем, не определили, как и каким образом компенсировать сносимое. Должна быть определена его стоимость.

— Тогда откуда взялись 104 миллиона?

— Собственница заранее проявила инициативу, пригласила комиссию, и она назвала такую сумму.

Понимаете, чтобы выкупить, надо, еще раз повторяю, цену определить. И не хозяина это забота. Допустим, у меня есть дом и мне предлагают его продать. Я называю свою цену. Не согласны? Тогда давайте проведем независимую оценку и решим вопрос. Но никто с другой стороны дом потерпевшей не оценивал, как не оценивал и другие постройки, имевшиеся на земельном участке. Она сама занималась данной работой. Но сумма в 104 миллиона, вы читали, не впечатлила ни милицию, ни прокуроров. Ее вроде нет. И нет преступления в особо крупном размере. Парадокс. Причем парадокс не только в этом вопросе. Я спрашиваю блюстителей законности: а на каком основании снесен дом? Ведь никто — ни горисполком, ни ОДО "Экономика и Право" — с иском в суд об изъятии его не обращался. Суд и только суд наделен правом решения этого вопроса. В ответ молчание, или начинают плести околесицу.

— А что означают ссылки на решение Мингорисполкома, на государственные нужды?

— Государственные нужды... Опять же смотрите статью 240-ю Гражданского кодекса. Имущество может быть изъято у собственника путем выкупа государством или продажи его с публичных торгов в порядке, предусмотренном законодательством. Поясню. Вот я продавец, у меня есть дом. Земельный участок изъяли, дом будут сносить. Я диктую свои условия. Именно я, а не кто-то их диктует мне. Жилищным кодексом право выбора оставлено за мной. Есть четыре варианта: выделение квартиры, компенсация деньгами, перенос дома или строительство нового на новом участке. Вот и все.

— Но если я упрямый и требую дворца?

— Повышенные требования?

— Да.

— Что ж, требования должны соответствовать тому, что есть, то есть должны быть реальными. Вот у меня, например, две комнаты в частном доме. Не стану же я требовать пятикомнатную квартиру, а буду просить соразмерную моему жилью. У меня, скажем, 60 квадратных метров. Вот и дайте мне их, но в хорошем доме. Зачем мне, вселившись, капитальный ремонт делать, тратя свои деньги? Или нюхать вонь, исходящую от мусоросборника, расположенного по соседству? Добротное, соответствующее всем нормам жилье редко когда предлагают, стараются дать то, что подешевле и что поменьше.

— А я хочу добротного и стою на своем, как хозяйка снесенного дома по улице Слуцкой.

— Тогда, согласно закону, вашим вопросом должен заняться государственный орган, поскольку изъятие участка связано, как они пишут, с государственными нуждами. В данном случае узел должен развязывать Мингорисполком. Он вправе выступить истцом по делу, он обязан предъявлять иск в суд об отчуждении дома. И выкупить его. А чтобы цена была реальная, я уже говорил, следует назначить экспертизу. И опять же, если нет согласия с застройщиком, то есть он не может уплатить столько денег, сколько установлено экспертизой и судом, то в таком случае Мингорисполком может назначить торги. Приглашаются покупатели. И передается участок под застройку тому, кто даст за имущество, находящееся на его территории, больше, чем планируемый первоначальный застройщик. Вот это самый лучший вариант, самый честный.

— Но о таких торгах в Минске я что-то не слышал.

— Все идет по накатанной колее советских времен. Пришли, забрали, выбросили. И на права собственника наплевать.

— И прокуроры не видят этого безобразия?

— А у них тоже советская практика. Ничего не рассматривают, пишут какую-то, простите за образность, билиберду, ссылаются на решение горисполкома, приплетают решение суда, хотя то решение, на которое они ссылаются, вообще не касается изъятия собственности. **Никто не изымал у потерпевшей собственность. И горисполком не наделен правом изъятия ее, он может только предложить свои условия. А все решает суд. Но с иском в суд, повторюсь, никто не обращался.**

— И получается так: дома давным-давно нет, он снесен, и в то же время он как бы есть, числится в бумагах соответствующих ведомств.

— В Минском городском агентстве по государственной регистрации недвижимости и земельному кадастру он по настоящее время зарегистрирован как частная собственность. И на сегодняшний день есть владелец у него.

— Странная ситуация: домпризрак, хозяйка, можно сказать, бомж, ютится у родственников… Что ей делать сейчас?

— Ждать ответа от Генерального прокурора. Может, он вникнет в суть проблемы. А вообще, надо в принципе менять систему работы Мингорисполкома. Если чиновники этого органа власти считают, что выделение земельного участка связано с государственными нуждами, и изымают частную собственность, то и занимайтесь сами этими делами, не поручайте посредникам, которые, как видим, не выполняют требований закона. А в законе четко написано: делом этим должен заниматься государственный орган. Он решает вопросы отчуждения собственности путем выкупа или продажи на аукционе. Других способов нет.

Но прокуратура отыскала эти "другие способы". И потерпевшей ничего не оставалось, как в заявлении в прокуратуру г.Минска написать: **"Прокурором Центрального района моя жалоба оставлена без удовлетворения, а это говорит о том, что прокурор района уклонился от исполнения своих должностных обязанностей и тем самым сам подпадает под уголовную ответственность".**

На чужой роток не накинешь платок. Но мы с вами проштудировали статьи Гражданского и Жилищного кодексов Республики Беларусь. Для непонятливых несколько раз повторили их положения. А статьи эти красноречивее всяких слов. Думаю, они дают оценку прокурорским ответам. Мой совет: пора выполнять президентскую Директиву №2, где четко и ясно сказано: *"...неуважение к людям, безразличие к их судьбам подрывает доверие к государству. Такое положение недопустимо. При принятии решений, затрагивающих права и законные интересы граждан, надо неукоснительно соблюдать требования законодательства, не допускать их произвольного толкования и "отсебятину" при применении".*

— А вот это, Николай Михайлович, прямо в точку. Строки эти касаются дела, о котором мы и говорили. Так что, господа прокуроры, пора делать выводы. Не надо *"отсебятины"*, **не надо плодить призраков. И не только на улице Слуцкой, что в Минске.**

Евгений КАЗЮКИН.

РАСПРОДАЖ-2007

Купіць заводзік не жадаеце?

Міністэрства эканомікі Беларусі распрацавала план прыватызацыі некалькіх буйных прадпрыемстваў краіны.

Як інфармуе расійская газета "Ведомости", сярод прадпрыемстваў такія буйныя, як "Нафтан", Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, ААТ "Палімір", "Белшына", "Гродна Азот", кампанія "Белтэлекам", тытунёвая фабрыка "Нёман"... Таксама разглядаецца варыянт продажу буйных пакетаў акцый прадпрыемстваў "Крыніца", "Мінскі завод ігрыстых він" ды іншых.

Паведамляецца, што аўтары праграмы збіраюцца правесці ў гэтым годзе конкурс па продажы акцый беларускіх прадпрыемстваў, і расійскія прадпрымальнікі ўжо атрымалі некаторыя прапановы.

"Пакуль гэта ўсё, натуральна, на ўзроўні размоў, — кажа карэспандэнту "Народнай волі" намеснік генеральнага дырэктара "Гродна Азот" па маркетынгу **Сяргей Жарскі**. — *Хоць калі хтосьці на самай справе збярэцца ўкласці грошы ў наша прадпрыемства, то гэта будзе проста цудоўна, інвестыцыі неабходны. Так што нічога дрэннага тут не бачу".*

"У нас зараз на заводзе знаходзяцца прадстаўнікі вядомых піўных кампаній "Heineken" і "Miller", вось яны, напэўна, зараз і глядзяць, прыцэньваюцца, — паведаміў мне ў ААТ "Крыніца" чалавек, які не пажадаў, каб называлі яго прозвішча. — *Аднак жа ўсім вядома гісторыя з "Балтикой", якая таксама збіралася выкупляць нашы акцыі... Дарэчы, наколькі мне вядома, "Балтика" напярэдадні Новага года выкупіла 30 працэнтаў акцый "Аліварыі".*

— Тое, што Мінэканомікі мае намер пачаць распродаж акцый прадпрыемстваў, гаворыць аб тым, што беларускую эканамічную мадэль вельмі моцна прыціснула адным лёгкім подыхам нафтагазавых пароў, — каментуе сітуацыю эканаміст **Яраслаў Раманчук**. — Зараз мы пачалі прасіць крэдыты, і аказваецца, што нават 2,5 мільярда долараў нам мала. А ўсё таму, што ніякай канцэпцыі і ідэі адносна кіравання прадпрыемствамі, якія моцна завязаны на энергарэсурсах, у нашых улад няма. Вось і збіраюцца спіхнуць каму-небудзь гэтыя энергастратныя прадпрыемствы, каб новыя гаспадары ўзялі на сябе мадэрнізацыю, структурызацыю, выплату заробкаў. Пры гэтым улады нават тэарэтычна не дапускаюць думкі аб продажы кантрольных пакетаў акцый, што наўрад ці зацікавіць сур'ёзных людзей.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

ДИПКУРЬЕР

Мирей МЮССО:

«Франция, как и вся Европа, ожидает от Беларуси каких-то ответных действий...»

Мирей Мюссо — не только новый Чрезвычайный и Полномочный посол Франции в Беларуси. Она еще просто красивая женщина. Поэтому мы говорили с ней не только о политике и дипломатическом этикете...

О работе и быте

— В Минске Вы находитесь недавно. Как чувствуете себя здесь? Оправдались ли Ваши надежды, а возможно, и опасения в связи с новым местом работы?

— Здесь я чувствую себя очень хорошо. У меня еще не было возможности посмотреть весь город, видела только центр. Но я нахожу Минск довольно привлекательным. Снег на зданиях придает какую-то праздничную и даже феерическую атмосферу...

Вначале, когда заступаешь на пост, очень много административной работы: нужно ознакомиться с различными делами, решить какие-то внутренние вопросы. Недавно я вручила верительные грамоты и теперь уже начинаю совершать официальные визиты. На ближайшее время намечены поездки за пределы Минска.

Честно говоря, у меня не было совершенно никаких предрассудков насчет Беларуси. Правда, Минск я представляла себе не таким современным.

— Бывший посол Франции в Беларуси Стефан Шмелевский сообщил, что Вы завершаете дипломатическую карьеру. Если не секрет, у Вас был выбор, куда поехать после Тбилиси?

— Нет, выбора не было. Дипломатический работник в некотором смысле как солдат — едет туда, куда ему говорит руководство. Естественно, я высказывала свои пожелания. Одним из моих желаний было остаться в Европе. Это прежде всего связано с языками, которыми я владею.

— Для такого опытного дипломата, как Вы, работа в Беларуси считается престижной или называется "почетной ссылкой"?

— Беларусь находится в Европе. А для Франции все посты в Европе одинаково важны и приоритетны. И мы надеемся, что со временем Беларусь займет должное место в европейской семье.

— Многие иностранцы говорят, что для них Беларусь — это прежде всего чистые улицы и красивые девушки. С чем еще у Вас ассоциируется наша страна?

— Возможно, я смогу ответить на этот вопрос немного позже, когда получше узнаю Беларусь.

— Тогда спрошу о личном: успели ли уже обустроить свой белорусский дом?

— Резиденция французского посла сама по себе уже давно обустроена, я лишь привнесла в интерьер какие-то свои элементы. Привезла некоторые картины, книги. Теперь я уже точно знаю, как выглядит мой здешний дом, поэтому в следующий раз из Франции привезу лишь какие-то конкретные недостающие вещи.

— Вы приехали сюда, образно говоря, на пустое поле, или все-таки у Мирей Мюссо в Беларуси есть знакомые?

— Нет, я здесь никого не знала.

О политике и подарках

— Недавно Вы вручили верительные грамоты А.Лукашенко. Какие впечатления остались от встречи? Говорят, первые впечатления — обычно самые сильные...

— Очень сложно сказать... Для меня было честью встретиться с президентом, но, к сожалению, особенности белорусского дипломатического протокола не позволили провести с ним какую-то беседу. Надеюсь, у нас еще будет возможность встретиться. А сама по себе церемония была приятной.

— Каким шампанским Вас угощали после вручения грамот?

— Не знаю...

— В старые времена была традиция: дипломаты вручали царю не только королевскую (верительную) грамоту, но и дорогие подарки. Сейчас это практикуется, или послы идут на прием к главе государства с пустыми руками?

— Эта традиция давно ушла в прошлое. Дело в том, что раньше посол прибывал в страну на очень долгий период — на 10—15 лет. И вручение грамот было единственным контактом между государствами. Сейчас послы меняются гораздо чаще — каждые 3—4 года. И контактов между странами гораздо больше. Например, визиты глав государств, в рамках которых и происходит обмен подарками на официальном уровне. Кстати, недавно президент Франции Жак Ширак открыл музей в местечке Сарран департамента Коррез, где выставлены все подарки, которые преподносили ему как президенту страны...

— А в Беларуси такого музея нет. И неизвестно, где хранит подарки Александр Григорьевич, что с ними делает...

— Может, когда-нибудь появится... Во Франции все началось с генерала де Голля — он передал все дары государству. А музей президентских подарков первым создал Франсуа Миттеран.

— Во время церемонии вручения верительных грамот Лукашенко сказал, что очень рассчитывает на Францию, а значит, и на Вас, в налаживании контактов с Западом...

— В данном случае речь идет о том, что Франция готова помочь Беларуси найти контакт с Европой. Но при этом Франция, как и вся Европа, ожидает от Беларуси каких-то ответных действий. Необходимо, чтобы Беларусь соблюдала принципы, общие для всей Европы. Пользуясь спортивной терминологией, можно сказать, что сейчас мяч находится на стороне Беларуси. Европа сделала предложение. Беларусь должна ответить на него.

— А как Вы в целом оцениваете резкий разворот Лукашенко на Запад?

— Честно говоря, мы как-то не заметили разворота на 180 градусов, о котором говорят некоторые. Да его и в принципе не должно быть. Просто каждая страна в силу своего географического положения должна поддерживать сбалансированные отношения со всеми соседями. Международная политика не должна быть однобокой.

— Стефан Шмелевский считал, что теперешняя общественно-политическая обстановка в Беларуси не позволяет улучшить наши двусторонние отношения. А как Вы оцениваете состояние диалога между нашими странами?

— Диалог на данный момент очень слабый. Но мы надеемся на его развитие. Для этого Беларусь должна выполнить те условия, которые выдвинул Евросоюз. Это освобождение политзаключенных, соблюдение прав человека, свободы слова и др.

О бизнесе

— По-Вашему, может ли сблизить наши страны строительство АЭС, о котором ведут переговоры наши страны?

— Я сразу хочу отметить, что у нас рыночная экономика, поэтому переговоры ведутся не на государственном уровне, а на уровне предприятий. Белорусская сторона пока направила нашим специалистам запросы чисто технического характера. Насколько я знаю, белорусы сделали точно такие же запросы на предприятия других стран.

— Председатель президиума Академии наук Михаил Мясникович обмолвился, что при выборе партнера по строительству АЭС обязательно будут учтены политические нюансы. А Стефан Шмелевский заявил, что Франция не готова продвигать свои экономические интересы, сквозь пальцы глядя на нарушение в Беларуси прав человека и свободы слова. Как думаете, французский бизнес готов отказаться от предполагаемого крупного контракта?

— К нашим специалистам действительно очень часто обращаются за советами в сфере атомной энергетики, потому что во Франции более 80 процентов электроэнергии вырабатывается атомными электростанциями. Французские предприятия, занимающиеся строительством АЭС, получают очень много заказов. В случае позитивного решения всех технических вопросов, французские предприятия неизбежно столкнутся с финансовыми, юридическими и политическими вопросами. Каким будет решение французских бизнесменов я не знаю. В любом случае это будет только их решение.

— Недавно новый посол Литвы заявил о том, что Литва и Беларусь могли бы проводить совместные переговоры о покупке реакторов. Мол, если бы мы действовали вместе, то могли бы получить скидку у французской стороны. Как Вы на это смотрите?

— Я не имею достаточной информации об этом. К тому же данный вопрос находится не в компетенции французского государства. Это решают сами предприятия.

— Вы имеете диплом о высшем специальном образовании в области обороны. Уже успели изучить, в какие страны Беларусь продает вооружение?

— Я знаю точно, что Беларусь производит оружие и, естественно, продает его, как и многие страны. Но есть страны, продажа оружия которым запрещена решением ООН. И я надеюсь, что Беларусь, как и Франция, соблюдает данное предписание. В основном запрет распространяется на страны, находящиеся в стадии войны. Не секрет, что существуют "черные рынки". Но тем не менее государства должны уважать решения, принятые на международном уровне.

А что касается моей учебы, то диплом о военном образовании я получала около 20 лет назад. Но я по-прежнему слежу за политической и стратегической ситуацией в мире.

Об этикете

— В последние годы в Беларуси сложилась одна не очень приятная традиция: первые лица МИД и высокопоставленные чиновники не всегда появляются на приемах, которые устраивают представители европейских стран, например, по случаю Национального праздника. Как Вы относитесь к подобным вещам?

— К счастью, я пока с этим не сталкивалась. Каждая страна вольна выбирать тех, кого она отправляет на приемы в диппредставительства других стран. Но когда посол радушно приглашает на прием представителей власти, то он ожидает, что ему ответят взаимностью, что позволит наладить больший контакт и в дальнейшем даст возможность нанести ответный визит.

— Дипломаты — это люди, которые мастерски могут уйти от ответа на любой вопрос. Если Вам что-то не нравится, Вы можете сказать об этом в лоб, невзирая на строгий дипломатический протокол?

— Я думаю, что можно говорить обо всем, особенно тем людям, которых мы считаем своими друзьями. Потому что если друзья не скажут о недостатках, то тебе о них никто не скажет. Думаю, проблема не в том, что сказать, а как это сказать. Манера высказываний не должна быть агрессивной.

О моде на детей

— Беларусь сейчас решает демографическую проблему. А социологи называют француженок "чемпионками Европы" по количеству детей. Расскажите, пожалуйста, как во Франции государство помогает молодым матерям?

— Декретный отпуск во Франции длится 16 недель — 6 недель до родов и 10 после. В случае каких-то осложнений и трудностей к этому сроку можно добавлять еще 1—2 месяца. Во время декретного отпуска матери полностью получают свою зарплату. При рождении ребенка выплачивается единовременное пособие. Существуют также специальные пособия, сумма которых зависит от того, какой по счету ребенок рождается в семье. Чем больше детей, тем больше размер пособия. Есть пособия, которые выплачиваются по достижении определенного возраста ребенка.

Недавно у нас появилось понятие "родительский отпуск", который может длиться три года без выплаты зарплаты, но в течение этого времени за вами сохраняется рабочее место вне зависимости от того, где вы работаете.

— Не так давно газета "Liberation" распространила заявления ведущих социологов Франции об исключительности французских женщин. По их словам, француженки — лучшие в Европе матери, работницы и едва ли не самые привлекательные женщины... Как им удается совмещать такие трудно совместимые вещи?

— Во Франции 87 процентов женщин, которые достигли трудоспособного возраста, — работают. Это самый высокий показатель в Европе, который напрямую связан с организацией труда. Есть возможность выбирать, сколько работать — полный день или несколько часов в день.

Также во Франции детей принимают в школу с четырех лет, а в некоторых муниципалитетах — даже с трех. И уже с этого возраста дети начинают постигать какие-то науки. В то время как в других европейских странах невозможно отправить ребенка в школу до шести лет.

При многих предприятиях и организациях работают ясли. Это достаточно новая тенденция, и их создание даже заложено в программах кандидатов на президентский пост.

Все это существенно облегчает жизнь женщин, позволяет им больше времени уделять себе. К тому же во Франции магазины открыты даже в обед и в выходные дни.

— Кстати, о магазинах. Вы уже успели в них заглянуть?

— Пока успела побывать лишь в столичных гипермаркетах.

— Француженки всегда были эталоном элегантности. Вы наверняка отметили, как одеты белорусские женщины...

— Пока я вижу их одетыми в большие красивые шубы и зимние шапки. Поэтому свое мнение о них я выскажу весной или летом...

О секретах красоты

— Уже многие газеты сообщили, что Мирей Мюссо впервые отпраздновала свой день рождения в Беларуси. Но никто не писал, как и где Вы его праздновали...

— Я отмечала день рождения в компании своих коллег по посольству, которые мне устроили сюрприз. Мне было очень приятно.

— Не так давно буквально в двух шагах от посольства Франции открылся французский ресторанчик. Вы уже успели попробовать там французские блюда?

— Пока нет. Зато уже дважды была в ресторанах с белорусской кухней. Я сама хорошо готовлю и поэтому с интересом отношусь к каким-то новым блюдам...

— Интересно, в Минске Вы готовите из тех продуктов, которые продаются здесь, ездите за провиантом в Вильнюс, как это делают некоторые другие дипломаты, или все привозите из Франции?

— На мой взгляд, продуктов хватает и здесь. Но когда есть необходимость приготовить какое-то особое блюдо, для которого не хватает ингредиентов, то, естественно, их можно купить и в Вильнюсе. А вот, например, фуа-гра я привозила из Франции. Но если здесь смогу найти подходящую сырую гусиную печень, из которой можно будет приготовить фуа-гра, то я с удовольствием куплю ее.

— Простите за бестактный вопрос, но как Вам удалось сохранить такую молодую красоту? Впервые увидев Вас по телевизору, я, честно, говоря, подумала, что неправильно информирована о дате Вашего рождения...

— Забудьте про мой возраст, это государственная тайна! *(Смеется.)*

А если серьезно, то несложно выглядеть хорошо, имея хорошие гены. Безусловно, вопросы питания и жизни в хороших санитарных условиях также влияют на внешность. Кстати, я не вегетарианка. Ем все. Пью красное вино, которое полезно для здоровья.

Можно сказать, что мне повезло родиться во Франции, где ситуация позволяет детям расти и учиться в хороших условиях. Кроме этого, я родилась после Второй мировой войны, и, в отличие от моих родителей, у меня не было каких-то серьезных потрясений в жизни. Также мне повезло, что родители занимались мной и моим образованием.

— А как же пресловутый здоровый образ жизни?

— Когда была моложе, занималась верховой ездой, плаванием, парусным спортом, дзюдо и дайвингом. Но сейчас у меня нет столько свободного времени. Чем выше мы продвигаемся по иерархической лестнице, тем больше и серьезнее становятся дела и тем меньше остается времени на себя... Раньше я регулярно ходила на массаж. Надеюсь, что в Минске снова смогу это делать...

— Насколько мне известно, Вы приехали в Минск одна...

— Да. Свою семью я оставила в Париже...

Марина КОКТЫШ.

ГРОШЫ

Беларусь просіць у Расіі паўтара мільярда долараў

Не прайшло і двух месяцаў пасля ўвядзення новых цэн на энерганосьбіты, а ўрад Беларусі ўжо звярнуўся да ўрада Расіі з просьбай выдзеліць нашай краіне аграмадны стабілізацыйны крэдыт — 1,5 мільярда долараў ЗША.

Гэта абумоўлена неабходнасцю дадатковага фінансавання расходаў бюджэту, выкліканых рэзкім павышэннем цэн на расійскія энерганосьбіты, паведамілі афіцыйныя крыніцы са спасылкай на Міністэрства фінансаў Беларусі. Каб было больш зразумела, што азначаюць гэтыя лічбы, паведамляем: па стане на 1 студзеня 2007 года знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь складаў 837,9 млн долараў ЗША. Такім чынам, Беларусь просіць пазыкі, якая амаль у два разы перавысіць даўгі, якія мы "назапасілі" за апошнія дванаццаць гадоў.

Наколькі вядома, спачатку беларускае кіраўніцтва спадзявалася абысціся без расійскай дапамогі. Так, 7 лютага, выступаючы на пасяджэнні калегіі Мінфіна, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі заявіў, што ў гэтым годзе ставіцца задача прыцягнуць у беларускі бюджэт прыблізна 1,5 млрд долараў знешніх рэсурсаў. *"Цяпер дзесяткі найбуйнейшых замежных банкаў прапануюць рэсурсы нашай краіне. Я думаю, што ў сакавіку ў нас павінны быць як мінімум 500 млн долараў ЗША незвязаных крэдытаў, прадастаўленых пад эфектыўныя праекты"*, — сказаў С.Сідорскі.

І дзе тыя "найбуйнейшыя банкі"? Па дапамогу зноў пайшлі да ўсходніх суседзяў.

А там нібы чакалі, каб беларусы зноў прыйшлі з працягнутай рукой. *"Расія можа разгледзець пытанне аб прадастаўленні Беларусі стабілізацыйнага крэдыту"*, — адразу заявіў кіраўнік Мінэканамразвіцця РФ Герман Грэф.

"Лічу, што гэта мае права на існаванне. Урад Расіі гатовы разгледзець пытанне крэдытавання. Памеры і ўмовы такога крэдыту — гэта прадмет перамоў", — сказаў Г.Грэф.

Алег СНОЎ.

Парупіліся...

У Беларусі будзе ўстаноўлены мінімальны абавязковы памер аліментаў. Адпаведны законапраект ужо знаходзіцца ў парламенце.

Міністэрства юстыцыі прапануе дэпутатам устанавіць абавязковы мінімум грашовых адлічэнняў на дзіця ў памеры адной базавай велічыні. На сёння гэта 31 тысяча беларускіх рублёў. Зразумела, што гэта не грошы. Але многія дзеці і гэтага не атрымліваюць ад сваіх бацькоў.

Ігар МАРОЗАЎ.

ПАЛІТКУХНЯ

Камуністы змагаюцца за мінскую арганізацыю

13 сакавіка Мінскі гарадскі суд павінен разглядзець скаргу кіраўніцтва Партыі камуністаў Беларускай на адмову ўпраўлення юстыцыі Мінска паставіць на ўлік гарадскую арганізацыю ПКБ. 27 лютага ў судзе прайшла папярэдняя бяседа бакоў, якія ўдзельнічаюць у працэсе.

Так атрымалася, што практычна ў адзін момант упраўленне юстыцыі Мінскага гарвыканкама зняло з уліку сталічную арганізацыю партыі і забрала юрыдычны адрас структуры. *"Мы знайшлі новы юрыдычны адрас і вось ужо трэці раз атрымалі адмову ад упраўлення юстыцыі ў пастаноўцы на ўлік Мінскай гарадской арганізацыі партыі. Трэці раз спрабуем зарэгістраваць арганізацыю. Хопіць ужо: мы вырашылі, што будзем абараняць свае правы праз суд. Бо атрымліваецца зачараванае кола: без юрыдычнага адрасу не ставяць на ўлік, а на ўлік не ставяць — бо не зарэгістраваны юрыдычны адрас"*, — паведаміла сакратар ЦК Партыі камуністаў Беларускай Алена Скрыган.

Дарэчы, незалежныя назіральнікі адзінадушны ў тым, што праблемы ПКБ звязаны толькі з адным: з палітычным узмацненнем пазіцый лідэра ПКБ Сяргея Калякіна, персона якога нечакана "стрэліла" і ў Маскве, і ў Мінску ў якасці новага лідэра дэмакратычных сіл. Многія паліттэхнолагі ўбачылі ў Калякіне большую харызму і патэнцыял, чым нават у Мілінкевіча.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

СПАДЧЫНА

Памяць запозненай не бывае

Вуліца Фамы Ляшонка — такі новы адрас з'явіўся ў райцэнтры Глыбокае на Віцебшчыне. Рашэнне ўвекавечыць такім чынам памяць паэта-земляка прыняў райвыканкам паводле прапановы дэпутатаў раённага Савета.

Фама Ляшонак нарадзіўся ў вёсцы Загор'е ў 1935 годзе. Да выхаду на пенсію працаваў начальнікам энерганагляду мясцовага падраздзялення прадпрыемства "Віцебскэнерга", а ў вольны час пісаў вершы. Дакладней кажучы, ён стварае іх пастаянна, бо паэзія не пакідала ягоную душу ні на хвіліну. Напрыканцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя, якраз перад выхадам Ф.Ляшонка на пенсію, з друку выйшла першая кніжка ягоных вершаў пад сціплай назвай "Запознены дар". Гэта стала падзеяй для Глыбокага і прынесла немалады ўжо аўтару вядомасць у краіне. Паэт з "глыбінкі" быў прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Лірыка Фамы Ляшонка такая шчырая і мілагучная, што літаральна просіцца быць пакладзенай на музыку і стаць песнямі. Так і здарылася з вершамі "Мак ля тыну", "Рабіна-вае полымя" і "Гронка бэзу". Іх спяваюць і сталыя людзі, і моладзь.

Трэцюю сваю кнігу, прароча названую "Апошні ліставпад", Фама Васільевіч бачыў і чытаў толькі ў рукапісе. Патрымаць яе ў друкаваным выглядзе ён не паспеў: памёр якраз напярэдадні выхаду зборніка ў свет, два гады таму.

Вуліца Фамы Ляшонка — не ў цэнтры Глыбокага, а ў новым мікрараёне "Беразвечча". І адпаведнай шыльды там яшчэ няма. Але вуліца паэта хутка забудоўваецца і абяцае стаць прыгожай і доўгай, як жыццё добрых вершаў.

Запознены дар, магчыма, бывае. А вось памяць пра таленавітага і сардэчнага чалавека, якім ведалі ў Глыбокім Фаму Ляшонка, на шчасце, не спазнілася. І наогул, светлая памяць запозненай не бывае...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

УЗНАГАРОДЫ

Суіскальнікі

Тры дзеячы культуры Беларусі вылучаны на суісканне прэміі саюзнай дзяржавы за творы літаратуры і мастацтва. Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка.

Паводле яго слоў, на калегіі Міністэрства культуры суіскальнікамі прэміі зацверджаны народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі і прэміі камсамолу Беларусі, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Міхаіл Фінберг, акцёр Тэатра-студыі кінаакцёра кінастудыі "Беларусьфільм", лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР, Беларусі і прэміі Ленінскага камсамолу **Уладзімір Гасцюхін**, а таксама архітэктар і скульптар, лаўрэат Ленінскай прэміі і прэміі камсамолу Беларусі **Валянцін Занковіч**.

Паводле слоў намесніка міністра, уручэнне прэмій саюзнай дзяржавы, магчыма, адбудзецца 7 ліпеня на адкрыцці фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Марат ГАРАВЫ.

АФІЦЫЙНА

Маму і тату сіротам будуць настойліва шукаць у Беларусі

Пастановай Савета міністраў у Беларусі зменены правілы міжнароднага ўсынаўлення дзяцей.

Згодна з імі, на ўсынаўленне перадаюцца дзеці, звесткі аб якіх знаходзяцца ў банку даных сірот, — гэта каля 12 тысяч дзяцей. Для міжнароднага ўсынаўлення могуць рэкамендавацца дзеці, якія знаходзіліся ў гэтым спісе не менш за год і якім не змаглі знайсці прыёмную сям'ю ў Беларусі. Намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва адзначыла ў размове з карэспандэнтам БелАПАН, што зараз спіс дзяцей для міжнароднага ўсынаўлення фарміруецца па ініцыятыве рэгіянальных органаў апекі. Раней гэтым займаўся Нацыянальны цэнтр усынаўлення. *"Цяпер звароты замежных грамадзян будуць паступаць на разгляд у рэгіянальны орган апекі, а потым ужо ў Цэнтр усынаўлення"*, — удакладніла намеснік міністра. Пры гэтым яна падкрэсліла, што ўсынаўленне будзе ажыццяўляцца толькі грамадзянамі тых краін, з якімі заключаны адпаведныя пагадненні. *"На сёння такое пагадненне заключана толькі з Італіяй, — падкрэсліла Таццяна Кавалёва. — Усе краіны праінфармаваны, ім разасланы праекты пагадненняў, але пакуль яркай ініцыятывы ад іншых краін і падпісаных дакументаў няма"*.

Т.Кавалёва таксама адзначыла, што ў новай пастанове дакладна прапісаны падставы, якія трэба ўлічваць пры прыняцці рашэнняў аб міжнародным усынаўленні. *"Павінна быць праведзена планамерная работа па знаходжанні дзіцяці беларускай сям'і*, — сказала Т.Кавалёва. *— Павінна ўлічвацца, ці ёсць у дзіцяці сваякі, усе яны павінны быць апытаны на прадмет узяцця дзіцяці пад апеку. Абавязкова неабходна высветліць, ці ёсць у дзіцяці браты або сёстры — вельмі важна захоўваць гэтыя сваяцкія сувязі"*.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Пах іранскай нафты

Апошнім часам настойліва прапрацоўваецца і прапагандуецца праект па здабычы і пакупцы нафты ў Іране. Але наколькі ён выгадны? І чаму пах нафты так моцна ўзбуджае беларускіх чыноўнікаў?

Нагадаем, што Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду актыўней працаваць над пошукам альтэрнатыўных паставак энерганосьбітаў у Беларусь. Ён падкрэсліў, што сёння гэта пытанне нашай нацыянальнай бяспекі.

Такі паварот трэба толькі вітаць. Таму што прывязка да адной крыніцы энерганосьбітаў — рэч вельмі рызыкоўная. Газавая і нафтавая "войны" з Расіяй ярка пацвердзілі такую ісціну. Больш таго, яны дапамаглі таму-сяму расплюшчыць вочы і ўбачыць свет такім, які ён ёсць. Шкада толькі, што за важную справу ўзяліся з вялікім спазнаннем.

Аднак які ён, іранскі праект? Сёе-тое расказаў аб ім на прэс-канферэнцыі пасол Ірана ў Беларусі Абдальхамід Фекры. Ён зазначыў, што ўдзел беларускіх кампаній у распрацоўцы іранскіх нафтавых радовішчаў прадугледжана мемарандумам аб супрацоўніцтве ў галіне энергетыкі, падпісаным у ходзе візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Іран. Пачаткам яго рэалізацыі стаў візіт у Беларусь у снежні 2006 года іранскага міністра нафты Казема Вазіры Хамане.

Затым група беларускіх спецыялістаў азнаёмілася з некалькімі радовішчамі, прапанаванымі Міністэрствам нафты Ірана для сумеснай распрацоўкі, і выбралі Джофейр. *"Цяпер мы чакаем, калі беларускі бок прадставіць бізнес-план разведкі і здабычы,* — сказаў пасол. — *Пасля яго прыняцця будзе заключаны дагавор па рэалізацыі праекта".*

У вытворчым аб'яднанні "Беларусьнафта" пацвердзілі, што там ажыццяўляецца комплексная прапрацоўка тэхнічных, фінансавых і другіх пытанняў па асваенні іранскага радовішча.

Так што справа хутка прасоўваецца. Але нельга не звярнуць увагу на адну акалічнасць — бакі гавораць агульнымі словамі, не называючы ніякіх лічбаў. Якія выгоды прынясе рэалізацыя названага праекта? Звычайна з гэтага і пачынаюцца ўсе работы і размовы. А тут маўчанне. Ці не сведчыць гэта аб тым, што па галоўным пытанні пакуль няма дамовы? Ці пакуль няма разлікаў?

Між тым пры рэалізацыі гэтага праекта ёсць дзве вялікія праблемы — нестабільнасць рэгіёну і складаныя шляхі дастаўкі з яго нафты ў Беларусь.

Не патрапіць бы ў пекла

У Ірана вельмі складаныя адносіны з ЗША і Еўрапейскім Саюзам. Апошнія даклады ЦРУ сведчаць, што адміністрацыя амерыканскага прэзідэнта разглядае не толькі магчымасць удару па Іране, найперш па яго атамных аб'ектах, але і верагоднасць скарыстання суседніх палітычных груповак для дэстабілізацыі краіны. Днямі сам Буш зрабіў важную заяву. Ён прама заявіў, што некаторыя іранскія групоўкі забяспечваюць шыіцкіх баевікоў Ірана бомбамі, якімі забіваюць амерыканскіх салдат.

Гэта вельмі сур'ёзна. Прэзідэнт ЗША ўпершыню пацвердзіў тое, што раней агучвалі "неназваныя прадстаўнікі" арміі і разведкі. А днямі стала вядома, што ўжо вызначаны аб'екты для ўдару, пасля якога будуць знішчаны і ўсе аб'екты нафтаздабычы.

Калі тут разгарыцца канфлікт, дык усе ўкладанні ў праект "згараць" у ім. Калі такое не здарыцца, дык застаецца іранская атамная праграма, якая выклікае занепакоенасць у ЗША і Еўропе. І не толькі ў іх. У снежні мінулага года Савет Бяспекі ААН аднагалосна прыняў рэзалюцыю, якая прадугледжвае ўвядзенне санкцый супраць Ірана ў сувязі з яго адмовай спыніць абагачэнне ўрана. Санкцыі ўключаюць пакуль забарону на імпарт у Іран і экспарт з яго ядзерных матэрыялаў і тэхналогій, замарожванне замежных актываў шэрагу іранскіх арганізацый. ЗША, Еўрапейскі Саюз і Японія ўжо прынялі санкцыі да гэтай краіны. І гэта толькі пачатак. Санкцыі могуць быць пашыраны і на нафту.

Як тады вядучыя краіны расцэняць рашэнне Беларусі развіваць нафтавае супрацоўніцтва з Іранам? Вядома ж, не толькі непахвальна, але могуць стукнуць санкцыямі па Беларусі. А нам ніяк нельга даводзіць справу да такога павароту.

Нагадаю, што ў гандлі з Еўрапейскім Саюзам у нас станоўчае сальда, аж 4 мільярды долараў за леташні год. Менавіта яны, гэтыя амаль 4 мільярды, і ратуюць пакуль эканоміку, дазваляюць разлічвацца з Расіяй за энерганосьбіты. А калі з-за супрацоўніцтва з Іранам іх згубім? Такі варыянт зусім выключаць нельга. Еўрапейскі Саюз ужо ўжыў некаторыя санкцыі да Беларусі з-за прыцяснення прафсаюзаў.

Няпростыя адносіны Ірана з суседзямі — з Іракам, Азербайджанам, пакуль не падзелены басейн Каспійскага мора, багатага нафтай, з прылеглымі краінамі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што Іран — неспакойнае, нестабільнае месца, багатае на розныя рызыкі. Можна патрапіць у такое пекла!..

Чыгункай? Морам?

Другая праблема — складаныя шляхі дастаўкі адтуль нафты ў нашу краіну. Самы кароткі шлях праз Каўказ. Але ён нестабільны і рызыкоўны. Тут, акрамя вышэйпералічанага, чатыры "гарачыя кропкі" — Нагорны Карабах, з-за якога канфліктуюць Арменія і Азербайджан, ды Абхазія, Паўднёвая Асеція, Чэчня. У любы час можа парушыцца адносны спакой. Тут праглядваюцца рызыкі ў плане розных здарэнняў, пошуку паразуменняў са шматлікімі пасрэднікамі і перасячэннем межаў.

Няма прамой дастаўкі нафты з Ірана ў Беларусь. Прычым ніякім шляхам.

Самы танны шлях — нафтаправодам. Але дзе яны? Іранскія ідуць на поўдзень, да Персідскага заліва. Можна скарыстацца ўкраінскім трубаправодам Адэса—Броды, які пабудаваны да ўкраінска-польскай мяжы. Мяркуецца працягнуць яго да Гданьска. Пабудаваны ў 2001 годзе, ён, па меркаванні спецыялістаў, ужо патрабуе мадэрнізацыі. Аб ёй вядуцца размовы з Казахстанам. Яго яшчэ трэба злучыць з беларускім. Гэта патрабуе будаўніцтва перамычак, а значыць, грошай і часу. Кажуць, што і беларускі ўчастак нафтаправода "Дружба" мае патрэбу ў мадэрнізацыі.

Як тут не ўзгадаць, што яшчэ больш як дзесяць гадоў таму апазіцыя настойліва раіла брацца за падобны праект. Днямі аб гэтым успомніў і старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Міхаіл *Мясніковіч. "У 1992 годзе я быў на адной важнай нарадзе ў Кіеве,* — расказваў ён. — *На ёй разглядалася пытанне аб пастаўцы газа з Азербайджана і Ірана і другіх краін у Еўропу, мінаючы Расію. У нарадзе бралі ўдзел Беларусь, Украіна, Малдова, Грузія, Азербайджан. Старшынствавалі Злучаныя Штаты Амерыкі. Але беларусы адстойвалі расійскі вектар. Я вось зараз думаю: напэўна, мы тады даволі прымітыўна разглядалі перспектыву палітычных адносін".*

Што праўда, то праўда. Адстойвалі "расійскі вектар". І адстаялі на сваю галаву. А былі б пабудаваны сістэмы дастаўкі, і не было б цяперашняга галаўнога болю. Аднак з-за тагадумства колішніх правіцеляў прыходзіцца нялёгка зараз.

Дык як жа прывезці нафту з Ірана? Калі няма прамых трубаправодаў, можна чыгункай. Але, па-першае, чыгунка праходзіць па неспакойным каўказскім рэгіёне, да таго ж яна вельмі загружаная. А па-другое, чыгуначныя шляхі дарагія. Расійскія спецыялісты прыкінулі пяць шляхоў дастаўкі сваёй нафты ў Кітай. І аказалася, што па чыгункі — самы дарагі. Таннейшы шлях па моры. Але тут узнікаюць праблемы са шматразовымі перазагрузкамі — у танкеры, з танкераў на тую ж чыгунку. І час, і грошы немалыя.

Дастаўка нафты з Ірана па моры ідзе праз турэцкія пралівы Басфор і Дарданелы, моцна перагружаныя. Кошт правозу нафты праз іх каштуе каля 30 долараў за тону плюс транспартныя страты, выкліканыя затрымкамі пры праходзе праз пралівы. Еўрапейцы падлічылі, што правоз праз іх 35 мільёнаў тон нафты будзе каштаваць больш мільярда долараў. А пракачка гэтага аб'ёму нафты праз нафтаправод Александрупаліс—Бургас — у два разы танней.

Сістэма дастаўкі нафты праз балтыйскія порты таксама пакуль не гатова. Першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка дакладваў Аляксандру Лукашэнку аб перспектывах праекта пракачкі нафты па маршруце Вентспілс—Наваполацк. Яго кошт можа скласці 15—30 мільёнаў долараў. Тэрмін рэалізацыі — 2,5 года.

Так што чакаецца няпросты пошук маршруту дастаўкі.

Не хочаце па 280 долараў, бярыце па 400

Маўчаць і пра галоўнае — кошт іранскай нафты. Нядаўна там зацверджаны яе кошт на бягучы год — 55 долараў за барэль. У той жа самы час на Нью-Йоркскай біржы кошт "чорнага золата" быў у межах 52 долары за барэль. Так што Іран прадае нафту па сусветнай цане. І эксперты пераконваюць, што ён наўрад ці пойдзе на ўступкі па цане. Наша даследаванне таксама пераконвае ў гэтым. Асноўныя даходы Ірана, больш за 2/3, паступаюць ад гандлю нафтай. Нядаўна тут зацверджаны бюджэт на сёлетні год. Яго адметнасць у тым, што намнога выраслі расходы, аж на 20 працэнтаў. Паўстае пытанне: дзе ўзяць вялікія грошы? Надзея толькі на нафту і цану на яе. Эканамісты падлічылі, што, каб выканаць бюджэт па расходах, нельга паніжаць цану на нафту. У Тэгерана ўжо ёсць фінансавыя праблемы. З канца мінулага года яны не плацяць расіянам за будаўніцтва там АЭС. Выходзіць, спадзявацца на нізкую цану не праходзіцца.

Нафта — багацце Ірана і яго... ахілесава пята. Санкцыі па нафце могуць прывесці краіну да катастрофы. Тым больш што яе ў іранцаў усяго 8—9 працэнтаў сусветных запасаў. Значыць, калі спатрэбіцца, цывілізаваны свет можа пайсці і на такія санкцыі. Так што бравурныя заявы іранскага кіраўніцтва аб тым, што ім санкцыі нібыта да лямпачкі, беспадстаўныя.

А тут яшчэ адна праблема. Вядомы амерыканскі вучоны Роджэр Штэрн тлумачыць, што Іран невыпадкова развівае мірны атам, бо краіна не зможа ўжо з 2015 года экспартаваць нафту. Экспарт яе штогод змяншаецца на 10 працэнтаў. Прычына? Кепскі менеджмент і малыя інвестыцыі ў развіццё нафтаздабычы.

Выходзіць, Іран мае патрэбу ў вялікіх інвестыцыях. Ды Захад ужывае санкцыі. Вось і шукаюць іх, дзе толькі можна. У сувязі з гэтым больш зразумелыя словы іранскага міністра нафты Казема Вазіры Хамане, сказаныя ў Мінску: *"Іран сур'ёзна зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Беларуссю ў галіне энергетыкі".*

Абедзве краіны, пасварыўшыся з суседзямі і цывілізаваным светам, шпарка кінуліся ў "эканамічныя абдымкі", спадзеючыся вырашыць свае праблемы. Таму пах нафты, змешаны з таталітарнай ідэалогіяй, і дурманіць галовы чыноўнікаў.

Некаторыя спецыялісты схільныя лічыць, што ў Беларусі знайсці альтэрнатыву расійскай нафты вельмі праблематычна. У інтэрв'ю "Інтэрфаксу" кіраўнік "Захад-транснафтапрадукта" Мікалай Альхімовіч зазначыў: *"Калі раней Беларусь купляла ў Расіі нафту прыкладна па 230 долараў за тону, дык з улікам пошліны цяпер цана складае 283 долары за тону. А на сусветных біржах тона нафты каштуе прыкладна 400 долараў".* Пры гэтым ён дадаў, што яшчэ трэба мець затраты на транспарціроўку.

Выходзіць, сапраўды пакуль няма альтэрнатывы расійскай нафце. Дык навошта той агарод гарадзіць? Думаецца, аднак, што "гарадзіць" яго — шукаць нафту ў іншых месцах — трэба. Расіяне таксама збіраюцца сваю нафту прадаваць па рынкавай сусветнай цане. Так што пакуль ёсць час, варта шукаць альтэрнатыву, каб не быць прывязаным да аднаго манапаліста.

І думаць. Мабыць, і не варта цягнуць у Беларусь нафту з Венесуэлы і Ірана ў вялікай колькасці. Ёсць яшчэ адзін шлях, пра які ў нас амаль не гавораць. Размова пра якасную, эфектыўную перапрацоўку нафты.

Ці там шукаем сваё Эльдарада?

Амерыканцы з тоны нафты атрымліваюць 450 кілаграмаў бензіну, расіяне — 150 кілаграмаў. А колькі беларусы? Знайсці адказ аказалася вельмі складана. Перачытаў амаль увесь сайт Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, безліч артыкулаў. Чаго у іх толькі няма — і выкананне планаў, і вырашэнне сацыяльных праблем, і тузаніна з расіянамі... Няма галоўнага — даных па эфектыўнасці працы: якая глыбіня перапрацоўкі нафты, які выхад канечнага прадукту.

Нарэшце натыкаюся на радкі аб тым, што рэалізацыя чацвёртага этапа рэканструкцыі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода павялічыць выхад бензіну і складзе 28,5%. Адсюль можна зрабіць выснову, што чакаецца мець з тоны нафты недзе 285 кілаграмаў бензіну. Калі так, то да 450 яшчэ ой як далёка! Летась, падчас наведвання Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, мне ўдалося выцягнуць у спецыялістаў даныя па глыбіні перапрацоўкі тут нафты. Раней, гадоў шэсць таму, яна складала больш за 58 працэнтаў, а летась узнялася да 68 працэнтаў. У той жа час у Еўропе глыбіня перапрацоўкі нафты складае 80 працэнтаў, у ЗША — 95 працэнтаў. Дык ці там і тое Эльдарада мы шукаем? Мабыць, не варта за трыдзевяць зямель цягнуць вялізныя аб'ёмы "чорнага золата"? Лепей старацца па-сучаснаму наладзіць яе перапрацоўку, каб з меншай колькасці нафты атрымлівалася больш прадукцыі. Тады і расійскія нафтавікі ахвотней будуць з намі сябраваць. Іхнія ж нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы ў запушчаным стане, бо на іх мадэрнізацыю выдзяляецца сродкаў у 15—20 разоў меней, чым на здабычу нафты.

Што ж тычыцца Ірана і Венесуэлы, дык варта было б уладкавацца здабываць там нафту і прадаваць сваю долю. Чаму б не? За выручаныя грошы можна купіць яе бліжэй. Тут дарэчы ўзгадаць пра заяву літоўскага прэзідэнта Валдаса Адамкуса.

Што сказаў Адамкус?

У размове з журналістамі ў сярэдзіне лютага літоўскі прэзідэнт распавёў, што пытанне паставак нафты ў Беларусь ён абмяркоўваў з віцэ-прэзідэнтам ЗША Рычардам Чэйні. От бачыце, на якім узроўні ўсплывае гэта праблема. Валдас Адамкус пацвердзіў, што нафта да нас можа паступаць марскім шляхам да нафтатэрмінала ў Клайпедзе, адтуль па чыгунцы. Чым не варыянт? Можна ж купіць нафту, здабытую ў параўнальна блізкім Паўночным моры.

"Прапанаваная схема паставак нафты з'яўляецца дапамогай не рэжыму, а беларускаму народу", — зазначыў Валдас Адамкус.

Кажуць, сябры пазнаюцца ў бядзе. Ёсць над чым падумаць. У тым ліку і над гэтым: чаму Чэйні і Адамкус лепш ведаюць, дзе браць Беларусі нафту і як лепш яе дастаўляць?

Шукайце «адчыненую фортку»

У свеце ідзе інтэнсіўная праца па эканоміі энергарэсурсаў ды па замене традыцыйнага паліва з нафты новым, выраблены з вугалю і раслін. Спірта- і эфіраўтрымліваючае паліва ўжо выцясняе салярку і бензін. Аналітыкі сцвярджаюць, што ў хуткім часе попыт на нафту можа рэзка зменшыцца.

А яшчэ ўпор робіцца на выкарыстанне энергіі ветру, сонца, біямасы. У Беларусі шмат рэк. Чаму б не пабудаваць гідраэлектрастанцыі? Такая энергія экалагічна чыстая. Замест гэтага думаюць будаваць атамную станцыю. Маўляў, яна ўмацуе нашу незалежнасць ад Расіі. Але ж хто пабудуе тую АЭС? Вядома ж, Расія. Уран атрымаем таксама адтуль. Зноў залежнасць ад Расіі, толькі ўжо атамная. Акрамя нафты ды атамнай станцыі нічога не бачым.

Дык чаго мы, нібы вучні-тугадумы, ва ўпор не бачым новае, а імкнёмся думаць і жыць толькі па-старому? Чаму мы ўвесь час нагадваем муху, якая галавой б'ешца аб шкло побач з адчыненай форткай?

Іван МАКАЛОВІЧ.

Остановите тарифы!

Тарифы на платные услуги населению в январе 2007 года снова увеличились, сообщили БелаПАН в Министерстве статистики и анализа Республики Беларусь.

Больше всего подорожали услуги жилищно-коммунального хозяйства. В январе 2007 года их рост по сравнению с декабрем 2006 года составил 12%, по сравнению с январем 2006 года — 14,2%. В том числе электроснабжение подорожало по сравнению с предыдущим месяцем на 20%, в годовом исчислении — на 27,3%; газоснабжение — на 20% и 27,2% соответственно; водоснабжение — на 7,6% и 9,3%. Тарифы на отопление увеличились по сравнению с декабрем на 14,3%. Тарифы на услуги по техническому обслуживанию жилых помещений по сравнению с прошлым месяцем не изменились, а в годовом исчислении увеличились на 25%.

В январе оплата бытовых услуг повысилась по сравнению с январем 2006 года — на 11,8%.

Платные услуги в сфере образования подорожали по сравнению с декабрем 2006 года на 1,1%, январем 2006 года — на 10,1%; культуры — на 0,1% и 4% соответственно. В годовом исчислении услуги пассажирского транспорта увеличились на 16,3%, дошкольных учреждений — на 13,3%, туристические услуги — на 16,1%. По сравнению с декабрем прошлого года тарифы на эти услуги незначительно снизились: на 0,3%, 0,2% и 1,1% соответственно.

Большая проблема малых городов

Каждый пятый белорусский безработный — житель малых городов. Около 18% безработных — сельское население. Такие данные привел начальник Управления политики занятости и народонаселения Министерства труда и социальной защиты Николай Кохонов.

Особенно сложная ситуация с безработицей сложилась в 42 малых городах Беларуси, из которых наиболее проблемными являются 29 — в них сосредоточено 30% безработных всех малых городов. Самое же сложное положение — в девяти городах Беларуси: Ганцевичах, Иваново, Микашевичах, Поставах, Новолукомле, Октябрьском, Василевичах, Уречье, Краснополье. При этом, как отметил чиновник, "основной контингент безработных в этих городах — женщины (в Уречье женщины составляют 94% безработных, в Октябрьском — 81%)".

ПОУЧИТЕСЬ!

А цены снижаются

Несмотря на то, что с первого января 2007 года в Германии на три процента увеличен налог на добавочную стоимость, потребительские цены в стране продолжают снижаться. В январе 2007 года они были на 1,6 процента ниже, чем год назад. Об этом сообщает Федеральное статистическое ведомство. На общий уровень цен позитивное влияние оказывает снижение расходов на энергию и горючее.

Только энергосберегающие лампы

Австралийское правительство собирается запретить применение традиционных ламп накаливания, что должно сократить потребление электроэнергии и улучшить экологию страны.

Согласно австралийскому плану, ограничение на продажу обычных ламп накаливания будет вводиться постепенно. Замена ламп не только уменьшит суммы счетов за электроэнергию, но и сократит к 2012 году эмиссию парниковых газов примерно на 4 млн тонн.

Подорожает

В результате вступления в силу декрета президента №20 от 26 декабря 2006 года, который регулирует торговлю парфюмерно-косметическими товарами, цены на парфюмерию в Беларуси возрастут не менее чем на 50%. Такое мнение высказали в беседе с корреспондентом БелаПАН активисты республиканского общественного объединения (РОО) "Перспектива" после встречи с представителями комитета по предпринимательству Мингорисполкома.

Причем элитная парфюмерия может подорожать минимум на 50%, а недорогая — исчезнуть вообще, говорят представители "Перспективы".

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

«Нежная моя» — лучшая

На крупнейшей Международной выставке "Продэкспо" в Москве золотой медали и звания "Лучший продукт года" удостоилась серия конфет "Нежная моя" "Первой шоколадной компании".

В этом году выставка "Продэкспо" собрала 2260 компаний-участниц из 60 стран Европы, Азии и Америки. Крупнейшие экспозиции — у Германии, Италии, Испании, Франции, Польши и Венгрии.

На форумах столь высокого уровня "Первая шоколадная компания" присутствует постоянно. Только в этом столетии более 30 высших наград на международных конкурсах уже получали такие продукты брестчан, как шоколад "Идеал" в ассортименте, конфеты "Мирабелла", серии конфет "Фрутэль", "Милая моя".

tut.by

Ільнозаводы бядуюць без сыравіны

Дагэтуль не могуць выбрацца з бездані безграшоўя ад мінулагодняга недабору ўраджаю льну шматлікія льнаперапрацоўчыя заводы Віцебшчыны. Леташні неўраджай моцна падкасіў іх: замест мяркуемых 20 тысяч тон валакна ім дасталося толькі 8,1 тысячы тон. З-за гэтага прадпрыемствы мусяць працаваць, загружаючы свае магутнасці на 40 працэнтаў. Пры гэтым агульная запазыка льнаперапрацоўчай галіны вобласці па банкаўскіх крэдытах дасягнула 25 мільярдаў рублёў.

Самае сумнае ў гэтай сітуацыі тое, што заводам быццам бы і скардзіцца няма на каго: самі перапрацоўшчыкі не першы год займаюцца і вырошчваннем льну. А таму спадзявацца мусяць толькі на сябе: трэба зрабіць усё, каб сёлетні ўраджай сыравіннай культуры быў дастатковы для выхаду з вытворчага крызісу і пазбаўлення ад запазыкі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПОДСЧИТАЕМ

«Петя, ты каждый месяц переплачиваешь за квартиру ящик водки»

Такая постановка вопроса действует на самого равнодушного и одновременно высвечивает коммунальные поборы

Коммунальщики твердят, что население оплачивает только часть их расходов и они работают в убыток себе, просят дотации из бюджета. Так ли это?

Давайте поищем ответ на этот вопрос. Сколько реально стоит 1 гКал? Цена топлива известна. Мне, например, Гортоп сообщил цену 1 м куб. дров и 1 т торфобрикета. Тепловая способность единицы топлива есть в справочниках и в школьных учебниках физики. (Не догадались чиновники засекретить!) Получаем стоимость 1 гКал при сжигании топлива с минимальным КПД в 70%.

Конечно, это всего лишь краткая схема. Для дилетантов. Но она дает представление о стоимости. Фактически я пользовался методикой расчета, изложенной в "Инструкции о порядке заполнения отчетного топливно-энергетического баланса (форма №1 — ТЭБ)". Этот уже строгий расчет дает стоимость 1 гКал, полученной

— из дров — 5000 руб/гКал,

— из брикета — 10.500 руб/гКал.

Вывод: цена — 30.000 рублей за 1 гКал, которую установили, завышена минимум в 3 раза.

Прежде чем перейти к вопросу "что делать?", давайте остановимся на соотношении цен на топливо. 1 гКал, полученная из брикета, в 2 раза дороже 1 гКал, полученной из дров. Тепло, полученное из дизтоплива, еще дороже. Чем больше степень промышленной подготовки полуфабриката (топлива), тем выше цена конечного продукта (тепла). Нонсенс! Сапоги, пошитые кустарем-одиночкой, дешевле, чем сшитые в цеху при разделении труда. Выходит, прогресс — зло? Почему? Получили классическое доказательство невыгодности любого производства в государстве, которое бесконечно грабит и производителей, и потребителей. Это абсурд, путь в тупик.

Теперь о количестве этих гигакалорий, необходимых для отопления и подогрева воды. Тут коммунальщики вообще отвергают всю классическую физику. У них каждый год нужно все больше тепла для подогрева на 1^0 одного и того же объема воды. А значит, и платить за тепло нужно больше.

Минжилкомхоз, пользуясь своим положением монополиста, волевым способом устанавливает необоснованные заоблачные цены да еще требует дотаций из бюджета.

Хочется поддержать общественного деятеля Фролова по вопросу сбора подписей по поводу коммунальных оплат. Наше население аполитично. Но переворот в Чили начинался с кастрюльных бунтов. Польская "Солидарность" вначале выдвигала чисто экономические требования. В нашей стране политика должна начинаться на житейском уровне. Я рассказываю соседу о политических коллизиях, но он равнодушен. А когда говорю ему: "Петя, ты каждый месяц переплачиваешь за квартиру целый ящик водки", у него глаза горят.

Конгрессы, объединения, размежевания политических группировок оставляют население равнодушным. Нужно начинать поход к лучшей доли с обыденных, простых житейских проблем.

Н.ЛИПУНОВ.

г.Бобруйск.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

ЛЮБОПЫТНО

О любовных похождениях премьера

В Финляндии вышла в свет книга о любовных похождениях премьер-министра Матти Ванханена под заголовком "Невеста премьер-министра", сообщает РИА "Новости".

Как отмечают многие финские обозреватели, лучшее время для выхода книги трудно было бы придумать, так как через месяц в Финляндии состоятся парламентские выборы и жизнь всех главных участников предвыборной гонки, в которой Ванханен занимает одно из первых мест, оказалась в центре внимания журналистов и общественности.

Автор книги — предприниматель и мать-одиночка Сусан Куронен, которая рассказывает о своем романе с премьер-министром, длившемся девять месяцев.

Основой для книги послужил дневник Куронен с воспоминаниями о встречах и нежные SMS, которые отправлял своей подруге финский премьер. Правда, если верить Сусан Куронен, то о том, что отношения пришли к финалу, Ванханен объявил также с помощью текстового сообщения.

В ходе презентации книги Куронен рассказала, что на нее оказывалось давление, чтобы книга не была опубликована, не уточнив, правда, в чем именно выражалось давление.

Матти Ванханен стал в Финляндии уже чуть ли не постоянным героем желтой прессы. Весной 2005 года в СМИ муссировались подробности его развода с женой и возможные причины семейного разлада, а в начале 2006 года разгорелся новый скандал. В марте газета "Илта-Саномат" опубликовала информацию, согласно которой одинокий финский премьер посылает незнакомым женщинам по мобильному телефону текстовые сообщения с предложением провести вместе время. Ванханен пригрозил подать на газету в суд.

Роман с Сусан Куронен стал новым лакомым куском для желтой прессы. Поскольку избежать публичности в отношениях премьер-министру не удалось, журналистам была представлена официальная версия знакомства в мебельном магазине "Икеа". Правда, позднее выяснилось, что познакомились Ванханен и Куронен через интернет-чат. Посещаемость чата выросла после этого в десятки раз.

Неизвестно, как повлияет выход книги на шансы Матти Ванханена сохранить пост премьер-министра после выборов, но совсем не обязательно, что влияние будет отрицательным. Многие финские обыватели во всей этой истории встали на сторону премьера, считая, что Куронен решила просто подзаработать на своем неудавшемся романе.

КОРОТКО

США готовы к любым вариантам

Вице-президент США Дик Чейни, выступая в Сиднее на пресс-конференции, заявил, что Вашингтон предпочитает дипломатическим путем убедить Иран отказаться от своей ядерной программы. Однако, как он выразился, "все варианты по-прежнему на столе". США и другие ведущие мировые державы утверждают, что Иран пытается создать ядерное оружие. Тегеран отвергает эти обвинения.

Министр иностранных дел Ирана Манушер Моттаки заявил, что он не придает большого значения предостережению Чейни. В беседе с журналистами Моттаки сказал, что США находятся сейчас не в том положении, чтобы пойти на военную акцию.

Вначале на Луну, затем на Марс

Президент Буш предлагает увеличить бюджет американского космического агентства НАСА на 3%. В эту сумму входят 3 миллиарда долларов на разработку космического корабля "Орион", на который НАСА делает главную ставку, планируя возвращение американских астронавтов на Луну.

В 2020 году должны возобновиться пилотируемые полеты к Луне. Но конечная цель — Марс.

Высадка на Марс — самая смелая задача, какую когда-либо ставило перед собой американское космическое ведомство. Ученые из университета Висконсина подсчитали, что программа "Аполлон" обошлась американскому налогоплательщику — в пересчете на нынешние цены — более чем в 60 миллиардов долларов. Полет на Марс обойдется намного дороже. Но насколько именно дороже — никто сказать не может.

Лучший фильм года

Фильм "Отступники" получил премию Американской киноакадемии как лучший фильм года. Всего картина была представлена в пяти номинациях и получила премии в четырех, в том числе за лучший монтаж и за лучший сценарий.

В номинации "Лучший фильм года" на "Оскара" претендовали также "Вавилон" Алехандро Гонсалеса Иньяриту, "Письма с Иводзимы" Клинта Иствуда, "Маленькая мисс Счастье" Джонатана Дейтона и "Королева" Стивена Фрирса.

ФОТОРЕПОРТАЖ

Так принимали «Оскаров»

Американский киноактер Форест Уитакер с женой Кешией. Уитакер получил "Оскара" за роль в фильме "Последний король Шотландии".

Режиссер Мартин Скорсезе рассматривает свою награду в окружении коллег — Стивена Спилберга, Джорджа Лукаса и Франсиса Форда Копполы.

Так праздновал победу звездный квартет актеров — Форест Уитакер, Дженнифер Хадсон, Хелен Миррен и Алан Аркин.

Би-Би-Си.

(Працяг. Пачатак у №№33—34.)

Ён і яшчэ працяснуўся наперад, каб лепей бачыць, што там робіцца. Аднак бачна было ўсё ж няшмат, чулася гамана, мабыць кіраўнікі гэтага шэсьця спрачаліся з таўстым міліцэйскім палкоўнікам, што незразумела хрыпеў у трубу мегафону. За ім замерла сьцяна амапаўцаў — блішчастыя шчыты ля ног, шлемы-скафандры на галавах, грудзі ва ўсіх расьпіралі бронекамізэлькі, у кожнага чорная палка ў правай руцэ. Але што былі гэтыя шчанюкі перад аб'яднаную сілай тысячаў, акрыленых адзінаю мэтай свае праўды? Іх можна было сапхнуць за адну хвіліну. Нехта нават і крыкнуў з натоўпу штосьці накшталт "наперад". І тады раптам людзі збоч вуліцы неяк незразумела хіснуліся, воддаль страхавіта закрычала кабета. Ступак азірнуўся — з завулка ад пошты, клінам расьсякаючы натоўп, урэзаўся атрад амапаўцаў у касках і са шчытамі. Гэтыя адразу ўзяліся працаваць даўжэзнымі чорнымі палкамі — малаціць усіх без разбору, хто трапляў ім пад рукі.

Натоўп калыхнуўся ў адзін бок, у другі, некаторыя кінуліся назад — пад сьцяну будынку пачтамту, але і там невядома адкуль узяліся амапаўцы — ці не з дзьвярэй пачтамта. Неўзабаве іх стала, здалося, ня меней, чым дэманстрантаў, яны расьсякалі натоўп на часткі і білі, калашмацілі, валілі на асфальт людзей — мужчынаў і жанок, хапалі, камячылі сьцягі і плакаты, якімі некаторыя спрабавалі ад іх бараніцца. Над вуліцай узьвіўся бязладны, зьдзічэлы крык і лямант; жаночы плач перамяшаўся з роспачнай мужчынскай лаянкай, і невядома было, хто лаяўся. Падобна, і тыя, і гэтыя.

Пасьля хвіліны зьбянтэжанасьці Ступак зразумеў, што трэба адсюль "ірваць кіпці". Ды, мабыць, зразумеў тое спазьнела. Першы ўдар гумовай палкай па сьпіне змусіў яго хіснуцца, ён спатыкнуўся аб кагось, хто ужо ляжаў на асфальце, але ўтрымаўся, ня ўпаў і пасьпеў азірнуцца на таго, хто яго выцяў. З-за выгнутага плаксіглазавага казырка ў яго ўтаропіўся счырванелы ад поту твар маладога амапаўца.

У той момант новы ўдар па плячы змусіў яго аж прысесьці ад болю. Ратуючыся, ён галавой наперад кінуўся праз парадзелы натоўп — прэч ад гэтых забойцаў. Але, мусіць, ён прамарудзіў, упусьціў момант, і на яго накінуліся трое ці болей у касках. Каб уратавацца, ён з усяе сілы штурхануў бліжэйшага са шчытом, які з металічным бразгатам паляцеў долу. Ступак што было сілы ірвануў па вуліцы далей — праз паблытаны ў бойцы амапаўскі шэраг на суседнюю вуліцу.

Сьпярша ён бег, чуючы, як там, ззаду, лемантуе, вые і лаецца нядаўна яшчэ такое мілагучнае шэсьце, і недзе за скверам равуць рухавікі міліцэйскіх "Камазаў", што, мабыць, падвозяць падмацаваньне АМАПу. Ці адвозяць скопленых і пабітых. Побач абмінуў яго малады даўгалыгі хлопец у белай скрываўленай кашулі, што, азіраючыся, узрушана прамаўляў: "Шакалы!.. Шакалы!..". "Шакалы!", — сказаў сабе ў думках і Ступак, кіруючы следам па тратуары. За імі, аднак, чамусьці ня гналіся, і ён пайшоў ціхэй. Поруч беглі і яшчэ людзі, што вырваліся з тае пасткі, хтось з рэдкіх сустрэчных спалохана пытаўся, стоячы пад абдзертай сьцяной: "Што там? Што?". — "Ідзі, паглядзі!", — са злосьцю кінуў Ступак пенсіянеру з радамі каляровых планак на борце пацертага пінжака. Надта балела плячо, ён ледзьве варушыў рукой, думалася, ці не паламалі яны яму косьці? Трохі, аднак, спакайнеючы, завулкамі і пусткамі нарэшце дабрыў да свайго падворку.

На шчасьце, ля гаражоў не было нікога, мусіць, гаражнікі з раніцы разьехаліся па сваіх дачах-гародах. Ступак аднаруч ледзьве адамкнуў нутраны замок і, зашчапіўшыся, аблёг на сваю раскладуху. Самы час было расслаблена ўздыхнуць і застагнаць — так балела плячо. Але ён стрымаўся пры думцы, што яго могуць пачуць і толькі ў думках вылаяўся. Усё ж, мабыць, яго там згледзелі, можа, хто са знаёмых, і хоць ён уцёк, знайсьці было няцяжка. Ён ведаў, што ў іх усё на ўліку: усе адрасы і прыкметы, сьведкі, стукачы, сексоты. Хіба ад іх схаваешся?

Ціха варочаючыся ад болю на рыпучай раскладусе пры зачыненых дзьвярах, ён услухоўваўся ў кожны гук-шолах знадворку. Чуў, як прыехаў на старой "Волзе" і адчыняў свой гараж Сазон. Лепей Ступак хацеў бы пачуць траскотны гук рухавіка "Запарожца" Плешкі, ды таго не было, можа, заначуе на агародзе. Што рабіць далей — было невядома, мабыць, у гаражы доўга ня ўседзіш, паныла думаў Ступак. Зьехаць на вёску ці што? Але каб зьехаць, патрэбны грошы, хаця б на білет. Зноў жа, калі будуць шукаць, дык знойдуць і ў вёсцы — гэтыя ўсё могуць. Наконт зыску яны майстры, якіх ня ведае сьвет. Ступак прыгадаў, як некалі ў войску на дзьвярах іхняй прыбіральні нехта цьвіком надрапаў "Брэжнеў — мудак". Зьявіліся сьледчыя па асабліва важных справах, паўгода вялі сьледства, ператрэсьлі казарму, перацягалі ўсіх у хітры дамок контрразьведкі, а знайшлі. Прыперлі, дык сам прызнаўся — першагодак з Мардовіі пакрыўдзіўся на старшыну і надрапаў тыя два словы — на сваю галаву.

Усё ж неяк Ступак перабыў тую ноч, спаў трывожным сном падбітага птаха — то засынаў, то прачынаўся, спрабуючы як зручней уладкаваць балючую руку. Душу апякала крыўда і злосьць: што ж гэта робіцца? За што? Што ён парушыў, каму ён прычыніў шкоду? Завошта яго хацелі скалечыць? Выцялі па тым самым плячы, дзе яшчэ віднеўся сьлед-шнар ад душманскае кулі. Але ж гэтыя — не душманы, гэта ж свае. Хто ж іх так нацкаваў на мірны народ, чаму яны сталі карнікамі?

Але хто нацкаваў, было вядома. У гэтай краіне ўсё добрае і благое рабілася па камандзе аднаго чалавека. Усё залежала ад яго. Прачнуўшыся неяк пад ранак, згаладнелы і спакутваны ад болю ў плячы, Ступак раптам сьцяміў, што яго трэба забіць.

Як зрабіць тое, ён яшчэ ня ведаў, нават ня мог сабе ўявіць. Мусіць, для таго найперш трэба была зброя ці якая ўзрыўчатка. Але дзе яе ўзяць? Ад зброі залежаў і спосаб тэракту, значыць, найперш трэба зброя. Хаця б пісталет ці гранату. Ён не адважыўся, думаў — навошта? Ён не зьбіраўся стаць кілерам, ён вяртаўся на сваю родную "паштовую скрынку", дзе рабіў нейкія штуковіны для ракетаў. Ці для космасу. Але "паштовая скрынка" накрылася адным месцам, і ён стаў беспрацоўным афганцам. Во лёс сабачы...

"Ну і хай! — лежачы на сваёй раскладусе, няпэўна думаў Ступак. — Кілер, па крайняй меры, гучыць. А то — тля! Я табе ня тля, ты яшчэ пазнаеш, хто я. Ня тое, што гэтыя дэмакраты. Наладзілі фэст, выйшлі, бы да касьцёлу. Не хапала музыкі. А ён на іх — гэтых двухногіх шакалаў у брані. Далі, аж пыл закурэў. Адлупілі, разагналі, пахапалі... Цяпер будуць хадзіць да пракурора, апраўдвацца. Быццам пракурор не заадно з імі. Пракурор, можа, сам лупіў са шчытом, у камізэльцы. А што? Пад каўпаком не відно, не пазнаеш, хто цябе нявечыць. Усе яны — адно кодла. Не, так не даб'ешся нічога. Трэба яго стрэльнуць. А там будзь, што будзе. Чым так тухнуць у сьмярдзючым гаражы... Здохнеш і ня хутка здагадаюцца, што памёр. Як тая бабуся з першага пад'езду, што тры тыдні праляжала ў зачыненай кватэры. Пакуль суседзі ня ўнюхалі"...

Так, яму вельмі патрэбная зброя.

Але найперш, мусіць, трэба было прыдбаць грошы. Бяз грошай ні чарта ты ня зробіш, самадзейны кілер-адзіночка, нявесела думаў Ступак у ранішнім гаражным паўзмроку. Рашэньне, аднак, было прынятае, і ён не любіў мяняць сваіх нават і самых рызыковых рашэньняў. Такі ўжо быў характар. З тае ранішняй хвіліны ў яго паявілася мэта, што стала яго неадчэпным клопатам.

Ён яшчэ ляжаў у дрымоце, як знадворку пачуўся нягучны металічны бразгат паблізу, і Ступак, счакаўшы, прыадчыніў дзьверы. Крышку ўбаку стаяла "сямёрка" дацэнта Мінкевіча, якую той меўся загнаць у гараж. З гэтым інтэлігентам у Ступака не было ніякае дружбы, бо той трымаўся на адлегласьці ад астатніх, асабліва ні з кім не таварышаваў, рэдка калі ішоў на размовы. І заўсёды кудысь сьпяшаўся. "Сямёрка" яго заўжды была чысьценькая, бы сьвежа памытая, хаця ўжо і ня новая, ды і сам Мінкевіч заўжды выглядаў па сучаснай модзе — з каротка падстрыжанай бародкай, у акулярах з тонкай аправай, ён зірнуў на Ступака і павітаўся. Ступак, каб пачаць размову, папрасіў закурыць, і той мусіў затрымацца ля расчыненых дзьвярэй гаража.

— Вы не маглі б мне пазычыць?

— Колькі? — спытаў Мінкевіч, з гатоўнасьцю дастаючы кашалёк. — На паўлітру?

— Трэба больш. Баксаў пяцьсот, — адважна вымавіў Ступак, аж зьдзівіўшыся сваёй адвазе.

— Ого! — шчыра зьдзівіўся дацэнт. — У мяне зарплата трыццаць баксаў у месяц.

— Дрэнна жывяцё, — паныла зазначыў Ступак. — А можа, ведаеце, каму гараж можна б загнаць?

Мінкевіч паціснуў плячыма.

— Дайце аб'яву ў газету. Цяпер жа там вунь колькі аб'яваў. Ці папытайце ў Валынца. Ён жа займаецца аўтабізнэсам...

Валынца Ступак збольшага ведаў, той жыў у суседнім доме, нядаўна скончыў еўрарамонт кватэры, пад якую адкупіў ледзьве ня ўвесь паверх замызганай хрушчоўкі. Цяпер любавацца на яго люстраныя, з мядовым адлівам вокны ў дзюралевых рамах зьбіраўся ўвесь падворак. Унізе ля пад'езду часьцяком стаялі "Вольвы", "БМВ" ды "Мерседэсы" нярэдка з замежнымі нумарамі. Гэта быў тыповы "новы беларус", і Мінкевіч меў рацыю. Гараж варта было прапанаваць Валынцу.

Але злавіць гэтага бізнэсмэна было няпроста. Ягонага "БМВ" ля пад'езду не было відаць, у кватэру ж Ступак не пайшоў, казалі, там заўсёды ахова. Тады ён прысеў на лаўку насупроць дзюралевых вакон багацея, трохі счакаў. Рука ўсё балела, хоць і ня так як учора. Рухаць ёй Ступак усё асьцерагаўся і, сагнуўшы, далікатна трымаў пад крысом накінутага на плечы пінжака. Як на падворку зачасьцілі ранішнія прахожыя, неахвотна падняўся і падыбаў да сваіх гаражоў. Тут, як заўжды ўраньні, ужо паявіўся Плешка, узяўся ладзіць капрызлівы "Запарожац".

— Што гэта ў цябе, — кіўнуў ён на руку, павітаўшыся.

— Ды так. Упаў.

— Выпіўшы?

На тое Ступак не адказаў, ён не хацеў нікому расказваць пра учарашняе, асьцерагаўся, як бы сёньня ня здарыўся працяг таго ўчора. Раз за разам ён пазіраў на падворак, каб адразу заўважыць, калі там зьявіцца міліцэйскі "Уаз". Але міліцыі пакуль не было, а Плешка, сагнуўшыся над задам "Запарожца" калупаўся ў рухавіку.

— Што — помпа? — паспачуваў Ступак.

— Помпа, хай яна згарыць. Каторы раз ужо, — сказаў Плешка і, азірнуўшыся, цішай заўважыў: — Чуў, што ўчора на прасьпекце было?

— А што? — прастадушна папытаўся Ступак.

— Кажуць, лядовае пабоішча. Менчукоў з псамі-рыцарамі.

— Вось як?

— Што ж думаеш: паўтары тысячы АМАПу. Ды міліцыя. Ды ўнутраныя войскі. Сіла!

— Сіла! — пагадзіўся Ступак.

Гэты Плешка заўжды пачынаў так — быццам быў на баку ўлады, мог нават мацюкнуць дэмакратаў, але свае сапраўдныя адносіны запасіў на канец. Прыхінуўшыся да крыла аўтамабіля, азірнуўся і нягучна паведаміў:

— Кажуць, сам лупіў. Палкай. Пад каскай амапаўца. Во драпежнік!

— Драпежнік, — міжволі пагадзіўся Ступак. Уласных адносінаў да таго ён раскрываць не хацеў.

Усё ж паведамленьне Плешкі ўзрушыла Ступака, сьпярша ён нават не паверыў у тое. Але затым, разважыўшы, падумаў: а можа, і праўда. Ад гэтага можна было чакаць усяго, і вельмі нават магчыма, што найбольшаю асалодай для яго было самому паўдзельнічаць у эфектыўнай паліцэйскай акцыі. Адчуць азарт расправы — як драпежнік над сваёй ахвярай. Ступаку нават здалося, што той, хто лупіў яго па параненым плячы, мог быць менавіта сам. Краем вока ён нават згледзеў падобнага — з азьвярэлымі вачыма, вусатага. Хаця вусатых там было шмат.

Пакінуўшы Плешку ля яганага "Запарожца", Ступак пайшоў па падворку да суседняга дома і яшчэ здалёк убачыў там чорную "БМВ" ля другога пад'езду. Ён прысьпешыў крок, сапраўды, то была машына Валынца, а ля яе і сам гаспадар, які толькі што выйшаў з дзьвярэй. То быў маладжавы яшчэ чалавек у дарагім двухбортным гарнітуры, пры даўжэзным гальштуку; ён паклаў на задняе сядзеньне кейс і расчыніў пярэднюю дзьверцу. За рулём чакаў малады шафёр з бычынай шыяй і выстрыжанай патыліцай.

(Працяг на 6-й стар.)

Даешь продление полномочий!

В Азербайджане запущен "пробный шар"

В Азербайджане хотят увеличить срок правления президента с 5 до 7 лет. В стране началась кампания по внесению изменений в Конституцию, которые позволят увеличить срок полномочий президента Ильхама Алиева.

Как объясняют азербайджанские власти, об этом мечтает большинство граждан Азербайджана. Так, заведующий отделом администрации президента по работе с документами и обращениями граждан Сулейман Исмаилов утверждает, что такие пожелания содержатся в многочисленных письмах, поступающих в адрес президента Ильхама Алиева. Впрочем, пока не ясно, являются ли эти обращения проявлением искренней симпатии населения страны к личности президента или кампания по продлению срока полномочий главы государства сознательно организована представителями определенных кругов, преследующих свои корпоративные цели, пишет "Независимая газета". Но авторы инициативы добились главного: тема продления президентских полномочий Ильхама Алиева уже стала предметом дискуссий в азербайджанских средствах массовой информации.

Однако не все в Азербайджане согласны с тем, что под Ильхама Алиева необходимо менять Конституцию. Как считает азербайджанская оппозиция (и об этом пишут оппозиционные газеты), озвучиваемые проправительственными политиками и депутатами инициативы о продлении сроков полномочий президента — пробный шар, запущенный властью с тем, чтобы выяснить реакцию населения.

В то же время многие аналитики придерживаются мнения, что инициаторы проведения референдума скорее всего преследуют конъюнктурные цели. В нынешних условиях у Ильхама Алиева нет сильных оппонентов, которые могли бы составить ему реальную конкуренцию на предстоящих президентских выборах, утверждают аналитики.

ОТОВСЮДУ

Не куришь — получай 100 евро

Этот вопрос обсуждается постоянно: какой вред наносят курильщики, которые в рабочее время удовлетворяют свою потребность в никотине, работодателю?

Австрийская компания Dolphin Technologies ответила для себя. *"Каждый курильщик, работающий у нас, "прокуривает" примерно 20 часов рабочего времени в месяц"*, — говорит Харальд Трауч, глава фирмы. В этой связи в будущем тем, кто не курит, компания будет доплачивать по 100 евро.

Трауч исходит из того, что каждый десятый сотрудник откажется от курения, предпочтя получать дополнительные 100 евро. Но тот, кто не выдержит и снова вернется к вредной привычке, должен будет перечислить премию за предыдущие 6 месяцев на счет гуманитарной организации.

Не доел — плати штраф

Несколько гонконгских ресторанов объявили о введении штрафов для посетителей, которые оставляют на тарелках большое количество недоеденной пищи.

Прежде всего данная мера касается "недобросовестных" едоков в заведениях самообслуживания, предлагающих свободный выбор блюд по принципу "шведского стола".

Отныне за небрежное отношение к еде к счету могут быть добавлены дополнительные 2,5 доллара США за каждые 100 граммов набранных, но не съеденных продуктов. Соответствующее предупреждение уже внесено в меню на китайском и английском языках, сообщает ИТАР-ТАСС.

В последнее время мегаполис переживает кризис, связанный с проблемой утилизации мусора. Только рестораны ежедневно выбрасывают на помойки до 700 тонн

МНЕНИЯ

Где демократия, там и развитие

На конференции, прошедшей в американской столице, связь между демократией и экономическим развитием обсуждали правительственные чиновники, дипломаты и активисты демократического движения. Тон задала Дженнифер Уиндзор, эксперт правозащитной организации "Дом свободы", заявившая: *"Желание иметь представительное и подотчетное гражданам правительство, соблюдающее верховенство закона и права человека, является универсальным. Это не просто культурная традиция Запада"*.

Уиндзор привела в пример Мали, одну из беднейших стран мира, которой удается сохранять демократию со времени президентских выборов 1992 года. Характерно, что темпы экономического роста Мали сегодня одни из самых высоких в Африке.

Пола Добрянски, заведующая Бюро по делам демократии, прав человека и труда государственного департамента, указывает, что прозрачная система правления способствует росту богатства населения: *"Справедливые действия властей являются непременным условием устойчивого развития. Разумная экономическая политика и демократические институты, учитывающие интересы людей, в сочетании с разветвленной инфраструктурой способствуют экономическому росту и снижению бедности"*.

Участники симпозиума упоминали о том, что президент Буш сделал продвижение демократии одной из важнейших целей американской внешней политики. Глава администрации неоднократно подчеркивал, что демократические страны способствуют глобальной безопасности уже тем, что не воюют друг с другом.

Вашингтонская встреча была прелюдией к конференции стран — членов "Сообщества демократий", которая должна пройти в ноябре в столице Мали — Бамако. Характерно, что Мали стала первой африканской страной, которой доверено занять пост председательствующей международного форума демократических государств.

КУЛЬТУРА

Цветы среди цветов

20 лет назад в Советском Союзе был впервые выпущен эротический фотоальбом "Цветы среди цветов". Автор — известный литовский фотохудожник Римантас Дихавичюс, отмечающий сейчас 70-летие, нарушив все советские табу, первым в СССР опубликовал фотографии обнаженных натурщиц на фоне природы. Это издание до сих пор считается образцом фотоискусства высочайшего класса.

Римантас Дихавичюс, имеющий, наверное, все возможные для фотохудожника титулы, награды, премии, заснявший на пленку массу натурщиц, утверждает, что красота все равно всегда ускользает. Дихавичюс опасается за судьбу красоты — не она, говорит он, спасет мир, а мы сегодня должны спасать красоту.

Признанный фотомастер не приемлет сегодняшней, как он выразился, эксплуатации женского образа в искусстве. А 20 лет назад он не задумывался о перспективах — просто делал поэтичные, высококлассные фото, удивлявшие иностранных экспертов.

На Международной книжной ярмарке в Москве в 1987 году альбом Дихавичюса "Цветы среди цветов" произвел эффект разорвавшейся бомбы. Вот как он сам вспоминает об этом: *"Была тотальная цензура. Эта тема была запрещена, и ни одна западная книга такая не попала [на ярмарку], ни одна. И вдруг — на советском стенде, на литовском... На обложке — портрет такой, профиль безобидный. Было много заказов, китайцы захотели купить "хотя бы" миллион экземпляров для узкого круга специалистов"*.

Маленьким мальчиком вместе с родителями Римантас Дихавичюс в сталинское время вместе с тысячами литовцев был выслан в Сибирь. Потерявший мать, оказавшийся в спецзаведении для детей "врагов народа", Римантас не ожесточился, напротив, во всем и во всех искал и ищет красоту.

Последний альбом Дихавичюса "Видения", с восторгом принятый недавно на Франкфуртской книжной ярмарке, стал последней его работой в этом жанре. *"Хочу из этой сферы выйти. Сейчас рисую, соскучился по краскам, по кистям"*, — прокомментировал свое решение Римантас Дихавичюс.

Ирина ПЕТЕРС.

Вильнюс, Радио Свобода.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

— Можна вас на хвілінку, — гукнуў Ступак.

Валынец з незадаволеным выразам твару прытрымаў дзьверцу, Ступак падышоў бліжай і стрымана павітаўся.

— Прадаю гараж. Ну той, металічны. Купіце?

Напружаньне на холеным твары Валынца разам зьмякчэла, здаецца, той зразумеў і дзелавіта кінуў:

— Колькі?

— Ну гэта... Тысячу.

— Даю пяцьсот. З вывазам.

Пяцьсот, канешне, ня тысяча, але тут ня гандаль, тут продаж, падумаў Ступак, адчуваючы, што ягоны пакупнік дужа сьпяшаецца і вось-вось сядзе ў машыну. Другі раз наўрад ці яго засьпееш.

— Ладна, што ж...

Валынец з унутранай кішэні пінжака дастаў кашалёк і спрытна вылузнуў з яго тры стодаляравыя купюры.

— У якасьці задатку.

— Толькі авызвалю ў канцы месяца,— вінавата зазначыў Ступак.

— Тады атрымаеш астатнія. Усяго добрага.

Валынец схаваўся ў сваю чорную "БМВ", якая імкліва рванула з месца, а Ступак пастаяў яшчэ, ня ведаючы, радавацца ці ня надта. У руцэ ён трымаў трыста баксаў, тое было для яго багацьце. Але ж ён траціў апошні прытулак. Дзе прыткнуцца, калі ягоны куратнік пяройдзе гэтаму бізнэсоўцу?

А зрэшты, можа, тады ў прытулку і ня будзе патрэбы. Пра прытулак паклапоцяцца іншыя.

Тым жа ранкам ён разьмяняў у вулічным абменным пункце першыя сто далараў, накупіў у гастраноме харчу: два белых батоны, кавалак каўбасы і нават гронку жоўтых бананаў, якія прадаваліся на кожным рагу. Сьпярша добра пад'еў у гаражы на адзіноце, — Плешка ўжо некуды зьехаў, і ля гаражоў не было нікога. Пасьля сухога сьняданку зьявілася смага, але ён падумаў, што вып'е піва пасьля, як будзе ісьці на базар. Напружана думаючы пра зброю, ён усё ж вырашыў наведаць базар, дзе ня быў з самай вясны. Не было патрэбы ды й грошай. Цяпер жа зьявілася тое і гэта, і ён ня стаў губляць час.

Ашчаджаючы балючую руку, можа, з гадзіну ён швэндаўся між тлумных гандлёвых радоў, заваленых розным тавараm — харчам, гародніной, а таксама адзеньнем, рознай драбязой і начыньнем. Усё,што прадавалася, было раскладзена на прылаўках, століках, а таксама ля ног на асфальце, на газецінах ці проста выглядвала з расхінутых гаспадарчых сумак. Тавару было безьліч, здавалася, тут можна знайсьці ўсё. Але тавары яго цікавілі мала, ягоны інтарэс палягаў у іншым,і ён разумеў, што тое іншае на прылаўках ня згледзіш. Ён болей прыглядваўся да твараў — прадаўцоў і пакупнікоў, што ў цеснаце і штурханіне мітусіліся побач, выбіраў сярод іх пэўны тып — маладога, засяроджанага ў сабе чалавека, можа "афганца" або "чачэнца".

У гэтых якраз і можна было нешта здабыць. Зброю ці наркоту. Неяк яшчэ зімой ён прыходзіў сюды з жонкай па бульбу і ў аднаго чарнявага, з выгляду каўказца, прыцаніўся да яго жоўтых гранатаў. Калі той назваў цану, пажартаваў: "Ого, бы лімонкі". "То фрукты, а не лімонкі — крыўдліва паправіў гаспадар. — Лімонкі таньней будуць". — "А што, ёсьць і лімонкі?" — жартам пацікавіўся Ступак. "Знойдзем, калі трэба", — хітравата падміргнуў каўказец. Тады Ступаку лімонкі не былі патрэбныя, але во цяпер...

Аднак жа, чаго трэба, менавіта таго і не бывае ў гандлі. Нават і на базары.

Дарма і доўга ён швэндаўся ў гаманкім базарным натоўпе, так і ня ўбачыўшы нічога здатнага. Пытацца ж у каго не наважыўся, адчуваў, нямала тут шылася і таптуноў, прааранутых міліцыянтаў, кадэбэшнікаў, людзей са службы бясьпекі, якімі цяпер кішэлі вуліцы, вакзалы ды і базары таксама. Мабыць, тыя парадаваліся б, калі б спазналі, што побач шляецца кілер, шукае зброю. Хаця і без таго можна было проста і здорава ўліпнуць, калі б яго апазналі як удзельніка нядаўняй стычкі. Але во пакуль не пазналі, мабыць, там, на прасьпекце, не было знаёмых. Ля піўнога ларка ён нядоўга пастаяў у чарзе, выпіў цеплаватага піва, ледзьве ўтрымаўшы цяжкі куфаль у хваравітай руцэ, якая ўсё балела, асабліва ў плячы. Выпівох тут было нямала, але ўсе звычайныя півасёрбы, якія прагнулі адно — захмялець. Такіх жа, у каго можна было нешта здабыць, здаецца, не траплялася. І ён думаў, што, мусіць, ня так гэта проста прыдбаць зброю. Пісталет ці лепей славуты АК. Увесь сьвет завалены гэтымі Калашнікавымі, з ім ваюють цэлыя арміі, робяцца ўрадавыя перавароты, скідваюць і ўсаджваюць дыктатараў. А тут во, на ягонай радзіме, калі спатрэбілася, нават за баксы ня знойдзеш. Да чаго адсталая краіна, зласьліва думаў самадзейны кілер.

Краіна, можа, і была адсталая, але не былі адсталыя яе сьпецслужбы, і Ступак ведаў гэта. Ва ўсякім разе на рынку ён так і не наважыўся нават запытаць у каго-небудзь пра сваю патрэбу і надвячоркам прыбыў дадому. Дзьверы аж трох гаражоў былі расчыненыя, але машынаў перад імі не было відаць, значыць, аўтамабілісты нікуды не сьпяшаліся. Два з іх — Сазон Іванавіч і малады хлопец Аляксей — стаялі каля Плешкавага гаража. Ступак насьцярожана падышоў да іх, здаецца, тым перапыніўшы размову, і ён падумаў: ужо ці не пра яго ішла гаворка? Але, мабыць, не пра яго.

— Ну, Мінкевіч у бэнээфе, мужыкі казалі, — гучаў з гаража Плешкаў голас. Іншыя два маўчалі. Памаўчаў і Ступак.

— То-то, гляжу, по-белорусски разговаривает, — не зразумець, з захапленьнем ці асуджаючы, сказаў сівагаловы Сазон Іванавіч. — Нацдем!

— Размаўляе, як хоча, — азваўся Плешка.

— Э нет, не как хочет. Это у них установка такая, в бэнээфе, чтобы другие не поняли.

— Ты ж во панімаеш, — выглянуў з-за "Запарожца" Плешка.

— Не понимаю и понимать не хочу! — выказаўся Сазон.— Я русский человек и русским умру.

— Ну, а ён, можа, беларусам хоча памерці, — упарта пярэчыў Плешка.

Той Мінкевіч ня быў тут нікому сябрам, быў проста суседам ня болей, і Ступак ставіўся да яго спакойна. Але і Сазон ня выклікаў у яго вялікай сімпатыі, бо амаль заўжды быў злы і заціты. Хаця па цяперашнім часе тое было не навіна, шмат хто злаваўся і раздражняўся, але ўсё ж неяк стрымліваўся. Сазон жа адкрыта і голасна наракаў на жыцьцё, развал СССР, апошнімі словамі пляжыў "агента ЦРУ" Гарбачова і часьцяком бегаў у адноўлены райкам партыі, дзе ва ўсю ішла палітычная мітусьня камуністаў. Галоўнай прапагандовай сілай там былі ветэраны вайны, пенсіянеры ды адстаўныя чэкісты.

— Придумали еще нацию — белорусы! — крыху цішэй бурчэў сам сабе Сазон. — Чтоб русским кислород перекрыть.

— Але ж Мінкевіч дэмакрат, ён не супроць іншых, — ціха азваўся Аляксей, які да таго зважліва маўчаў побач.

— Демократы! Дерьмократы проклятые, — сказаў і смачна вылаяўся Сазон. — Все за доллары работают. Под американский заказ!

— Ня ўсе, — стаяў на сваім ціхманы Аляксей.

Ступак павярнуўся і пайшоў на падворак. Ён знарок не прыняў удзел у гэтай размове. Раней, можа б, што і сказаў, але не цяпер. Цяпер у яго былі справы болей важныя, чым драць горла ў спрэчцы з гэтым замшэлым бальшавіком, і ён не хацеў раскрывацца да часу. А можа, наадварот, трэба было маскавацца, сказаць што-небудзь у падтрымку Сазона. Але тое крывадушша было Ступаку агіднае, зноў жа ён не хацеў крыўдзіць і Аляксея, які ўвогуле яму падабаўся сваёй не характэрнай для цяперашняй моладзі сьціпласьцю. Сьціплы надзвычай быў і ягоны дзед, пасьля сьмерці якога перайшоў да ўнука гэты праіржавелы гараж. То быў слаўны стары, былы партызан-падрыўнік, меў шмат узнагародаў, якіх ніколі, аднак, ня бачылі на ягоных грудзях.

Адноўчы ў дзень перамогі запыталіся, чаму ён ня носіць ардэноў, на што стары адказаў: "На падушках панясуць перад труной". Сталася ж трохі інакш. Пакуль дзед хварэў, тыя яго ўзнагароды пасьпеў прадаць скупшчыку старэйшы унук-нарканман. Так і пахавалі партызана без аніводнай узнагароды.

Ступак ведаў, што ў такіх далікатных выпадках лепей маўчаць, хоць бы дзеля перастрахоўкі. У шматмільённых шэрагах сексотаў нямала і гаваркіх, і маўклівых, нахабных і сьціплых, дурнаватых і надта ж разумных, — самы шырокі выбар. Навербавалі за семдзесят гадоў. У іхнім палку перад адпраўкай у Афган ці ня ўсіх па чарзе перацягалі ў хітры дамок, што мясьціўся паміж казармай і прыбральняй — крышку, праўда, у баку, дзеля камфорту, каб ня дужа сьмярдзела. Хаця там стаяў смурод іншага кшталту. На каго было спадзяваща?

Удзень у гаражы было дужа сьпякотна, затое ўначы і ўранку самы раз. Лежачы ў зацішны час на скрыпучай раскладусе, Ступак часам шкадаваў, што зрабіў гэтую авантуру — прадаў гараж, які стаў ягоным адзіным прытулкам. Але штось перайначыць, мабыць, было ўжо позна. Першую сотню баксаў ён хутка патраціў, збольшага на ежу, і ўвесь час на адзіноце думаў пра сваю патрэбу: дзе раздабыць зброю?

На гарадской ускраіне за чыгункай некалі быў немалы гарнізон — вайсковая вучэльня, казармы і палігон; там некалі навабранец Ступак пачынаў вайсковую службу. Паблізу каля прахадной і на шашы заўжды таўкліся вайскоўцы, афіцэры ды прапаршчыкі, сярод якіх калісьці было нямала знаёмых. Асабліва сярод прапаршчыкаў. Але гэта калісь. Цяпер жа, пасьля скарачэньня арміі, развалу СССР ды ці мала чаго яшчэ наўрад ці хто знаёмы застаўся. І ўсё ж, не надумаўшы нічога больш здатнага, Ступак вырашыў наведацца на тую гарадскую ўскраіну. Ня дужа пагодным ранкам, пасьля начнога дожджыку, калі яшчэ не абсох асфальт, ён сеў у тралейбус, даехаў да кальцавой дарогі. Пасьля перасеў у аўтобус, які і давёз яго да знаёмага прыпынку. Дзіўна, але і праз дзесяць гадоў тут мала што зьмянілася — гэтак жа на кіламетр цягнулася ўздоўж шашы бетонная сьцяна, з-за якой нясьмела пазіралі на сьвет верхнія паверхі казармаў, чырванелі пяціканцовыя зоркі на шырокіх варотах прахадной, ля якой стаяў вартавы з аўтаматам Калашнікава на грудзях. (Вось бы яму такі аўтамат, хаця б з адным магазінам). Часам да прахадной і адтуль таропка сноўдалі афіцэры, салдатаў не было відаць. Як не было відаць ніводнага прапаршчыка — вывеліся яны ў беларускім войску ці што? Пытацца пра што-небудзь у афіцэраў ён не наважыўся, а ў прапара, мабыць, ужо папытаўся б. З гэтымі, мабыць, можна было б паладзіць. А так з гадзіну патупаў уздоўж агароджы, каб згледзець якую дзірку ці якога самавольшчыка каля яе, ды марна. Затым пастаяў на прыпынку, пакуль не падышоў аўтобус, абышоў рад шапікаў з рознай драбязой. Нідзе нічога патрэбнага яму ня трапілася, і ён вярнуўся ў горад.

Зброі ў яго не было і пакуль невядома было, дзе яе ўзяць, а ў галаве ўжо мроіўся той самы рашучы і важны момант, да якога ён рыхтаваўся. Ведаў, аднак, тое будзе ня проста, нават складана і дужа небясьпечна. Але калі зрабіць усё, добра абдумаўшы, рашуча і хутка, дык вельмі нават магчыма. Галоўнае — падлавіць момант, — на дарозе, на вуліцы ці лепш, калі выйдзе з машыны. Выходзіць жа ён каля свайго палацу ці дзе на прадпрыемствах, на будоўлі, куды ён сноўдае час ад часу. Або яшчэ — на спартовых комплексах, дзе ён звыклы і часты госьць і ўдзельнік, бо дужа паважае спорт і клапоціцца пра сваё здароўе. Каб там падлавіць...

Рука стала балець меней, праўда, яшчэ аддавала ў плячы асабліва пры рэзкім руху локцем угору. Кепска, што ішоў час, і з ім раставалі яго грошы, набытку ж ад іх не было ніякага, усё ішло на харч. Ноччу яму часьцяком сьнілася нешта з яго дзённых мрояў, толькі той яго супрацоўнік з выгляду быў нібы мядзьведзь — таўсты і касматы. Ступак цаляў у яго з пісталету, але пальцы нібы зьмярцьвелі, ён ня мог ціскануць на спуск, а страшыдла набліжалася. Тады ён кідаўся ўцякаць, ды ногі рабіліся, нібы з ваты, ён ня мог бегчы, а страшыдла было ўжо побач. На мяжы магчымай пагібелі нешта ўсё ж перайначвалася, пачынаўся іншы сюжэт, таксама мала прыемны, але без ранейшага жаху. Ноччу ён часта прачынаўся ў сваёй металічнай схованцы, асабліва як у двор уязджала машына і фарамі высьвечвала гаражныя шчыліны каля дзьвярэй, тады ўспыхвала трывожная думка: ці не па яго? Ці не разьнюхалі што? Можа, з таго памятнага шэсьця, калі яго пабілі, штосьці дазналіся і прыехалі браць. Тады нахлынала шкадаваньне і прыкрасьць на сябе — што не пасьпеў, прамарудзіў, прашляпіў. Аднак ішоў час, а да яго ніхто не завітаў, і тое абнадзейвала. Мабыць, усё ж яго праваронілі.

Затое не праваронілі іншых, мабыць, працавалі, як мае быць, не дарма елі свой міліцэйскі хлеб. Неяк уранку, калі ён яшчэ ляжаў пад брызенцінай на раскладусе, у дзьверы ціхенька пастукалі — раз і другі. Ён падхапіўся, падумалася: ці не дачка, якая ні разу яшчэ не прыйшла да яго ў гараж. Але то была не дачка — на ўваходзе, як ён адчыніў дзьверы, стаяў Аляксей, які зважліва папытаўся:

— Ну, чулі навіну?

— Якую?

— Мінкевіч гараж прадае. Разам з машынай.

— Чаго ж гэтак?

(Працяг у наступным нумары.)

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ

Правда ли, что с 1 января 2007 года нельзя продать земельный участок, если на нем не стоит дом, который зарегистрирован в БРТИ?

Антон ЗАРЕМБОВСКИЙ,
Минская область.

Сначала построй дом, потом продавай участок

За разъяснениями "Народная воля" обратилась в Государственный комитет по имуществу.

Там пояснили, что с 1 января 2007 года вступил в силу Указ президента №58 "О некоторых вопросах изъятия и предоставления земельных участков". По словам чиновников, необходимость принятия документа была вызвана введением принципа "одного окна". Указом предусмотрено определение пошаговых действий и сроков для всех участников процесса купли-продажи, обмена или дарения земельных участков, в том числе предоставляемых для ведения коллективного садоводства и индивидуальной жилой застройки.

Согласно новому указу, продать участок можно только с домом. Пустующий участок, который давался для строительства жилья, вы продать не сможете. Государство будет его изымать. Если земля была вашей собственностью, то изъятие будет проходить через суд и вам вернут вложенные деньги за его приобретение. А если надел находился в пожизненном наследовании, то его просто изымут и вам ничего не выплатят.

Запрещена купля-продажа, обмен и дарение (за исключением дарения близким родственникам) частных земельных участков до тех пор, пока собственник не получит документы, удостоверяющие их право на расположенные на этих участках капитальные строения.

Кому повезло в этой ситуации — владельцам земли в садоводческих кооперативах. Согласно целевому назначению, на участках для ведения садоводства и личного подсобного хозяйства не предусмотрена необходимость строительства. В садоводческих товариществах земля предоставляется в первую очередь для выращивания сельхозпродукции. Продавать такие незастроенные участки собственникам можно.

Татьяна ПАВЛИКОВА.

ПРОТЕСТ

«Митинг» у овощного киоска

В минувшую субботу я пошел в овощной павильон, чтобы купить свежих огурцов. И невольно стал участником несанкционированного митинга. Как потом выяснилось, его спровоцировало небольшое объявление, которое было приклеено на стекле торговой точки. И гласило оно о закрытии ларька с 1 марта в связи с решением Мингорисполкома.

Женщина с коляской возмущенно кричала:

— Я теперь с ребенком должна ехать на Малиновский рынок и стоять там в очередях?

Ее поддержала бабушка:

— А как я дотопаю туда?

Не остался в стороне и мужчина в дубленке:

— На весь микрорайон ни одного овощного магазина. Теперь и на павильоны замахнулись! Они же стандартные, добротные, не портят вид города. Если так печетесь о красоте Минска, так сносите и киоски "Союзпечати", они почти одинаковые по конструкции.

Очередь шумела, гудела, вспоминала. Вспоминала, как изгнали из стихийных рынков жителей окрестных деревень, у которых можно было всегда купить свежие овощи и фрукты из личного подворья. Изгнали, а что взамен? Потом было массированное наступление на рыбные ларьки "Виталюра". На защиту их встали многие малиновцы, писали обращения, ставили подписи. Тщетно! Власть у нас упертая, от решения своего редко отступается.

Митинг продолжался минут десять. Милиционеров рядом не было, никого не задержали. Все собравшиеся, то есть покупатели, дружно поставили свои подписи, осудив тем самым решение Мингорисполкома. Поставил подпись и я.

Но купив все, что хотел, не успокоился. Попросил у продавцов телефоны хозяев павильонов Николая Морозова и Александра Качана. Они дали, я позвонил и узнал следующее.

Оказывается, решение Мингорисполкома с душком. Принято оно в 2003 году. Тогда многие киоски были ликвидированы. Овощные остались, учитывая их особую социальную значимость. И правильно сделали, что не тронули. Проедьте по Минску, найдите магазин с вывеской: "Овощи — фрукты". Увидите, значит, вам повезло. Чисто овощная торговля убыточна, она не приносит барышей. Лучше построить гастроном и торговать деликатесами, водкой с колбасой, тогда больше прибыли.

Поэтому нет ничего удивительного, что в таком большом микрорайоне, как "Малиновка", нет ни одного овощного магазина. В некоторой степени положение исправляют павильоны А.Качана и Н. Морозова. Их восемь. Стоят они в основном во дворах, малозаметны. Но дорогу к ним люди знают, там всегда свежая продукция. А главное — дешевая. Дешевле, чем в отделах магазина "Рублевский", в "Зеленом клене", в гипермаркете "Простор". Возможно, руководству этих монстров и не по нраву маленькие да удаленькие овощные точки, которые переманивают покупателей. Они как бельмо в глазу. Вот и вспомнилось кому-то решение 2003 года.

Александр Качан и Николай Мороз сказали мне, что администрация Московского района, на территории которого они торгуют, полностью на их стороне. На их стороне и депутаты белорусского парламента, с которыми встречались и беседовали недавно предприниматели. В частности, один из них — Иван Мычко, обещал полнейшую поддержку. А кто против, так это руководство Мингорисполкома.

— Но посмотрите на это решение, — возмущаются Александр Васильевич и Николай Петрович. — В одном пункте они пишут снести нас, во втором — оставить сезонную торговлю овощами. То есть снести павильоны, которые могут работать круглый год, а вместо них поставить временные палатки. Где логика?

Не нашла в этом логики и пенсионерка Нина Винникова, которая после того "митинга" передала мне письмо.

"Каждый день рассчитываю, что и по какой цене купить. Конечно же, предпочтение отдаю овощам. Людям моего возраста они просто необходимы. Да они и дешевле рыбы с мясом. Думала, проблему решит гипермаркет, который построили у нас недавно. Но цены там кусаются. Кусаются они и в других магазинах, к тому же качество овощей и фруктов не самое лучшее. Поэтому хожу к павильонам, которые находятся возле нашего ЖЭСа и на улице Космонавтов. Все, что мне надо, в них есть и стоит недорого. И вот их хотят снести.

Хочется спросить у того же председателя горисполкома Михаила Павлова: почему он так не любит пенсионеров, жителей микрорайона "Малиновка", большинство из которых пострадали от аварии на ЧАЭС?"

Не знаю, сколько подобных писем отправлено в адрес Минского горисполкома. Но свои протестные подписи поставили уже несколько тысяч человек.

Евгений КАЗЮКИН,
житель Минска.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Подзвіг віцебскіх архівістаў

Толькі з Боскай дапамогай змагла ажыццявіцца шматгадовая праца калектыву архівістаў Віцебскай вобласці, якія стварылі і прэзентавалі грамадскасці унікальны зборнік дакументаў — *"Праваслаўная царква на Віцебшчыне: 1918—1991 гг."*.

Кніга выдадзена тыражом у 500 экземпляраў і ўжо толькі за гэтага мусіць стаць рарытэтам. Там змешчаны 142 рэдкасныя дакументы і 52 ілюстрацыі, якія даюць аб'ектыўную панараму няпростых, а падчас — і трагічных стасункаў дзяржавы і праваслаўнай царквы ў Віцебскай вобласці больш як за 70 год.

Нягледзячы на тое, што матэрыялы зборніка ўяўляюць цікавасць для шырокага кола чытачоў, выданне ў продаж не пойдзе, а ягоны абмежаваны тыраж паступіць выключна ў буйныя бібліятэкі, ВНУ, музеі ды асобныя ўстановы. Сваю частку тыражу атрымае, вядома ж, Віцебска-Аршанская епархія праваслаўнай царквы.

Паводле сведчання начальніка аддзела па архівах і справаводстве Віцебскага аблвыканкама Міхаіла Пішчулёнка, за час працы над зборнікам ягоныя аўтары назапасілі столькі матэрыялу, што яго хопіць на цэлы шэраг выданняў.

Вось толькі дзе ўзяць грошы на друкаванне?

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Наталья Петкевич вычеркнула своего отца из списков на получение почетного звания

Но тем не менее на днях главному врачу 7-й Городской стоматологической поликлиники Владимиру Кравченко указом А.Лукашенко присвоено звание "заслуженный врач Республики Беларусь".

В интервью "Народной воле" Владимир Акимович сказал, что получил звание во многом благодаря председателю Мингорисполкома Михаилу Павлову.

— Насколько я знаю, никаких льгот и привилегий звание "заслуженный врач" не дает, — сказал Владимир Кравченко, отвечая на вопрос "Народной воли". — Мне трудно сказать, какие чувства я испытывал, узнав о награждении... Безусловно, приятно, что признали заслуги коллектива, которым я руковожу уже более 30 лет.

— Дочь Вас как-то поздравила?

— Она, как Вы знаете, на госслужбе, свободного времени у нее очень мало. Я приехал к ней, выпили по фужеру шампанского и тут же разбежались. Меня не только дочь поздравила, но и, что особенно приятно, пациенты, с которыми я знаком 20—30 лет. Честно говоря, я уже и голоса многих забыл...

— Владимир Акимович, а как Вы относитесь к разговорам о том, что Кравченко стал заслуженным врачом во многом благодаря дочке, которую сегодня называют одной из самых влиятельных персон в Беларуси?

— Я понимаю, о чем вы хотите спросить... И предполагал, что такие разговоры могут быть... Насколько я знаю, документы на присвоение звания были подготовлены еще в минувшем году. И когда они вдруг попали на согласование к дочери, она меня вычеркнула из списков. Об этом факте, кстати, знают многие.

В том, что мне присвоили это звание, большая заслуга мэра города Михаила Яковлевича Павлова. Во время одного из очередных объездов города он привез ко мне делегацию глав администраций районов и сказал: мол, даю вам 3—4 года, но чтобы все медучреждения Минска были такими же, как 7-я Городская стоматологическая поликлиника! Наверное, сыграло некоторую роль и то, что я уже все-таки шестой год по всем показателям держу первое место в городе... Если не верите — зайдите в поликлинику и посмотрите, как у нас все устроено...

— Интересно, а Наталья Владимировна вычеркнула Вас из списков, а потом поставила перед фактом? Или вначале все-таки посоветовалась с семьей?

— Вначале вычеркнула, а потом мне сообщила. И я сказал, что она права. Думаю, что эти списки, может быть, неслучайно к ней попали... Наверное, хотели посмотреть, как она на это дело отреагирует. Иначе зачем ей было отдавать их на согласование? Как бы там ни было, ее решение поддержала вся наша семья.

А если честно, то впервые меня к этому званию представили 12 лет назад. Просто то документы терялись, то еще что-нибудь... И если бы мне его присвоили 10 лет назад, то я бы, конечно, был счастлив... А теперь... Мне интересна моя работа. Я счастлив, что вместе со своим коллективом смог сделать государственное медицинское учреждение европейского уровня. Я сегодня покупаю оборудование и делаю переоснащение за счет средств, которые зарабатывает коллектив. Вот это для меня самое главное...

— Спасибо за разговор и успехов Вам!

Марина КОКТЫШ.

Яўген Календа — чалавек года

"Чалавекам года—2006" у Магілёўскай вобласці прызнаны жыхар вёскі Зацішша, ветэран вайны і працы Яўген Календа.

Пачэснага звання ветэран удастоены за высакародства — на свае асабістыя сродкі ён узвёў помнік землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. А потым яшчэ і ўстанавіў вялікі камень з выбітымі на ім імёнамі ўдзельнікаў вайны. Атрымаўся сапраўдны мемарыяльны комплекс.

Ігар МАРОЗАЎ.

Урок пра Мінск

Менавіта такі ўрок хутка з'явіцца ў раскладзе заняткаў мінскіх школьнікаў.

Падручнік для 1—2-х класаў ужо створаны ў Мінскім дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сферы адукацыі.

НУ И НУ!

А чем занималась ваша бабушка до революции?

Прочитал в "Народной воле" раздумье режиссера Валерия Мазынскага **"Куды мы едзем?"** — и сердце сжалось. Сколько правды, сколько справедливой горечи в его словах об удушливой моральной атмосфере, в которой мы живем и которая разъедает, уродует человеческие души, в особенности молодые. Был просто потрясен оскорбительным для каждого нормального человека циркулярным бланком, который известному деятелю искусства предложили заполнить в связи с его попыткой оформить персональную пенсию, на которую он имеет право. Целиком и полностью этот бланк выскочил из уже канувшего в Лету советского периода, когда все граждане по любому поводу должны были письменно уверять государство в своей (и родственников!) лояльности этому государству, преданности идеям коммунизма и т.д. Вот и предложенные В.Мазынскому анкетные вопросы — уже в XXI веке! — составлены по образцу знаменитого *"А чем занималась ваша бабушка до революции?"*.

Хотел бы помочь составителям этого потрясающего документа, дополнив его рядом почему-то упущенных — видимо, по недосмотру — вопросов. Почему бы, например, не прощупать уважаемого претендента на пенсию на предмет *"Не участвовал ли в заговорах империализма против советской власти?"*. Или: *"Если отбывал наказание в ГУЛАГе, то каким подозрительным образом сумел выжить?"*. Или: *"Болел ли в детстве корью, скарлатиной, свинкой, чем лечился и долго ли еще собирается протянуть?"*

Конечно, можно спрашивать еще и еще, чтобы подозреваемому мало не показалось. Ничего, что при этом, говорят, человеческое достоинство страдает — ради "персоналки" можно и потерпеть...

Только все ли согласны с этим? К счастью, не все — к примеру, глубокоуважаемый мною Валерий Мазынский. Чем свидетельствует: честь и достоинство еще живут в этом мире!

Владимир БАШКИРОВ,
житель Могилева.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

«Ой, сівы конь бяжыць...»

Народнаму хору Беларусі — 55 гадоў

Лёс распарадзіўся так, што буднія і юбілейныя даты Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча і яго мастацкага кіраўніка народнага артыста Беларусі Міхася Дрынеўскага ідуць блізка-паралельна. Дату свайго нараджэння хор адзначае ў сакавіку, маэстра-кіраўнік, як сцвярджаюць энцыклапедыі, нарадзіўся ў лютым. 2007 год — юбілейны і там, і там: хору — 55 гадоў, Міхасю Дрынеўскаму — 65.

Зразумела: і адна, і другая даты маюць самастойнае і самадастатковае значэнне, настолькі самадастатковае, што пра кожную з іх можна і трэба гаварыць як пра значную падзею на сённяшняй культурнай глебе Беларусі. І гэта пры тым, што ўсякая дата — не болей як пэўны цень, адбітак рэальнасці, якая існуе ў жыцці і ў многім творыць жыццё. Але разам з тым абедзве названыя даты звязаны такой цеснай унутранай повяззю, што развесці іх, а тым болей раздзяліць, не проста цяжка, а практычна немагчыма. Гэта нешта ад сіямскіх блізнят, дзе любое хірургічнае ўмяшанне немагчыма без крыві, а то і горшага.

Мы гаворым *"народны хор"* — і да нас вяртаецца, ажывае нешта незабыўнае, хвалюючае. Як такое — магутнае, мужчынскае:

Ой, сівы конь бяжыць,
На ім бела грыва.
Ой, спанаравілась,
ой, спанаравілась
Мне тая дзеўчына...

Быццам бы толькі словы, але ў нашай памяці яны злітыя ў адно галасавое ўнутранае гучанне, у якім з'ядналіся і тупат каня, і яго "бела грыва", і галоўнае: "Ой, падай, дзеўчына, ой, падай, дзеўчына, на каня ручаньку..."

Ці такое: іскрамётная, раскручаная танцавальным віхрам і купалаўскім разагрэтым рытмам "Вечарынка ў калгасе". Гэтакае захапляючае танцавальна-музычна-харавое буйства, народнае свята, з яго то запаволенымі, меладычна-роздумнымі і карагоднымі праходамі, то імклівым калейдаскопам мужчынска-жаночых скокаў...

Ці старадаўна-палескае, прарадзінна-беларускае, як ад зямлі, з глыбіні вякоў: *"Волы ж мое половуе, чого ж рано помарнелі?.."*

Ці ціхі, як пералівы вясновага ручая, перазвон цымбалаў і нешта яшчэ цішэйшае — запаветнае, інтымнае, што прыхавана жыло ў нас, а прачнулася толькі цяпер, пры яркa асветленай прасторнай сцэне з цяжкай шырока расхінутай заслонай, пад гэты вясновы цымбальны пераклік...

Ці... Так можна ісці па ўсім песенна-танцавальным рэпертуары слаўна вядомага ў свеце хору, на сённяшнім актыўным балансе якога налічваецца больш за тысячу нумароў песеннай класікі, у якой перш за ўсё беларускія народныя песні, песні беларускіх кампазітараў, вялікі запас рускіх, украінскіх народных і аўтарскіх песняў, песні народаў свету — больш за ўсё тых краін, у якіх хор пабываў з гастролямі, а гэта, без перабольшання, — увесь былы Савецкі Саюз, краіны Еўропы, Азіі, Амерыкі.

Мы гаворым *"Міхась Дрынеўскі"* і бачым у яркім святле юпітэраў высокага, спартыўнага крою чалавека ў тэатральна-парадным касцюме з ускінутымі ўгору рукамі, павернутага спінай да залы, тварам да чуйна прыціхлага, жаноча-мужчынскага шчыльнага паўкружжа, вочы якога скіраваны на гэтыя дзве ўскінутыя магічныя белыя рукі.

Цішыня ў зале. Цішыня на сцэне... Вось адна рука пачынае павольна, міліметр за міліметрам, апускацца, і недзе далёка, як у паднябессі, узнікае голас, нават не голас, а намёк на яго ці на гук ненарокам кранутай струны. Гук трымціць, але не перарываецца, набывае выразнасць, у ім чуецца нешта жывое — ці то дзіця маму кліча, ці то мама долю кліча... Гук узмацняецца, набліжаецца, і мы ўжо ўгадваем у ім балесную жаночую душу... Гэта недзе там, за лесам, на спелым полі жнеі вядуць сумную адвечную песню. Ці то песня, ці галашэнне. Песня... Мы нават пачынаем адрозніваць словы: "Гэй... гэй..." Нехта некага гукае, нехта некага зазывае: "Гэй?.. Гэй?.."

Рука маэстра апускаецца ніжэй, ніжэй, голас смялее, набірае сілу і словы, і вось ужо загучаў на ўсю залу ва ўсёй прыгажосці раскаванага пачуцця адчайна раскрытай жаночай душы:

Ой, пайду я дарогаю...
Ды пушчу голас дуброваю...

Душа не пабаялася, асмелілася вынесці на людзі сябе — свой сум, свае думкі, свае перажыванні, сваю трывогу:

Няхай голас галасуе,
Ды няхай мамачка чу-у-уе...

А вось і сама "душа" — высокая, стройная, як вясна, як надзея, — у строгай бела-блакітнай харавой сукенцы ідзе з глыбіні сцэны з прыўзнятай да грудзей рукой. Рука абараняе, засланяе сэрца ад невядомай злой сілы, якой быццам бы і не відаць, але яна можа быць, можа, недзе там, далёка, а можа, і зусім блізка. І мы пазнаём у жанчыне вядучую салістку Народнага хору заслужаную артыстку Беларусі Валянціну Міхайлаўну Крыловіч, галасістае дзіва з-пад Буда-Кашалёва. Хаця што "пазнаём"? Мы яе пазналі, як толькі загучала першае зазыўна-трывожнае "гэй... гэй..." і яшчэ раней па незвычайным Богам дараваным, такім родным голасе.

Маэстра паварочваецца насустрач ёй, і вось яны двое паміж хорам і людзьмі ў зале, як чараўнікі і як віноўнікі на нейкім самімі абраным строгім судзе. Чараўнік з узнятымі рукамі робіць крок назад, нібы трошкі адступае, каб пакінуць болей прасторы жанчыне ў бела-блакітным нацыянальным строі, і яна забірае гэтую прастору, і голас узлятае ўгору, адкуль яго лепей чутно, адкуль яму лягчэй перадаць тое дарагое і прыгожае, што сабралася ў ім і што схавана ў словах гэтай слёзнай і шчымлівай песні.

Няхай мамачка чуе,
Мне вячэру гату-у-е...

Песню немагчыма пераказаць. Песню трэба слухаць. Песню трэба бачыць. Напаўзабытыя, ці забытыя, ці нязнаныя, але па-сённяшняму прыцягальныя сукенкі артыстак; па-шляхецку фацэтныя, з густам і годнасцю гарнітуры артыстаў. Маладыя стройныя паставы, адухоўленыя твары...

Пра песню можа расказаць толькі сама песня і толькі тады, калі яе спяваюць.

"Ой, пайду я дарогаю..." Беларуская народная песня... Апрацоўка для хору Міхася Дрынеўскага", — так звонка і ўрачыста аб'явіла на канцэрце канферансье, як скупую, без эмацыйнага акрасу інфармацыю, нібыта за ёй нічога іншага не стаяла і не стаіць.

Не стаяла і не стаіць? Паслухаем аўтара апрацоўкі, болей чым хто прыбліжанага да арыгіналу:

"Я тры гады выняньчваў гэтую песню... Як птушанятка, як дзіцятка, — гаворыць Міхась Паўлавіч Дрынеўскі. — *Першы раз пачуў яе ад Альберта Кашпура — рэчыцкага хлопца, аднакурсніка па кансерваторыі. Песня зачапіла, запала ў душу. Хаджу і слухаю яе, чую яе, бачу яе... Слоў, здаецца, няшмат, а які прастор для фантазіі, для голасу, якая глыбіня... Зноў жа. Як падаць яе ў а капэльным выкананні? Сёння можна сказаць, што песня рабілася пад канкрэтнага чалавека — пад Валянціну Крыловіч, пад яе рэдчайшае сапрана. Гэта выключны голас ні з чым не параўнальнай тэмбравай прыгажосці і незвычайнай выносліваці. Яму па сіле ўсё — ад нізкіх, "падвальных" нотаў малой актавы да самых высокіх, паднебных, а калі яна пераходзіць у акадэмічную манеру спеву, то лёгка ўваходзіць і ў другую, і ў трэцюю актавы. І вось калі знайшлося сцэнічнае рашэнне, гэты яе праход — як з цемры на святло, як з ночы ў дзень, з далёкім голасам, які набірае і набірае моц на ўсю сваю вышыню і шырыню, толькі тады я ўздыхнуў вальней".*

І праўда, у песні ўсяго пяць слоўных радкоў. А як пашырыліся, паглыбіліся, ускаласіліся эмацыйныя і сэнсавыя абсягі іх, калі загаварыў голас — сапраўды народны голас сапраўды народнай артысткі. І заслужана доўгімі былі апладысменты па заканчэнні песні, і заслужана шчырымі былі слёзы на вачах у людзей.

Гэта свята адбывалася ў прыгожа і годна абноўленым памяшканні філармоніі, калі Народны хор даваў адзін з не так частых у сталіцы канцэртаў. У праграме былі новыя нумары і нумары не новыя, але сустрэча з якімі заўсёды новая і цікавая. Прэм'ерная песня "Ой ляцелі гусі з броду" (апрацоўка Міхаіла Галавача), "Волы ж мое, половуе..." — аўтэнтычная старадаўняя палеская песня (апрацоўка кіраўніка знакамітых "Крупіцкіх музыкаў" з Тураўшчыны Уладзіміра Грома), "Гэй, раскідайцеся, зялёны кусточкі" ў выкананні Наталлі Конюх, "Берегите матерей" (словы Расула Гамзатава, апрацоўка Міхася Дрынеўскага, саліст заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Будай), "Ночка зорная, купальная" (словы А.Казюкі, музыка Эдуарда Шчыракага, выкананне Наталлі Гарнастаевай).

У канцэрце не было "прахадных" нумароў, як часам здараецца на канцэртах, нумароў для перадышкі; кожная ці то песня, ці танцавальная кампазіцыя, ці аркестровая імпрэсія — гэта адкрыццё і тэматычнае, і жанравае, і сцэнічнае, і вакальна-харавое.

Што грашыць... Здаецца, з самага нараджэння ўсе мы ведаем рускую народную песню "Шумел камыш"... Незаслужана прыніжаную, аднесеную ў ранг застольна-п'янаватых, для ўсіх галасоў і ўсякага безгалосся. Нібыта сама песня вінаватая і ў сваёй знявеканай славе, і ў беспрасветным культурным бескультур'і грамадства. А выйшаў на сцэну дырыжор, ён жа мастацкі кіраўнік хору, ён жа Міхась Дрынеўскі, узняў угору рукі, зірнуў на аркестр — чатыры баяны, двое цымбалаў, скрыпкі, флейта, кларнет, кантрабас, зірнуў на хор, хвіліну счакаў, павёў рукой — і адбыўся цуд: усе, хто быў на сцэне і хто быў у зале, сталі ўдзельнікамі такой душэўнай, такой вечнай і такой асабістай драмы:

Шумел камыш, деревья гнулись,
А ночка темная была...
Одна возлюбленная пара
Всю ночь гуляла до утра...

Усё гэта ў аб'ёмным мужчынска-жаночым шматгалоссі, дзе кожны голас — валасінка ў харавым перапляценні, кожны вядзе сваю ноту, нясе сваю нагрузку, свае перажыванні, свой лёс, а ўсе разам — гэта стыхія, размах, раздолле, гарманічна сабранае ў адно цэлае — жывое, трапяткое, вечнае. І ўсе ўбачылі, адчулі да мокрых вачэй, што гэта ніякая не п'яная, асуджаная на жыццё ў занядбаных падваротнях, а вялікая народная песня пра людзей, пра каханне і яшчэ пра нешта ў кожнага сваё і кожнаму дарагое.

Зноў жа. Мы гаворым *"Міхась Дрынеўскі"* і бачым яго не на святочнай сцэне, не з артыстамі, а ў бакавой дырэктарскай ложы... На сцэне танцуюць — і Дрынеўскі падскоквае, на сцэне спяваюць — і Дрынеўскі цягне туды сваю шыю. На сцэне іграе аркестр — Дрынеўскі іграе — пальцамі, рукамі, целам... Пусці — і пабяжыць, як хлапчук на стадыён.

І сумна было думаць пра тое, што на канцэрце не было, здаецца, нікога ні з міністэрстваў культуры, інфармацыі, ні з якіх іншых дзяржаўных адміністрацый. Не для галачкі, не для справаздачы перад начальствам, а проста для ўласнай радасці. А яшчэ больш сумна было, што ніводзін канал тэлебачання — ні Першы, ні АНТ, ні СТВ, ні ўсякія іншыя "нацыянальныя" каналы, ніводная дзяржаўная газета не прыслалі ні аднаго карэспандэнта, ніводнай, нават ручной тэлекамеры. А калі глядзець па-дзяржаўнаму, з клопатам пра сённяшні і заўтрашні дзень нашай гісторыі, нашай культуры, каб пакінуць і паказаць сёння і захаваць для нашчадкаў тое лепшае і унікальнае, тое бясцэннае, што маем, але чаго заўтра можа не быць, то ўвесь гэты канцэрт трэба было запісваць на самай сучаснай акустычнай апаратуры і адначасова весці прамую трансляцыю з залы філармоніі, як гэта, хоць і рэдка, але здаралася ў старыя савецкія часы. А пасля — як нацыянальнае псіхалагічнае лякарства кожны дзень даваць па радыё хоць адну песню і даваць, калі раніцай — услед за Дзяржаўным гімнам, калі вечарам — перад гімнам.

Падумалася: "Вунь чаго захацеў! Гэта ж табе не Пугачова і нават не Агурбаш!.."

Рыхтуючыся пісаць гэты юбілейны і не зусім юбілейны нарыс пра Нацыянальны народны хор і яго кіраўнікоў, захацелася пазнаёміцца з літаратурай пра жыццё хору, дзе былі б і факты, і гісторыя, і аналіз. 55 гадоў — гэта і для чалавека, і для калектыву нямала. Гэта паўвека і трошкі болей. І зноў падзівіўся: які скупы, які мізэрны гэты даследчы багаж. Нават у пяцітомнай "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" (Мн., БелСЭ, 1985) у канцы матэрыялу, прысвечанага хору, усяго тры згадкі на крыніцы: кніга Л.Мухарынскай 1959 года, калі хор жыў яшчэ пад імем "Беларускі дзяржаўны народны ансамбль песні і танца", "Нёман", З.Мажэйка, Н.Хвісюк, 1982.; "Мастацтва Беларусі", 1983 г. І ўсё, і нічога болей.

Безумоўна, пасля выхаду энцыклапедыі ў хора былі круглыя юбілеі — і 40 гадоў, і 50, былі "юбілейныя" публікацыі ў газетах, але сур'ёзнага, грунтоўнага аналізу ці нават разгорнутага нарыса пра жыццё і творчую працу унікальнейшага калектыву і яго мастацкіх кіраўнікоў (а іх усяго два — Генадзь Цітовіч і Міхась Дрынеўскі), пра іх наватарскія, нестандартныя, заўсёды эксперыментатарскія і творчыя натуры не было і, на вялікі жаль, няма.

У народны хор, можна сказаць, пад крыло яго стваральніка Генадзя Цітовіча Міхась Дрынеўскі прыйшоў хормайстрам адначасова з заканчэннем Беларускай кансерваторыі. Праўда, прыйшоў не як навічок-першакласнік, а ў рангу мастацкага кіраўніка народнай харавой капэлы Палаца культуры Мінскага трактарнага завода, з якой працаваў з 1964 года, расціў яе славу, а слава расціла яго.

Іх цягнула адзін да аднаго — старэйшага, Генадзя Іванавіча, гады якога набліжаліся да поўнага шостага дзесятка, і малодшага, Міхаіла Паўлавіча, напарадзе ў якога быў "дарослы" юбілей — трыццацігоддзе. Людзі аднаго — аптымістычна-ўзрыўнога тэмпераменту, яны з аптымізмам глядзелі ў вочы жыццю, добра ведаючы сваё месца ў ім.

Старэйшы не-не ды і задумваўся пра свайго наступніка — чалавека, якому можна было б даверыць народны хор — дарослае, але даволі капрызнае і клопатнае дзіця, якое ён узгадаваў і павёў у свет, з якім заваяваў славу і якое патрабавала моцнай граматнай рукі. Пра гэта ён не гаварыў, а думкі недзе ў душы насіў і бачыў: вось ён — малады, таленавіты, актыўны, народную песню адчувае і ведае, як падысці да яе, што з ёй рабіць, як падаць, каб яна загучала і па-даўняму мудра, і па-сучаснаму нова. І сам родам з Палесся — гэтага, лічы, яшчэ нечапанага куфра, нерасцяганай кладоўкі старадаўняй беларускай народнай песні.

Малодшаму падабаўся настаўнік, яго беларуска-віленская закваска (Віленская кансерваторыя, этнаграфія ў Віленскім універсітэце) — сваёй актыўнасцю, сваёй энергіяй, сваёй адданасцю народнаму фальклору: падумаць толькі — аб'ездзіў, абхадзіў усю Беларусь, запісаў больш за тры тысячы народных песняў і танцаў. Некалі, у далёкім 1939 годзе, сабраў і ўзначаліў самадзейны народны хор у вёсцы Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна і панёс песню па Беларусі і за яе межы. Зноў жа, у 1952 годзе стаў арганізатарам і мастацкім кіраўніком Дзяржаўнага народнага хору БССР, зрабіў яго вядучым мастацкім калектывам рэспублікі, слава якога бегла далёка папарадзе самога. Паездзіў з калектывам па свеце — Балгарыя, Венгрыя, Польшча, Фінляндыя, Францыя, Канада... Пры ўсёй душэўнай адкрытасці і творчай расхрыстанасці Генадзь Іванавіч умеў шукаць і знаходзіць патрэбных хору людзей, а, знайшоўшы, — не адпускаць далёка, а яшчэ часцей — прывязваць да калектыву. Так прывязаў і Дрынеўскага: спачатку хормайстар — на паўстаўкі, ці на чвэрць стаўкі, ці зусім за сімвалічную плату, пасля ўжо, у 1973 годзе, — галоўны хормайстар. А ў 1974 годзе Цітовіч сам пайшоў з хору. У кулуарах пагаворвалі, што пайшоў не зусім сам, нібыта яму трошкі "падказалі", хаця фармальная зачэпка як быццам бы і была: пенсійны ўзрост. А нефармальныя прычыны... яны заўсёды знойдуцца, асабліва калі хацець іх знайсці. Генадзь Іванавіч пайшоў, але ў галоўным быў спакойны: хор пераходзіць у надзейныя, цвёрдыя і таленавітыя рукі.

Так хор займеў новага кіраўніка. Быў то 1975 год.

Хор Цітовіча стараўся і фарміраваўся з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці і народных гурткоў і доўгі час нёс на сабе характэрныя асаблівасці калектываў народнай самадзейнасці: прывязка да мясцовага песеннага фальклору, у дадзеным выпадку фальклору палескага краю, вернасць, нават аўтэнтычнасць манеры мясцовага выканання і іншыя. Нейкі час здавалася, што і з прыходам новага мастацкага кіраўніка ўсё ідзе як і раней: заставалася традыцыйна ранейшая структура хору — харавая, танцавальная, аркестровая групы; заставаліся тыя ж накірункі дзейнасці — этнаграфічны — з песняй у яе першасным народным гучанні, тэатралізавана-сінтэтычны з максімальным удзелам усіх груп хору; харавы — з усё большай доляй прафесійнага капэльнага выканання. Хор ездзіў на гастролі, пашыраўся, абнаўляўся рэпертуар, прыходзілі новыя людзі, пакідалі старыя і не зусім старыя. З вялікім жалем калектыў адпускаў у вольнае плаванне ўзгадаваны хорам вакальны квартэт "Купалінка". Як гэта часта бывае ў жыцці, калі малое несамастойнае адпачкоўваецца ад вялікага самастойнага, — квартэт не знайшоў у сабе неабходнай творчай і матэрыяльнай сілы і праз нейкі час згубіў сваё "я" і згубіўся сам.

А час ішоў. І ўсё ясней праступала няпростая задача, якую ставіў перад сабой і калектывам малады кіраўнік. А задача была такая: сінтэзаваць у адно цэлае самабытнасць народнай песні, пакідаючы яе непаўторнасць і адметнасць, і разам з тым надаць ёй акадэмічную музычную культуру і стройнасць. Іначай кажучы, ператварыць здабыты з нетраў народнай памяці вугляваты, вожыкаваты алмаз у дарагі, прыгожы, сонечна-празрысты брыльянт. З гадамі стала бачна, што на гэтым шляху ў калектыва не толькі вялікія цяжкасці, але і добрыя поспехі, што, разам узятае, знайшло і ганаровае афіцыйнае прызнанне: у 1983 годзе хору нададзена высокае званне "Акадэмічны". Водгукі тысячаў удзячных слухачоў і гледачоў, каму пашчасціла хоць раз прысутнічаць на канцэртах хору, — таму самае яскравае сведчанне.

Хор жыве, хор працуе, хор святкуе свой чарговы юбілей. З гэтым мы яго і віншуем.

На такой мажорнай ноце можна было і завяршыць гэтыя скупыя нататкі. Завяршыць, калі б не адно "але". "Але" заключаецца ў тым, што хор з нейкага часу стаў "невыязны". Па Беларусі выступаць можна, што ён і робіць, а за межы краіны выязджаць нельга. Чаму? Няма грошай? Дык хор сам зарабляе, хоць гэта і не так проста... Апошні выезд у "далёкае замежжа" — Кітай — быў сем гадоў таму. За тыя ж сем гадоў хор выязджаў тройчы да блізкіх суседзяў — у Санкт-Пецярбург, Кіеў і да беластоцкіх беларусаў, у Гайнаўку. І ўсё.

Безумоўна, гастролі па Беларусі — справа і важная, і адказная. Нават пры тым, што рэдкі райцэнтр краіны мае і сцэну, і гасцініцу, каб прыняць увесь хор. Яго даводзіцца драбіць, дзяліць, запіхваць у аўтобусы і — раніцай туды, вечарам, правільней, ужо ноччу — назад. Зноў жа, эканомія — гасцінічныя, камандзіровачныя... Аўтобусы з'ядаюць голас, б'юць па здароўі артыстаў... Але і тут хор застаецца на вышыні. Пра гэта сведчыць Гран-пры, заваяваны ў Магілёве на конкурсе царкоўнай песні і ў Гайнаўцы ў 2004 годзе.

Сённяшніх дзяржаўных ідэолагі збіваюцца з ног у пошуках кандыдатаў на так званую "візітовую картку" Беларусі для замежжа. Перавага аддаецца то спартоўцам, то папсоўцам. Трацяцца вялікія грошы на раскрутку то адной, то другой кандыдатуры, але, як паказвае горкая практыка, у выключнай большасці ўсе гэтыя "раскруткі" заканчваюцца, прабачце за народнае, — "пшыкам". Прыклады і добра чутны, і добра бачны... Не будзем гаварыць пра статус, а тым болей пра плён усяляких гэтых еўра-шоу, да якіх гістарычна-традыцыйныя музычныя заканадаўцы, такія краіны, як Італія, Францыя, Іспанія і іншыя, ставяцца вельмі скептычна. У нас жа ўдзел у гэтых крыкліва-рэкламных мерапрыемствах узняты да вышыні дзяржаўнай палітыкі, і правал прадстаўніцы ці прадстаўніка ад Беларусі на іх успрымаецца ледзь не як нацыянальная трагедыя.

Дык вось — "візітовая картка"... Ці трэба яе шукаць, калі яна ёсць і даўно, і не адна. Возьмем той жа хор імя Генадзя Цітовіча... Праўда, хор — гэта не візітовая, а казырная карта. За ёй — сама Беларусь са сваімі шматвяковымі музычнымі традыцыямі, з прыкавет-най гісторыяй, захаванай у песні.

У хора вялікая і, не пабаімся сказаць, сусветная слава. У хора магутнейшы творчы патэнцыял. Грэх не скарыстоўваць яго на поўную сілу.

Анатоль КУДРАВЕЦ,
пісьменнік,
лаўрэат
Дзяржаўнай прэміі Беларусі
імя Якуба Коласа.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Получив земельный участок, я в этом году хочу приступить к строительству дома, посадке сада, кустарников. Не могла бы "Народная воля" разъяснить, каких норм я должен при этом придерживаться?

Федор КОЗЛОВСКИЙ,
житель г.Гомеля.

Хочу строиться...

Уважаемый Федор Козловский!

Действительно, существуют нормы, которых Вы должны строго придерживаться. Так, отдельно стоящие хозяйственные сооружения и постройки для содержания скота и птицы необходимо располагать относительно домов с соблюдением минимальных санитарных разрывов:

— расстояние от жилого дома до постройки для домашних животных (1—2 коровы) и птицы — 15 м;

— расстояние от жилого дома до постройки для домашних животных (3 и более коровы) — 25 м;

— расстояние от жилого дома до навозохранилища и помойной ямы — 15 м;

— расстояние до компоста, холодной уборной и мусорной ямы — 10 м.

При этом расстояния от окон ваших жилых комнат до стен дома и хозяйственных построек (сарая, гаража, бани) соседа должны быть не менее 6 метров.

Кроме того, вы должны соблюдать минимальные расстояния до забора соседа:

— от хозяйственных построек — 1 м;

— от отдельно стоящего жилого дома — 3 м;

— от плодовых и декоративных деревьев — 3 м;

— от кустарников — 1 м.

Запрещено строительство хозяйственных построек на линии застройки улиц и проездов. Их следует относить в глубину участка.

Допускается пристройка к дому хозяйственных сараев, мастерских, гаража, бани, теплицы.Также разрешено размещать на первом, цокольном этаже гараж, мастерскую. При этом должны соблюдаться санитарные, а также противопожарные нормы. Допускается блокировка хозяйственных построек на смежных участках по согласию с соседом (с учетом противопожарных требований).

ЧУЛІ?

Парода новая, беларуская

Больш за сорак гадоў спатрэбілася беларускім свінаводам, каб вывесці новую беларускую пароду свіней. У перыяд з 1975-га па 2006 год у працэсе былі задзейнічаны 14 племгаспадарак.

Жывёлаводам-селекцыянерам была пастаўлена задача вывесці беларускую буйную белую пароду свіней наступных характарыстык: шматплоддзе — 11,5 парсючка, сярэднясутачны прырост — 3,5 к. адз., таўшчыня шпіка 26 мм, маса кумпяка — 10,9 кг.

Зараз работы завершаны. Вынікі селекцыі перададзены на разгляд у Мінсельгасхарч.

Ігар МАРОЗАЎ.

КРЫМІНАЛ

Як легалізаваць крадзеную машыну?

На гэтае пытанне спрабуюць знайсці адказ супрацоўнікі КДБ па Брэсцкай вобласці. Імі распачата крымінальная справа ў дачыненні да жыхара Столінскага раёна, які займаўся легалізацыяй выкрадзеных за мяжой аўтатранспартных сродкаў.

Як паведаміла супрацоўнік прэс-групы ўпраўлення КДБ Аксана Дзмітрук, справа згодна з ч.3 арт.235 Крымінальнага кодэкса (легалізацыя ("адмываннe") матэрыяльных каштоўнасцяў, набытых злачынным шляхам) распачата 19 лютага следчым аддзелам УКДБ. 27-гадовы жыхар Столінскага раёна падазраецца ў тым, што ў 2002—2004 гадах, калі дзейнічаў у складзе ўстойлівай групы, у якую ўваходзілі ў тым ліку службовыя асобы органаў унутраных спраў, займаўся легалізацыяй у вобласці грузавых і легкавых аўтамашын, паўпрычэпаў і прычэпаў, выкрадзеных у краінах Заходняй Еўропы і Расіі і ўвезеных на тэрыторыю Беларусі з парушэннем мытнага заканадаўства.

За гэты перыяд арганізаванай злачыннай групе ўдалося легалізаваць больш за 50 грузавых аўтамашын і паўпрычэпаў, а таксама больш за 20 легкавых аўтамабіляў. Яны былі пастаўлены на ўлік у органах ДАІ са зменанымі ідэнтыфікацыйнымі нумарамі на падставе фальшывых дакументаў у Брэсце, Бярозе і Пінску і незаконна ўцягнуты ў эканамічны абарот.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
2 САКАВІКА 2007 г.

ФУТБОЛ

Рональда ў Смаргоні не згуляе

Чарговы чэмпіянат Беларусі па футболе стартуе ў пачатку красавіка, але ўжо зараз, у перыяд міжсезоння, каманды актыўна праводзяць селекцыйную працу — працу па падборы футбалістаў і трэнераў. Пакуль без сенсацый.

На сённяшні дзень гучных і сенсацыйных трансферных навін са стану каманд вышэйшай лігі не паступала. Як і ў мінулыя гады, беларускім балельшчыкам не давядзецца пабачыць на ўласныя вочы футбалістаў сапраўднага еўрапейскага ўзроўню. Бяда ў тым, што нават у адрозненне ад той жа Расіі ў беларускую клубную інфраструктуру ўкладаюцца не вельмі вялікія грошы. Выключэннем можа стаць толькі мінскае "Дынама" і сталічнае МТЗ-РІПА. Гэтымі камандамі кіруюць бізнесмены — Юрый Чыж і Юрый Раманаў. Чыж вядомы тым, што мяняе галоўных трэнераў сваёй каманды як пальчаткі. Хаця з іншага боку Юрыя Аляксандравіча зразумець можна — чалавек, які ўкладае ў каманду ўласныя сродкі, заканамерна патрабуе самых высокіх вынікаў. Як вядома, напрыканцы мінулага сезона ў "Дынама" адбылася чарговая трэнерская ракіроўка — месца расійскага спецыяліста Аляксея Пятрушына заняў былы форвард зборнай Беларусі Пётр Качура. Акрамя таго, у родныя пенаты вярнуўся галкіпер зборнай Беларусі Генадзь Туміловіч. 35-гадовы спартсмен будзе ў мінскай камандзе гуляючым трэнерам варатароў. З ігракоў, якія могуць папоўніць шэрагі мінчан у будучым сезоне, можна вылучыць пяўабаронцу кіеўскага "Дынама" Юрыя Дзмітруліна, а таксама трох бразільскіх легіянераў — Дугласа, Леанарда і Уэслі. Увогуле бразільцы часцяком выходзяць на поле ў бела-блакітных футболках, праўда, па ацэнках многіх спецыялістаў, у Беларусь паважаючыя сябе класныя спартсмены з гэтай краіны не едуць. Узровень не той...

Навіны з клуба, які ўваходзіць у імперыю Юрыя Раманава, наступныя: аб тым, што каманду пакінуў галоўны трэнер зборнай Беларусі Юрый Пунтус і на яго месца прыйшоў харызматычны Эдуард Малафееў, "Народная воля" паведамляла. Акрамя таго, МТЗ-РІПА пакінуў Вячаслаў Глеб, які разам з Пунтусам пераехаў у літоўскі "Каўнас" — яшчэ адну каманду Раманава. З новых імён у складзе "трактаразаводцаў" можна вылучыць пяўабаронцу Абубараку Камару з Гвінеі.

У стане чэмпіёна краіны барысаўскага БАТЭ аб з'яўленні нейкіх гучных імён пакуль што не чутно. Дакладна вядома, што каманду пакінулі Дзмітрый Клімовіч, Аляксандр Лебедзеў, Дзмітрый Молаш, Аляксандр Кобец і Дзмітрый Бага. Футбалісты адправіліся ў Расію. Увогуле, пасля ад'езду Аляксандра Глеба ў Германію айчыннym майстрам скуранога мяча замацавацца ў клубах сапраўднага еўрапейскага ўзроўню амаль не ўдаецца.

Шчыра кажучы, асноўная маса беларускіх каманд вышэйшай лігі аддае перавагу сваім "дамаросым" футбалістам. Вось яны і качуюць са Смаргоні ў Віцебск ці з Салігорска ў Мінск.

Думаецца, няма сэнсу падрабязна спыняцца на такіх пераходах. Лепш засяродзіцца на перастаноўках на пастах галоўных трэнераў. А іх у бягучым міжсезонні ўжо даволі шмат. На месца галоўнага трэнера "Гомеля" замест Віктара Папаева прыйшоў Анатоль Юрэвіч, які папрацаваў у многіх беларускіх клубах. Самым гучным поспехам у яго трэнерскай кар'еры было чэмпіёнства падчас працы ў Мазыры.

У ждановіцкую "Дарыду" прыйшоў экс-настаўнік зборнай Беларусі Анатоль Байдачны. Брэсцкае "Дынама" пакінуў галоўны трэнер Сяргей Бароўскі, а на яго месца прыйшоў Уладзімір Геваркян. Гродзенскі "Нёман" з наступнага сезона будзе трэніраваць чэмпіён СССР 1982 года Людас Румбуціс. Жодзінскае "Тарпеда" пакінуў галоўны трэнер Уладзімір Журавель. На яго месца прыйшоў Алег Кубараў.

Зразумела, што да пачатку чэмпіянату футбольныя клубы будуць працягваць падбор спартсменаў. Магчыма, напярадзе нас чакаюць гучныя футбольныя сенсацыі ў плане імёнаў, якія будуць абараняць гонар сваіх каманд. Хаця верыцца ў гэта цяжка, бо, як правіла, селекцыя ў беларускіх камандах праходзіць спакойна, нават будзённа. Гэта ў "Мілане" ці "Барселоне" з прыходу новага футбаліста робяць сапраўдную сенсацыю — аўтографы, фотасесіі ў футболцы новага клуба. У Еўропе таксама не робяць тайны з сумы, якую той ці іншы футбаліст будзе атрымліваць у год, месяц і нават тыдзень. Беларускія футбольныя рэаліі такія, што кіраўнікі клубаў увогуле не раскрываюць шырокай грамадскасці сумы, якія стаяць у кантрактах футбалістаў. Па меншай меры, пакуль не будуць сфарміраваны заяўкі каманд на чэмпіянат. Маўляў, гэта камерцыйная тайна і не варта зазіраць у чужую кішэню і лічыць чужыя грошы...

Але бліжэй да пачатку чэмпіянату Беларусі "Народная воля" абавязкова вернецца да гэтай тэмы.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ШАШКІ

Шыкоўная камбінацыя

Майстар ФМЖД Яўген Кандрачэнка з Гомеля ўжо двойчы перамагаў у першынствах Беларусі па шашках-64. Зараз ён рыхтуецца да гэтага ж чэмпіянату, які прадбачыцца. Таму сустрэўся з кандыдатам у майстры спорту з Маладзечна Аляксандрам Барташам і згуляў з ім матч з 42 бліц-партый. Сяброўская дуэль завяршылася на карысць Я. Кандрачэнкі з вынікам +24-6=12. Наступны эпізод, які ў іх атрымаўся, павінен зацікавіць вас:

Белыя (А.Барташ): a3, b4, c3, d6, e3 (5). **Чорныя:** (Я.Кандрачэнка): a7, b8, g7, h2 (4). Ход чорных. Праз некалькі манеўраў яны правялі шыкоўную для практычнай гульні камбінацыю. Таго, хто яе адшукае, чакае сюрпрыз ад чэмпіёна — адна з кніг, якія ён выдаў у сааўтарстве з міжнародным гросмайстрам Аляксандрам Касэнкам (Кіеў). Дарэчы, па пытанні іх набыцця можна звяртацца да Я. Кандрачэнкі па тэлефоне 8-0232-62-18-87.

Яўген не прапусціў і турнір у Гомелі, дзе перамог, набраўшы 15 ачкоў з 16 магчымых. Кандыдаты ў майстры спорту У. Канарскі (13 ачкоў) і Э. Харошын (12) занялі другое і трэцяе прызавыя месцы. З гэтага ж спаборніцтва заслугоўвае вашай увагі такі момант:

Белыя (Я.Кандрачэнка): a5, c5, d4, g1, h2 (5). **Чорныя** (У.Канарскі): a7, e7, f6, h4, h6 (5). 1. de5! 2. a:c7 ed6 3. c:e5 ab6 4. ed6 ba5 5. dc7 ab4 6. cb8. Далей пашукайце эцюдную развязку самі.

Тэрмін для адказаў — традыцыйныя два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Наш малады лідэр удзельнічаў і ў чэмпіянаце свету ў г. Актабэ (Казахстан), аб выніках якога з класічным кантролем часу мы паведамлялі раней. Сёння разгледзьце фрагмент яго партыі з казахскім майстрам:

Белыя (А.Бяшымаў): g1, h4, дамка a7 (3). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): d8, e7, f6, дамка h2 (4). 1 ... ed6! 2. ad4 de5 3. da1 hf4 4. gh2 fd2 5. hg5 d:h6 6. ac3 hg7 7. cd2 gh8 8. da5 ed4x.

Там жа прайшлі баталіі і па бліцу. У ім Я. Кандрачэнка выступіў няблага — 5-е месца з 34, а мог увайсці ў тройку прызёраў, каб, напрыклад, у партыі з двухразовым чэмпіёнам свету па хуткіх шашках Сяргеем Белашэевым (Украіна) заўважыў мат за два хады (замест нічыі).



Вышэйшая ліга

Белыя (А.Федарэнкаў): 21, 30, 32, 33, 34, 35, 37, 38, 39, 40, 41, 43, 45, 47, 48 (15). **Чорныя** (А.Толчыкаў): 1, 2, 3, 4, 8, 12, 13, 14, 15, 17, 18, 19, 23, 25, 26 (15). 1 ... 26-31 2. 37:26 23-28 3. 33:11 (біць большасць абавязкова) 12-17 4. 21:23 (зноў трэба збіць большасць фігур) 19:46х. "Гол" у левы вугал "варот" чорных.

Пазіцыя ўзята з чэмпіянату краіны па шашках-100 у вышэйшай лізе. А перамаглі ў ім міжнародны майстар Ігар Міхальчанка з Ваўкавыска, міжнародныя гросмайстры з Мінска Яўген Ватуцін і Сяргей Насевіч.

Першая ліга

У першай жа лізе па шашках-64 вікторыю святкавалі: у мужчынскім турніры — Мікалай Кадзеснікаў (Бабруйск), сталічны міжнародны гросмайстар па шашках-100 Сяргей Насевіч, кандыдаты ў майстры спорту Вольга Федаровіч (Мінск), Іван Троцкі (Паставы) і мінскі майстар Вячаслаў Палянскі, у асобным жаночым — першаразрадніца Ганна Крашко (Слонім), кандыдаты ў майстры спорту Святлана Ланцэева (Жодзіна) і Кацярына Шпакава (Мінск). Усе яны перайшлі ў вышэйшую лігу. Між іншым, перад гэтым Ганна Крашко стала пераможцай першынства Гродзенскай вобласці, а ў мужчын тут быў мацнейшым майстар Аляксандр Маркін (Гродна).

Пазнаёмцеся з творчым патэнцыялам гімназісткі Вольгі Федаровіч:

Белыя (В.Федаровіч): a3, a5, b2, d2, d4, e3, f2, f4, g1, g3 (10). **Чорныя** (В.Мельнік): a7, b6, c5, c7, d6, d8, e7, f6, h4, h6 (10). Чорныя звязаны, як кажуць, па руках і нагах, таму яны, спадзеючыся на выратаванне, вырашылі праверыць камбінацыйны зрок Вольгі, але той яе не падвёў: 1 ... hg5 2. f:h6 de5 3. dc3! cb4 4. a:c5 cd6 5. a:c7 d:b6 (5 ... d:h2 6. bc3 7. hg7 8. d:a5x) 6. hg7! d:h2 7. bc3 f:h8 8. d:a5x.

Зноў у руля

Адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя ГА "Беларуская федэрацыя шашак". Яе зноў узначаліла міжнародны гросмайстар Ірына Пашкевіч. Ёй будуць дапамагаць надалей развіваць шашкі ў рэспубліцы намеснікі старшыні — арбітр ФМЖД Аляксандр Аніська і міжнародны гросмайстар Сяргей Насевіч, адказны сакратар федэрацыі — майстар Павел Шацаў.

— За 2005—2006 гады беларускія шашысты заваявалі 20 медалёў рознай вартасці. У мінулым годзе БФШ атрымала статус нацыянальнай, прычым у ліку першых дзесяці спартыўных федэрацый, — акцэнтавала ўвагу Ірына Пашкевіч.

Нам застаецца дадаць, што ў справаздачны перыяд самых важкіх паказчыкаў дасягнулі: Андрэй Валюк быў чэмпіёнам свету па шашках-64, зборная Беларусі па шашках-100 (Анатоль Гантварг, Андрэй Валюк і Ігар Міхальчанка) стала бронзавым прызёрам камандная першынства свету і сама Ірына Пашкевіч прывезла ў Мінск сярэбраную ўзнагароду з планетарнага форуму па шашках-100.

Лепшыя ў 2006-м

Па прадстаўленні выканкама ГА "БФШ", яны вызначаліся дзеючымі членамі фэдэрацыі ў шасці намінацыях: лепшы спартсмен па шашках, ігрок — адкрыццё года, лепшыя трэнер, суддзя, арганізатар турніру і журналіст шашачнай тэматыкі. Імі прызнаны Ігар Міхальчанка (Ваўкавыск), Андрэй Мацявін (Слонім), Кірыл Хайнюк (Мінск), Сяргей Насевіч (таксама Мінск), Аляксандр Аніська (Слонім) і Віталь Варушыла (газета "Спортивная панорама").

***

Сённяшнія інфармацыі істотна дапоўнілі экс-чэмпіён Беларусі па шашках-64 Вільям Астрынскі (Мінск), майстры спорту Пётр Шклудаў (Наваполацк) і Віктар Шульга (Мінск) — карэспандэнты нашай рубрыкі "Шашкі".

Мікалай ГЛАДКІ.

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

«Кутузов попал на алименты»,

— написала на днях о белорусском футболисте, форварде итальянской "Пармы" Виталии Кутузове российская газета "Твой день".

"Его жена добилась через суд повышенных алиментов, — сообщило издание. — Теперь игрок сборной Беларуси будет обязан выплачивать 25 процентов от заработной платы (Кутузов зарабатывает 60.000 евро в месяц) на содержание экс-супруги и пятилетнего сына. Как стало известно "Твоему дню", Юлия Кутузова рассталась с футболистом весной прошлого года и вернулась из Италии в Минск. Причиной разрыва, по одной из версий, стало то, что Виталий уличил свою супругу в неверности. Хотя сама Юлия утверждает, что все произошло с точностью до наоборот. Известие о сумме алиментов стало для Виталия полной неожиданностью. "Это шок", — единственное, что сказал футболист, услышав неприятную для себя новость".

— Я что-то слышала такое от знакомых, и суд действительно был недавно, но по сумме ничего сказать не могу, — рассказывает корреспонденту "Народной воли" **Юлия КУТУЗОВА**. — Знаю только, что Виталия просто обязали выплачивать алименты, потому что с мая он нам с сыном никак не помогает.

— Юлия, сколько Вы прожили вместе?

— В браке — пять лет и до брака примерно столько же.

— А в Италии?

— Как Виталик перешел из Борисова в "Милан", так с тех пор я с ним вместе и была. Когда играл в "Авелино", жили в гостинице, ребенок находился здесь, и мне приходилось мотаться туда-сюда постоянно. А в мае прошлого года переехала домой окончательно.

— Российское издание написало, что Вы уличили мужа в неверности, а он Вас...

— Ерунда какая-то, тем более что мы как бы еще и не разошлись. На развод, по крайней мере, мы еще не подавали и официально состоим в браке.

— Тогда что за суд был?

— Я подала исковое заявление в суд Центрального района Минска по поводу алиментов... Я пыталась по-хорошему поговорить, объяснить человеку, что на содержание ребенка нужны какие-то деньги. Но Виталик как-то постоянно пропадал, не отвечал на звонки. Я прожила с ним не год, не два, и все, что он сейчас имеет, — ко всему этому мы шли вместе. А тут получается, что, по его словам, я хочу у него забрать все. Нет же, мне ничего не надо. Нужна лишь малость на содержание ребенка, потому что сын подрастает, он привык жить за границей, нормально питаться и нормально одеваться. И мне тяжело сейчас ребенку говорить: "Прости, но у мамы нет денег". Когда я приехала сюда, для меня стало проблемой найти работу, проблема устроить ребенка в детский сад, потому что он родился в Португалии и у него даже белорусского свидетельства о рождении нет.

— А какая у Вас специальность?

— Я педагог, но на работу не устроишься, потому что нужно быть постоянно с ребенком.

— Может быть, еще помиритесь с Виталием?

— Все может быть. Я, конечно, не хотела, чтобы кто-то знал о наших проблемах, но раз уж так получилось... Хотя, может, все еще сложится.

После звонка Юлии, связываюсь в Италии и с **Виталием КУТУЗОВЫМ**.

— Это кто написал? — смеется футболист в трубку после того, как я прочитал ему информацию из российского СМИ. — Я вам скажу так: во-первых, глупо обсуждать какие-то вещи, которые касаются двух людей, и во-вторых, цифры указаны какие-то непонятные. Глупости какие-то...

— Но суд-то был?

— Понятно же, что когда два человека расстаются, то происходят какие-то судебные процессы. Но этим занимаются юристы. И что значит повышенные алименты?.. Тем более что никакие комментарии до этого я тоже никому не давал.

— Вы с Юлией официально пока не разведены?

— Пока нет, поэтому я же и говорю — есть еще масса вопросов.

Алесь СИВЫЙ.

ВОКРУГ СПОРТА

«Динамо» вложит в недвижимость 675 миллионов долларов

Российское спортобщество "Динамо" решило после планируемого выкупа акций одноименного футбольного клуба заняться строительством. В районе Петровского парка будет возведен многофункциональный комплекс площадью 450 тысяч квадратных метров. Стоимость проекта оценивается в 675 миллионов долларов.

Четверть миллиона квадратных метров нового комплекса будет отдано под офисы, еще 50—60 тысяч квадратных метров займут магазины, а 150 тысяч — апартаменты.

Кроме того, спортобщество "Динамо" займется реконструкцией одноименной спортивной арены и построит манеж с футбольным полем, бассейном и ледовой площадкой. Это обойдется обществу еще в 300 миллионов долларов.

В спортобществе полагают, что ежегодные доходы от сдачи в аренду площадей комплекса составят до 400 миллионов долларов.

Несчастливый стадион

Болельщик итальянского футбольного клуба "Мессина" умер от сердечного приступа во время матча команды против "Сиены", не пережив гол в ворота своих любимцев.

60-летний поклонник сицилианского клуба в буквальном смысле очень близко к сердцу воспринял мяч, забитый на 90-й минуте матча в ворота любимой команды. Игра, кстати, так и закончилась со счетом 0:1.

В начале февраля во время матча чемпионата Италии между "Катанией" и "Мессиной" начались столкновения между фанатами двух команд, которые привели к гибели на стадионе полицейского.

Пришел в сознание, когда услышал о победе

Капитан "Челси" Джон Терри, получивший во время недавнего финального матча Кубка Английской лиги сильный удар ногой в голову, признался, что не помнит многих событий до и после инцидента.

Напомним, что в финале Кубка клуб Романа Абрамовича победил лондонский "Арсенал", за который выступает Александр Глеб, со счетом 2:1.

"Я помню, как выходил играть во втором тайме, а дальше не помню ничего до того момента, когда очнулся в машине "скорой помощи", — заявил футболист "Челси" уже будучи в здравии.

По словам медиков, опасности для здоровья футболиста нет, тем более что Джон Терри успел примчаться из больницы на стадион, чтобы отпраздновать с командой победу.

Алесь ФЕДОРОВ.

ШАХМАТЫ

Задача-лауреат
Ф.Хладик

Белые: Крa1, Фf5, Kg4, Kh5 (4).

Черные: Крh4, Ch3, п. g5 (3).

Мат в 3 хода.

Предлагаем вниманию читателей трехходовую миниатюру чешского составителя Франтишека Хладика, которая была удостоена первого приза на конкурсе. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Сверьте ответы

Двухходовка Л.Куббеля (опубликована 25.01.): **1.Крg6!**

Композиция В.Фригина ("Народная воля" за 9.02.): **1.Фd3!**

Поражение чемпиона

Компьютеры научились играть в шахматы еще в конце 1950-х годов. Но играли они тогда совсем слабо. Затем, с увеличением мощности ЭВМ, их игра усилилась. Но еще в 1985 году чемпион мира Гарри Каспаров одержал верх в сеансе с ЭВМ со счетом 15:0! Однако компьютеры быстро совершенствовались. В 1996 году Гарри Каспаров сыграл матч с компьютерной программой "Деер Blue". И хотя первую партию гроссмейстер проиграл, но в итоге все же одержал победу со счетом 4:2. Однако уже через год ЭВМ удалось взять реванш. Каспаров сенсационно проиграл со счетом 3,5:2,5. Правда, поражение чемпиона мира во многом объяснялось психологическими причинами. Перед заключительной, шестой, партией в матче было равновесие. Не желая довольствоваться ничьей, Каспаров в шестой партии избрал крайне рискованный вариант. "Деер Blue" блестяще разобрался в позиции и провел эффектную решающую атаку на короля.

В 2002 году в Бахрейне новый чемпион мира Владимир Крамник сыграл вничью — 4:4 — матч с усовершенствованной версией "Деер Fritz". Интересно, что гроссмейстер вел в матче с перевесом в 2 (!) очка, но в конечном счете вынужден был довольствоваться ничейным итогом. Еще дважды встречался с ЭВМ Г.Каспаров. В 2003 году ничейный счет был в его поединке с "Деер Junior" — 3:3, а также с ХЗД "Fritz" — 2:2. Делали попытки противостоять компьютеру и другие гроссмейстеры. Но безуспешно. Настоящим разгромом окончился матч между одним из сильнейших гроссмейстеров мира англичанином Майклом Адамсом с ЭВМ. Счет был 5,5:0,5 в пользу компьютера. Поэтому поединок между действующим чемпионом мира Владимиром Крамником и компьютерной программой "Деер Fritz", прошедший в конце 2006 года, многие считали последней попыткой человека противостоять машине. В Бонне, где проходил матч, борьба была очень упорной. Но все же чемпиону мира не удалось избежать поражения. Общий счет был 4:2 в пользу "Деер Fritz". Перед последней, шестой, партией счет был 3:2 в пользу ЭВМ. И Крамник сохранял шансы спасти матч. Но, увы, надеждам не суждено было осуществиться. Компьютер отлично провел последнюю партию и одержал победу. Приводим решающую партию матча.

«Деер Fritz» — В.Крамник
Сицилианская защита

1.e4 c5 2.Kf3 d6 3.d4 cd 4.K:d4 Kf6 5.Kc3 a6 6.Cc4 e6 7.o-o Ce7 8.Cb3 Фc7 9.Ле1 Кc6 10.Ле3!? Новинка ЭВМ, белые намерены подключить к атаке ладью. 10...o-o 11.Лg3 Крh8 12.K:c6 bc 13.Фe2a5 14.Cg5 Ca6 15.Фf3 Лab8 16.Лe1 c5 17.Cf4 Фb7 18.Cc1 Kg8 19.Kb1! Белые начинают перегруппировку своих фигур. 19...Cf6 20.c3 g6 21.Ka3 Фc6 22.Лh3 Cg7 23.Фg3 a4 24.Cc2 Лb6? (Ошибка, лучше было 24...e5) 25.e5! de 26.Л:e5 Kf6 (Если 26...C:e5, то 27.Ф:e5+ f6 28.Л:h7+! Кр:h7 29.Фh5+ Крg7 30.Ф:g6+ Крh8 31.Фh7х) 27.Фh4 Фb7 28.Лe1h5 29.Лf3 Kh7 30.Ф:a4 Фc6 31.Ф:c6 Л:c6 32.Ca4 Лb6 33.b3 Крg8 34.c4 Лd8 35.Kb5 Cb7 36.Лfe3 Ch6 37.Лe5 C:c1 38.Л:c1 Лc6 39.Kc3 Лc7 40.Cb5 Kf8 41.Ka4 Лdc8 42.Лd1 Крg7 43.Лd6 f6 44.Лe2 e5 45.Лed2 g5 46.Kb6 Лb8 47.a4! **Черные сдались.**

Смотр молодых

В Минске на спортивной базе ДЮСШОР №11 прошел открытый чемпионат столицы по шахматам среди юношей в возрасте до 18 и 20 лет. В соревнованиях приняли участие 75 спортсменов. Турнир проводился по швейцарской системе в 9 туров. В острейшей борьбе чемпионом Минска среди юношей в возрасте до 20 лет стал финалист высшей лиги чемпионата Беларуси 2007 года кандидат в мастера Евгений Подольченко. Он набрал в 9 турах 7 очков. Такой же результат у кандидата в мастера Владимира Куценкова, занявшего второе место. Сразу 6 спортсменов финишировали, набрав по 6,5 очка. Третий приз был присужден кандидату в мастера Денису Трифонову, четвертое — кандидату в мастера Артему Самсонкину, ставшему чемпионом столицы среди юношей в возрасте до 18 лет. На следующих местах кандидаты в мастера Павел Ломако, Михаил Константинов, Павел Нестеренко и Владимир Романенко — все по 6,5 очка. Лучший результат среди женщин показали Ирина Белько и Евгения Шило, набравшие по 5,5 очка из 9. С таким же результатом среди ветеранов первенствовал кандидат в мастера Сергей Коваленко.

АЛІМПІЯДА-2008

На летнія Гульні лічаць медалі зімой

На чарговым выканкаме Нацыянальнага алімпійскага камітэта стала вядома аб медалёвых абавязках на пекінскую летнюю Алімпіяду беларускіх штангістаў і лёгкаатлетаў.

Першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта **Генадзь Аляксеенка** паведаміў, што лепшых умоў для падрыхтоўкі беларускіх спартсменаў не існавала за ўсю гісторыю беларускага спорту, на што міністр спорту і турызму **Аляксандр Грыгарай** адразу ж дадаў: *"Было прынята рашэнне выдзеліць групу спартсменаў, якая будзе забяспечана па вышэйшым разрадзе. Гэта 129 атлетаў, якім створаны ўсе ўмовы, у тым ліку заробак, прэзідэнцкая стыпендыя, фармакалогія, спартыўныя базы, навука і гэтак далей".*

Спадара Грыгарава не задаволілі агучаныя на выканкаме абавязкі штангістаў — прывезці з Кітая 2 медалі. Алімпійскія планы лёгкаатлетаў — 5 медалёў — карэкціраваць не сталі, аднак з імі таксама асобная размова. Аляксандр Уладзіміравіч, у прыватнасці, заявіў, што спартыўнае ведамства заклапочана псіхалагічным станам некаторых спартсменаў, у тым ліку і алімпійскай чэмпіёнкі Юліі Несцярэнка, у якой вельмі ўжо зацягнуўся аднаўленчы працэс.

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смоленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смоленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 28.02.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №